WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

21 ВЕРАСНЯ 2010 г.
АЎТОРАК
№ 184
(26792)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Прамая лінія

ЯК ЗМАГАЦЦА З «НЯПРАВІЛЬНЫМ» ЦІСКАМ?

Сёння найбольш распаўсюджаным сардэчна-сасудзістым захворваннем з'яўляецца артэрыяльная гіпертэнзія, на якую хварэе 15-17 працэнтаў дарослага насельніцтва краіны. Што рабіць, калі здарыўся гіпертанічны крыз? Ці абавязкова пры гіпертаніі прымаць лекі пажыццёва? У якіх выпадках гіпатэнзіўныя прэпараты можна замяніць травамі і іншымі натурапатычнымі сродкамі? На гэтыя і іншыя пытанні адкажа падчас нашай чарговай «прамой лініі» **кандыдат медыцынскіх навук, вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі артэрыяльнай гіпертэнзіі РНПЦ «Кардыялогія» Марыя Міхайлаўна ЛІВЕНЦАВА**.

«Прамая лінія» з яе ўдзелам адбудзецца **24 верасня, у пятніцу, з 12.00 да 13.00** па нумарах 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах 8 (017) 287 18 29 і 287 18 36.

ПЁТР ПРАКАПОВІЧ ПАЦВЯРДЖАЕ ПЛАНЫ НАЦБАНКА БЕЛАРУСІ ПА НАРОШЧВАННІ ЗОЛАТАВАЛЮТНЫХ РЭЗЕРВАЎ

Старшыня праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Пётр Пракаповіч пацвярджае планы Нацбанка па нарошчванні золатавалютных рэзерваў у гэтым годзе. Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам Пятра Пракаповіча. Кіраўніку дзяржавы было даложана аб выніках выканання Асноўных напрамкаў грашова-крэдытнай палітыкі Беларусі ў студзені-жніўні 2010 года.

Усе асноўныя паказчыкі грашова-крэдытнай палітыкі ў Беларусі па выніках васьмі месяцаў выконваюцца. Курс нацыянальнай валюты да кошыка замежных валют застаецца стабільным, захоўваюцца высокія тэмпы крэдытавання эканомікі, працэнтная палітыка адпавядае Асноўным напрамкам грашова-крэдытнай палітыкі, эфектыўна працуе плацежная сістэма. Усё гэта стварае базу для ўстойлівага развіцця беларускай эканомікі.

Так, курс беларускага рубля да кошыка замежных валют за студзень-жнівень зменшыўся толькі на 0,29 працэнта пры запланаваным на год калідоры ваганняў у межах +/-10 працэнтаў.

«Устойлівасць нашай нацыянальнай валюты, стабільнасць курсавой палітыкі заснаваны не толькі на паспяховай рабоце нашай эканомікі, але і на тым, што мы маем дастаткова золатавалютных рэзерваў», — праінфармаваў Прэзідэнта Пётр Пракаповіч. На 1 верасня золатавалютныя рэзервы Беларусі склалі $6055 млн. У параўнанні з пачаткам мінулага года гэта ў 1,7 раза больш. Старшыня праўлення Нацбанка растлумачыў, што росту золатавалютных рэзерваў садзейнічае павелічэнне валютнай выручкі беларускіх прадпрыемстваў, якая ў гэтым годзе больш як на 20 працэнтаў (або на $2,5 млрд.) перавышае паказчык мінулага года. Кіраўнік Нацбанка запэўніў Прэзідэнта, што планы па напаўненні золатавалютных рэзерваў будуць выконвацца і ў далейшым. Нагадаем, у гэтым годзе ў адпаведнасці з Асноўнымі напрамкамі грашова-крэдытнай палітыкі яны павінны павялічыцца на $0,5 млрд.-1,8 млрд.

Нацыянальным банкам Беларусі праведзена таксама вялікая работа па зніжэнні працэнтных ставак. Напрыклад, стаўка рэфінансавання ў гэтым годзе зніжалася ўжо 6 разоў. З 15 верасня яна складае 10,5 працэнта гадавых. Адпаведна, зніжаюцца і працэнтныя стаўкі па крэдытах.

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў ад Нацыянальнага банка і ў далейшым забяспечваць стабільную работу банкаўскага сектара краіны, у тым ліку сітуацыю на валютным рынку, у курсавой палітыцы, у крэдытаванні. Асаблівую ўвагу Прэзідэнт акцэнтаваў на неабходнасці адшукваць магчымасці зніжэння ставак па крэдытах для насельніцтва.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ГРЫБНЫ ЧЭМПІЯНАТ У ДРЭТУНІ

Фотарэпартаж

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Назва вёскі Дрэтунь адным нагадвае, напэўна, пра колішні ваенны палігон саюзнага значэння. Для іншых гэта толькі маленькая чыгуначная станцыя на шляху Полацк—Невель. Мінулым гарачым летам мы ўзгадвалі дрэтуньскія лясы ў сувязі з высокай пажарнай небяспекай. А некалькі дзён таму атрымалі запрашэнне з гэтага населенага пункта на... грыбны чэмпіянат, які праводзіцца другі год запар. Прыхапіўшы кошык, нож і фотаапарат, я адправіўся на поўнач Беларусі амаль за дзвесце семдзесят кіламетраў. Адразу зазначу, грыбоў хапіла на ўсіх. І песень таксама (на фотаздымку). Яшчэ б, у гэткі ўраджайны на грыбы год! СТАР. 3

68 гадоў таму выйшаў чацвёрты падпольны нумар «Звязды»

20 верасня 1942 года быў надрукаваны 4-ты нумар падпольнай «Звязды»: гэта адбылося ў акупаваным Мінску ў доме Пятра Хадасевіча па адрасе: 3-я лінія, 26. Сёння той хаты няма, дый вуліцы таксама — на гэтым месцы стаіць шматпавярховік, і на яго сцяне вісіць мемарыяльная дошка ў гонар сям'і Хадасевічаў (яны былі трохі пазней расстраляныя фашыстамі) і нашай газеты-падпольшчыцы.

Мы ўжо пісалі (нумар ад 8 мая 2010 года), што напярэдадні Дня Перамогі ў гэтай мемарыяльнай дошкі з'явіліся шэфы — адміністрацыя і жыхары інтэрнату галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама, які знаходзіцца на той жа вуліцы Беларускай. Як і да Дня Перамогі, учора, 20 верасня, яны разам з вучнямі сталічнай 76-й школы (яна таксама знаходзіцца на той жа вуліцы) прыйшлі да гэтай мемарыяльнай дошкі і ўсклалі кветкі.

Мы яшчэ ў мінулай публікацыі друкавалі невялікія ўспаміны Сяргея Барысава, які зараз жыве ў інтэрнаце на Беларускай, але яшчэ хлопчыкам ў вайну ён выпадкова пабываў у доме Хадасевічаў — праўда, самога Пятра Хадасевіча ён на свае вочы не пабачыў, але затое гасцяваў у яго жонкі Альбіны і двух малых дзяцей. СТАР. 2

Патрэбны грошы?
Выхад ёсць!

Вам тэрмінова патрэбна параўнальна невялікая сума грошай? А банкі па тых або іншых прычынах адмаўляюць або занадта доўга разглядаюць пакет дакументаў? І знаёмыя не могуць Вас выручыць? Выхад ёсць.

Сёння на фінансавым рынку Беларусі ўсё больш актыўна заяўляе пра сябе яшчэ адзін інструмент мікрафінансавання – крэдытныя кааператывы. З іх дапамогай можна тэрмінова пазычыць грошы пад развіццё малога і сярэдняга бізнэсу, неадкладна ўнесці сродкі за нейкі тавар, пагасіць крэдыт або яго частку ў банку, нарэшце, перапазычыць. У крэдытны кааператыў можна таксама і ўнесці грошы пад больш выгадны, чым у банку, працэнт.

Аднак інфармацыі пра спажывецкія кааператывы фінансавай узаемадапамогі (крэдытныя саюзы і кааператывы) сёння недастаткова. Наколькі яны надзейныя? На якіх умовах і прынцыпах працуюць?

У заўтрашнім нумары «Звязда» адкажа на гэтыя пытанні і падрабязна раскажа пра Простае таварыства «Спектр», якое аб'ядноўвае два крэдытныя саюзы: спажывецкі кааператыў «Спектр-Капітал» (працуе з грамадзянамі) і Спажывецкі кааператыў «Таварыства ўзаемнага крэдытавання «Капітал-Інвест», які створаны для работы з суб'ектамі малога бізнэсу.

НАРАДЖАЦЬ ПРЫЕХАЛА... З АФРЫКІ

Ведай нашых!

Здалёкай афрыканскай краіны Кот д'Івуара спецыяльна прыехала нараджаць у Віцебск 42-гадовая Кофі Беатрыс. Гэтую гісторыю расказала сваім чытачам папулярная віцебская гарадская газета «Віцьбічы».

У Віцебску, як адзначае газета, жыве родны брат Беатрыс з сям'ёй. Жанчына цяжка выношвала дзіця, а жонка брата нарадзіла ў радзільным доме Віцебскай гарадской бальніцы хуткай неадкладнай дапамогі ажно пяць дзяцей! І ўмовамі знаходжання, і медыцынскім абслугоўваннем яна была вельмі задаволеная. У прыезджай пацыенткі з Афрыкі былі вельмі цяжкія роды, ёй зрабілі кесарава сячэнне. Усё абышлося, і на свет з'явілася здаровая дзяўчынка, якой маці дала імя Марыя Арэлі. Новаспечаную маму ўжо выпісалі з бальніцы, і яна збіраецца вярнуцца на сваю радзіму.

Дарэчы, так званы медыцынскі турызм у Віцебскай вобласці актыўна набірае абароты. Як расказаў журналістам **начальнік упраўлення аховы здароўя Віцебскага аблвыканкама Юрый ДЗЯРКАЧ**, на базе адной з бальніц абласнога цэнтра пачне працаваць нават турыстычнае бюро па арганізацыі спецыфічных тураў па здароўе. У медыцынскай установе створаны цэлы пералік медыцынскіх і рэабілітацыйных паслуг, якія могуць прадставіць турыстам не толькі ў абласным цэнтры, а і ў глыбінцы. У краінах, якія мяжуюць з Віцебскай вобласцю (Латвія, Літва, Расія), праводзяцца спецыяльнае маркетынгавае даследаванне і рэкламная кампанія.

Іншаземцы з задавальненнем прыязджаюць, каб пракансультавацца і атрымаць медыцынскую дапамогу ў кардыёлагаў, акушэраў-гінеколагаў, практолагаў, стаматолагаў і іншых спецыялістаў. Сёлета медыцына Віцебскай вобласці зарабіла на экспарце медыцынскіх паслуг іншаземцам больш за 1 мільярд рублёў. І тэмпы росту гэтых паслуг актыўна павялічваюцца.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Гаспадар развёў рукамі

Пінскія памежнікі і супрацоўнікі мытні зазірнулі ў нежылую прыбудову жыхара в. Ізін і знайшлі там 22 баулы з адзеннем і абуткам.

Гаспадар-пенсіянер развёў рукамі і не здолеў растлумачыць, адкуль у яго тавар коштам 230 млн. рублёў.

Кантрабанду канфіскавалі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ПРОДАЖА НА ТОРГАХ ЗДАНИЙ И ПОМЕЩЕНИЙ
КУПП «Виттекс»
(36 кв. м; 40,8 кв. м; 793,9 кв. м; 1042,7 кв. м; 1207,8 кв. м; 1189,9 кв. м; 2939,2 кв. м)
в г. Витебске
по ул. Володарского, 100.
ЦЕНЫ СНИЖЕНЫ.
Информация на сайте:
www.vitinvest.biz.
Тел.: 431498, +375336480387; +375292962323 МТС.
УНП 300149663

У эпіцэнтры дзяржаўнай палітыкі

ААТ «БЕЛГОРХІМПРАМ»

АД НЯМІГІ ДА АМУДАР'І РУКОЙ ПАДАЦЬ, КАЛІ ГЭТА РУКА СЯБРОЎСТВА

Так будзе выглядаць Гарлыкскі горнаўзбагачальны камбінат.

ПРАЕКТНЫ ІНСТЫТУТ ПРЫНЯЎ НА СЯБЕ ФУНКЦЫЮ ГЕНПАДРАДУ

Слова — старшыні назіральнага савета, намесніку генеральнага дырэктара інстытута «Белгорхімпрам» доктару тэхнічных навук Сяргею Шэмету.

— У самым пачатку года, у студзені, мы падпісалі кантракт з Дзяржаўным канцэрнам «Туркменхімія» на будаўніцтва «пад ключ» горнаўзбагачальнага камбіната на базе Гарлыкскага (Карлюкскага) месцанараджэння калійных соляў. Цана гэтага кантракта сапраўды складае адзін мільярд долараў, я такую лічбу магу пацвердзіць. Спадзяёмся, што гэта рэальны кошт праекта.

Мы пачыналі працаваць з заказчыкам яшчэ да падпісання дакумента. Выканалі тэхнічнае абгрунтаванне (ТА) мэтазгоднасці будаўніцтва камбіната менавіта на гэтым месцанараджэнні, пралічылі ўсю эканоміку — колькі будзе каштаваць дабыць руду, абагаціць яе, прадаць гатовы прадукт, якая магчымая цана, рынкі збыту. Выгада пралічвалася несумненная. Вынікі дакладвалі на месцы, у Туркменіі, у прысутнасці прадстаўнікоў усіх зацікаўленых міністэрстваў, а таксама — апанентаў. Апаніравалі нам спецыялісты з Канады і Расіі. Справа ў тым, што прэтэндавалі на гэты кантракт сур'ёзныя канкурэнты — расіяне, немцы, ізраільцяне, кітайцы і іншыя — уся сусветная эліта. А выбралі нас.

Загадчык сектара падземнай геафізікі Тамара ПРАВАСЛАЎНАЯ і яе калегі Раіса ЧЭМІТАВА, Сяргей АНДРАНОВІЧ, Наталья МАТУСЕВІЧ, Сяргей ІВАНЦОЎ.

(Працяг на стар. 6–7.)

КАЛІЙНЫЯ СОЛІ ЗДАБУДУЦЬ У ШАХТАХ

Ля падножжа Кайтандагскага хрыбта ў знакамітым сваімі карставымі пячорамі мястэчку Карлюк пачалося будаўніцтва найбуйнейшага ў Цэнтральнай Азіі горна-ўзбагачальнага камбіната па вытворчасці хларыду калію.

Яшчэ ў 60-я гады мінулага стагоддзя геолагамі Кугітангскай геалагаразведачнай экспедыцыі на гэтай тэрыторыі быў выдзелены Сярэднеазіяцкі каліяносны басейн плошчай 4 тысячы квадратных кіламетраў, адкрыта і дэталёва разведана самае буйное ў Цэнтральнай Азіі па памерах (плошча радовішча 100—120 квадратных кіламетраў) і прамысловай значнасці Карлюкскае радовішча калійных соляў. Паводле звестак геалагічных даследаванняў, запасы сырых калійных соляў тут складаюць больш як два мільярды тон. Гэтыя солі прыдатныя для вытворчасці калійных угнаенняў і могуць быць перапрацаваныя флатацыйным метадам у хлорысты калій, неабходны ў сельскай гаспадарцы.

...Апошнім часам патрэба ў калійных угнаеннях на сусветным рынку значна ўзрасла. У Туркменістана з'явілася магчымасць цалкам забяспечыць унутраныя патрэбы і адначасова стаць адным з найбуйнейшых пастаўшчыкоў прыродных угнаенняў на знешні рынак.

Сёння на Карлюкскім радовішчы разгортваюцца беспрэцэдэнтныя па маштабах і значнасці работы па асваенні залежаў прыродных калійных соляў. Згодна з Пастановай Прэзідэнта краіны Гурбангулы Бердымухамедава, у Кайтандагскім этрапе за 25—30 кіламетраў на поўнач ад чыгуначнай станцыі Келіф трэба ўзвесці гігант горназдабываючай і хімічнай індустрыі, праектная магутнасць якога складзе 1400 тысяч тон мінеральных угнаенняў у год. Дзяржаўны канцэрн «Туркменхімія» ў пачатку гэтага года заключыў кантракт з ААТ «Белгорхімпрам», Рэспубліка Беларусь, на будаўніцтва камбіната. Пуск у эксплуатацыю мяркуецца ў пачатку 2015 года. Кошт кантракта — адзін мільярд долараў ЗША.

Паводле інфармацыі Габбара Сейліханава, выканаўчага дырэктара дырэкцыі прадпрыемства, якое будуецца, у цяперашні час беларускія будаўнікі выканалі больш за трэць усяго аб'ёму праектна-пошукавых работ. У першую чаргу падрадчыкам ажыццёўлена тэхніка-эканамічнае абгрунтаванне выбару прамысловай пляцоўкі і ацэнка ўздзеяння будучага прадпрыемства на навакольнае асяроддзе. Сумесна з туркменскімі геолагамі на радовішчы зробленыя дзве геолагаразведачныя і адна гідрагеалагічная свідравіны. Працягваецца бурэнне чацвёртай разведачнай свідравіны. Гэтыя пошукі праводзяцца з мэтай вывучэння і ўдакладнення геалагічнага разрэзу і гідралагічных умоў праходкі ствала будучай шахты.

У свой час геолагі Кугітангскай геолагаразведачнай экспедыцыі вызначылі, што прадукцыйныя пласты калійных соляў, прыдатныя для вытворчасці ўгнаенняў, залягаюць у вывучаным басейне на глыбіні ад 200 да 1000 метраў у выглядзе пластоў магутнасцю ў некалькі дзясяткаў метраў. У прыватнасці, на ўнікальным Карлюкскім радовішчы саляныя тоўшчы ўтрымліваюць 11 прадукцыйных пластоў і маюць магутнасць 80—300 метраў. Прычым самыя насычаныя пласты ўтвараюць на ўсёй працягласці радовішча адзіную каліяносную залеж магутнасцю 25—35 метраў на значнай глыбіні. Дабрацца да гэтых пластоў мяркуецца выключна шахтавым спосабам. Таму беларускія будаўнікі камбіната ўжо выканалі праект паверхневага комплексу будучага рудніка, а таксама падрыхтавалі праектна-каштарысную дакументацыю першага пускавога комплексу і папярэдні праект шахтавых ствалоў і горнага адводу. У цяперашні час на месцы будучага рудніка ідзе вывучэнне інжынернай геалогіі, а ўжо ў 2011 годзе тут плануецца пачаць асноўныя работы па стварэнні шахтавых ствалоў.

Па праекце «Белгорхімпрама» праходка саляных шахтаў будзе ажыццяўляцца буравым і ўзрыўным метадамі. На месцы рудніка ўзнікне сапраўдны падземны горад, рудакопы будуць спускацца пад зямлю ў ліфце па грузавым стволе, а па другім стволе, злучаным з грузавым падземным «ствольным дваром», з дапамогай скіпавых механізмаў на паверхню падымуць здабытую руду. Адначасова праз гэтыя шахтавыя стволы будзе ажыццяўляцца вентыляцыя падземных вырабатак.

Для абагачэння руды, у якой утрымліваецца да 23 працэнтаў карысных прадуктаў, праектам прадугледжана будаўніцтва магутнага абагачальнага камбіната. На больш чым 90 гектарах размесцяцца вытворчыя корпусы, у якіх мяркуецца змантаваць пяць ліній па драбленні, здрабненні і флатацыі выкапнёвых калійных соляў і іншае дапаможнае абсталяванне. У далейшым абагачаную руду, у склад якой будзе ўваходзіць да 95 працэнтаў хларыду калію, чакаюць сушка, грануляванне і фасоўка. Гатовыя ўгнаенні адправяцца са складу спажыўцам чыгуначным і аўтамабільным транспартам.

Адначасова з будаўніцтвам вытворчага комплексу горнаўзбагачальнага камбіната мяркуецца стварыць усю неабходную для функцыянавання камбіната дапаможную інфраструктуру. У тым ліку забяспечыць падачу да цэхаў тэхнічнай вады, электраэнергіі, пабудаваць аўтамабільныя і чыгуначныя дарогі, цэментны завод і іншыя неабходныя вытворчасці. Цяпер на тэрыторыі будучага індустрыяльнага гіганта па праекце, распрацаваным падрадчыкам, пачалося ўзвядзенне жылых дамоў катэджнага тыпу, якія ў далейшым стануць часткай сучаснага гарадка на тысячу месцаў, сталовай, медпункта і іншых аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры. У гэтых работах, акрамя беларускіх будаўнікоў, удзельнічаюць мясцовыя будаўнічыя кампаніі.

За пашыранымі каментарыямі, якія сёння дарэчы, мы звярнуліся да беларускіх спецыялістаў.

Пасля распаду СССР у вялікай сям'і народаў усё ж засталася цяга да традыцыйнага цеснага супрацоўніцтва, застаўся давер адзін да аднаго, і ўсё гэта вылілася ў новыя дзелавыя (і не толькі дзелавыя) сувязі, падмацаваныя дагаворамі, сумеснымі праектамі, на ажыццяўленне якіх нават у няпростых рынкавых умовах выдаткоўваюцца значныя сродкі. Такое супрацоўніцтва ажыццяўляецца як у рамках СНД, так і значна шырэй гэтых рамак, і жыццё пераконвае ў яго несумненнай карысці.

Зараз разгарнуўся грандыёзны сумесны праект па будаўніцтве горнаўзбагачальнага камбіната на буйнейшым Гарлыкскім (Карлюкскім) месцанараджэнні калійных соляў у Туркменістане. Мы з вамі цудоўна ведаем, што такое для нашай краіны айчынны гігант — «Беларуськалій», памятаем, як не проста было яго будаваць нават сіламі тады яшчэ вялікай адзінай дзяржавы, з цікавасцю сочым за яго развіццём сёння — уводам у дзеянне новых руднікоў. І на прыкладзе «Беларуськалія» можам скласці прадстаўленне, наколькі важная такая новабудоўля для Туркменістана.

З гэтай краінай нас звязвае працяглая агульная гісторыя. Не ўсе ведаюць, што ў гады Вялікай Айчыннай вайны Туркменія прыняла ў эвакуацыю тысячы беларускіх сем'яў. Мясцовыя дайхане дзялілі апошняй ляпёшкай і не меншым за хлеб багаццем — вадой. Пазней беларусы аддзячылі БелАЗамі для сернага камбіната, трактарамі для палёў, маладымі спецыялістамі з дыпломамі ВНУ.

Яны працавалі на прадпрыемствах вялікай хіміі Кара-Багаз-Гола, на нафтапромыслах Небіт-Дага і Чэлікена, бо рэспубліка займала чацвёртае месца ў СССР па здабычы нафты і газу. Беларусь атрымлівала ўзамен не толькі прадукты перапрацоўкі «чорнага», але і «белага» золата — бавоўны, каракуль з Чарджоу, дываны Ашхабада, рыбу з Краснаводска... У многіх гарадоў зараз іншая назва, але гэта нічога не мяняе.

Так складваецца, што ў эпіцэнтры падзей, пра якія мы хочам расказаць сёння, зноў апынуліся беларусы. Перш-наперш гэта — калектыў сталічнага навукова-даследчага і праектна-канструктарскага інстытута горнай і хімічнай прамысловасці «Белгорхімпрам», а ў хуткім часе будуць мець прамыя адносіны да буйнейшай новабудоўлі ў Цэнтральнай Азіі і дзясяткі іншых працоўных калектываў Беларусі — будаўнікі, шахтапраходчыкі, транспартнікі...

Кіраўніцтва абодвух краін надае вялікае значэнне развіццю дзелавых сувязяў. Летась Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка падчас візіту ў Туркменістан разам з яго прэзідэнтам Гурбангулы Бердымухамедавым прыняў удзел ва ўрачыстай закладцы капсулы ў падмурак Гарлыкскага ГАКа. У сваю чаргу Гурбангулы Бердымухамедаў прылятаў у Мінск на падпісанне кантракта.

Перадгісторыю пытання можна прасачыць па нядаўняй публікацыі ў адной з вядучых газет Туркменістана — «Нейтральны Туркменістан», якая з'яўляецца газетай Прэзідэнта краіны. Гэты артыкул дае ўяўленне пра тое, якое значэнне мае будучы горнаўзбагачальны камбінат для эканомікі і сацыяльнай сферы ўсяго рэгіёна, адчуць адносіны мясцовага насельніцтва да новабудоўлі. А Усход, як мы памятаем, «справа тонкая». Каб як мага лепш увесці чытача ў курс спраў, перадрукоўваем артыкул амаль цалкам.

ISSN 1990 - 763X

СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА IV КВАРТАЛ 2010 г.

Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)

Індэкс	месяц	IV квартал
63850 (індывідуальны)	12400	37200
63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў)	11600	34800
63858 (ведамасны)	19900	59700
63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры)	18000	54000

Заставайцеся з намі!

«ПАЙШОЎ ДЗІД У ГРЫБЫ, А БАБА Ў СУНЫЧКЫ, ПРЫЙШОЎ ДЗІД БЕЗ ШТАНОЎ, БАБА БЕЗ СПАДНЫЧКЫ»,

— старэнькая Вольга Сухаверхая, якая прыехала на свята «Покліч Палесся» з Пінскага раёна, ведае вельмі шмат розных прыпевак. І заводзіць іх на ўласцівым толькі пінскім палешукам меладычным дыялекце, які пераклікаецца з украінскай мовай.

Прынамсі, тут у кожнага з прадстаўнікоў рэгіёнаў можна было пачуць свае асаблівасці вымаўлення, а тое і зусім незразумелыя словы... А Вольгу Цімафееўну ўжо не спыніць: «Тры дыды тры дыды, палюбілі бабу, а чацвёрты малюсенькі прычапіўся взаду». Пра сэнс можна толькі здагадвацца, хаця быццам бы і зразумела без шматкроп'я. На ўсякі выпадак: «тры дыды» азначае — «тры дзяды».

Тут аб'яднана паганства і хрысціянства

Яны, палешукі, вельмі розныя. Адно зразумела: яны зусім не саромеюцца таго, што іх далёка не ўсе «рускамоўныя» разумеюць і пастаянна перапытваюць. Праўда, тыя ж прыезджыя ў Ляскавічы Петрыкаўскага раёна з задавальненнем ласуюцца ўсім, што прыгатавана ў вялікай колькасці на падворках — імправізаваных сядзібах палешукоў з васьмі раёнаў Гомельскай вобласці (Жыткавіцкага, Петрыкаўскага, Нараўлянскага, Мазырскага, Калінкавіцкага, Лельчыцкага, Ельскага, Хойніцкага) і трох — Брэсцкай (Столінскага, Лунінецкага, Пінскага). Калі толькі крышачку паспрабаваць прысмакаў на кожным з падворкаў — і няблага пад'ясі.

Але ж вочы разбягаюцца не толькі ад колькасці такіх прысмакаў. Тут прадстаўлены сапраўды самабытныя промыслы, якія, акрамя іншага, маюць і патаемны, сакральны сэнс. Расказвае дырэктар Пруткоўскага сельскага дома культуры Мазырскага раёна Наталля Прус:

— Вось шлюбны ўбор з рознакаляровымі стужкамі. Па ім можна сказаць, што дзяўчына заможная і мела маці і бацьку. А вось такую вопратку насіла жанчына, якая карміла немаўлятка. Тут сарочка вышывалася спецыяльнымі абярэгамі — каб захаваць ад сурокаў. Зусім іншы касцюм удавіцы — калі ў вышыванні былі ўведзены яркія чырвоныя кветкі, гэта казала пра тое, што прайшоў пэўны час і яна можа браць новы шлюб. А вось гэта касцюм цяжарнай жанчыны — на ім калючыя ружы з бутонамі — каб захаваць будучую маці і дзіцятка ад сурокаў. Тут аб'яднана паганства (калючая ружа — каб «накалоць» ведзьмаў) і хрысціянства (рукаў вышываўся ружамі ў форме крыжа). Бо для працавітай жанчыны галоўнае — рука. Багата ўпрыгожваліся вышываннем грудзі — каб было шмат малака. Усё зроблена рукамі майстроў з народнага аматарскага аб'яднання нашага Пруткоўскага дома культуры. У мяне ёсць маленькая вышывальшчыца Маша Каменская, тут прадстаўлена і сарочачка, якую яна вышыла сваімі ручкамі.

Багатыя традыцыі Палескай зямлі і не вельмі вядомая вялікай грамадскасці гісторыя гэтага краю з яе ўнікальнай самабытнасцю могуць зрабіць фестываль «Покліч Палесся» пэўнай з'явай у культурным жыцці Беларусі.

На працягу многіх стагоддзяў на гэтых землях развівалася беларуская этнічная самасвядомасць і складваліся агульнаславянскія этнакультурныя традыцыі. Першая стаянка першабытных людзей таксама знаходзіцца ў гэтым рэгіёне. Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь Сяргей Сідорскі адкрывае новы фестываль на Палессі і нагадвае:

— Падзеі, апісаныя Іванам Мележам у яго знакамітай «Палескай хроніцы», сталі сапраўднай гісторыяй Палесся. Сёння Палескі край прадстаўлены прыгажэйшымі населенымі пунктамі з сучаснай інфраструктурай. Тут беражліва ставяцца да прыроднай спадчыны, захоўваюць традыцыі сваіх продкаў. Жыхары Палесся заўсёды адрозніваліся шчодрасцю і гасціннасцю, дабратой і працавітасцю. Як пісаў Іван Мележ, «гэта сапраўды цудоўны край і яшчэ больш цудоўныя яго людзі — палешукі». Унікальнасць прыпяцкага Палесся ў тым, што дзякуючы натуральным геаграфічным умовам, матэрыяльнай і духоўнай культуры гэтага краю, дойлідству, фальклору, дыялектам, народна-прыкладному мастацтву захаваліся многія рэліктавыя рысы, якія ўзыходзяць да глыбокай старажытнасці. Фальклорная традыцыя Палесся з'яўляецца своеасаблівым эталонам аднаўлення агульнаславянскага фальклорнага фонду. Менавіта ў палескім рэгіёне і сёння існуюць дахрысціянскія абрады — такія, як «Ваджэнне куста», «Провады русалак» і іншыя. Матэрыяльная культура Палесся прадстаўлена шматлікімі і яркімі лакальнымі асаблівасцямі.

Як злавіць удачу за хвост рыбіны

Некаторыя з конкурсаў асабліва падабаюцца гледачам, якія практычна адразу ператвараюцца ў актыўных удзельнікаў. Як не паспытаць удачу ў выглядзе жывой рыбіны і не злавіць яе за хвост — сваімі рукамі. Задавальненне ад працэсу атрымліваюць усе, відаць, акрамя ахвяры воднага палявання. Незаўважна, ад падворка да падворка, ад конкурсу да конкурсу, ад песні да прыпеўкі можна было не раз прайсці паўтара кіламетра ўздоўж канала да Прыпяці, дзе і разгарнулася ўсё дзейства першага фестывалю этнакультурных традыцый «Покліч Палесся». Калі стаміліся, можна было і праехаць — на карэце або дыліжансе — каму што падабаецца. І катар, які з ветрыкам катаў ахвотных па Прыпяці, быў не лішнім, бо людзей прыехала ў Ляскавічы з навакольных раёнаў — не пералічыць колькі! І вельмі шчыра палешукі радаваліся сустрэчы са знакамітымі «Песнярамі», якія, адказваючы ўзаемнасцю, праспявалі ўсе свае хіты, у тым ліку і «Жураўлі на Палессе ляцяць». Дарэчы, ёсць меркаванне, што гэтая песня можа стаць своеасаблівым гімнам фестывалю, які мае ўсе шанцы стаць штогадовым і нават міжнародным. Палессе ёсць жа не толькі ў Беларусі, але і ў Расіі, ва Украіне, Польшчы. Так што палешукоў значна больш, чым здаецца на першы погляд. Свае карані не забываюць і тыя з іх, хто даўно вылецеў з роднага гнязда і сёння жыве зусім далёка. На радзіму цягне ўсё роўна. Вядома, што ў Ляскавічах у XIX- XX стагоддзях былі майстры па пляценню элементаў іканастасаў, царскіх брамаў, акладаў з саломкі. Побач з Ляскавічамі існавала старажытная школа вырабу куфараў. Далей, на поўнач, былі распаўсюджаныя ткацтва і шорны промысел мотальскіх кажухоў... Цэнтрам рамёстваў і мануфактурнай вытворчасці Радзівілаў былі Целяханы, дзе працавалі мануфактурныя арцелі, вядомыя не толькі ў Беларусі і Польшчы, але і ў іншых рэгіёнах сучаснай Еўропы.

Адрадзіць традыцыі сівой даўніны імкнуцца ў Аснежыцах Пінскага раёна. Аксана Смужэвіч (справа) вучыць, як рабіць абярэгі.

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Зямля пад белымі крыламі... і моцнымі дубамі

Кожны куток Палесся прыгожы па-свойму. Гэта край лясоў, балот (яго яшчэ называюць «лёгкімі Еўропы»). Толькі тут, у Нацыянальным парку «Прыпяцкі» і Белавежскай пушчы, сустракаюцца дубы, якім па некалькі соцень гадоў. Яшчэ адзін маленькі дубок быў пасаджаны гаваровымі гасцямі непасрэдна падчас адкрыцця фестывалю — ён павінен пакласці пачатак своеасаблівай фестывальнай алеі. Парода дрэва выбрана невыпадкова — палескаму фестывалю прагназуюць доўгае і працяглае жыццё.

Дарэчы, перакананца, які дуб трывалы, мог кожны асабіста. Чоўны палешукі традыцыйна выраблялі менавіта са ствала гэтага дрэва — каб хапіла на сто гадоў і яшчэ нашчадкам у спадчыну засталася. Нашчадкі захавалі гэтае рэдкае сёння майстэрства і дзяліліся яго сакрэтамі з жадаючымі. Можна было і паспрабаваць прапліць на чоўне.

Ідэя, якая нарадзілася непасрэдна падчас правядзення фестывалю «Покліч Палесся» — стварыць у Петрыкаўскім раёне этнаграфічную палескую вёску. Яе можна будзе не толькі паглядзець, а і пажыць — ва ўмовах, максімальна набліжаных да старажытнага часу.

Прадукт, каментарыі і рэцэпты — бясплатна

Каб знайсці іншыя — на фестываль былі запрошаны кіраўнікі амаль 30 турыстычных фірмаў з Мінска, Гомеля і Брэста, якія рабілі свае высновы аб перспектыўнасці развіцця такога эколага-этнаграфічнага кірунку турыстычнай дзейнасці. Адказ на пытанне — чым заманіць турыста — можна было, безумоўна, знайсці на кожным з падворкаў — на любы густ, смак і нават водар. Напрыклад, на тым, што падрыхтавалі гаспадары — Нацыянальны парк «Прыпяцкі» — усім прапанавалі пакаштаваць сапраўднай самагонкі, якая з вялізнага апарата выцякала на вачах гледачоў. Ляснік Кірыла Тарнаўскі даваў прадукт, каментарыі і рэцэпты бясплатна:

— Сюды заліваецца вада, пара пайшла па трубе, сюды заліваецца брага. Традыцыйная брага рабілася з соладу. Бралася прарошчанае зерне, потым яно сушылася, малолася — атрымліваўся солад. Можна рабіць і з пшаніцы, і з жыта. Такія вось «прыборы», як гэты, звычайна ўстанаўліваліся ў лесе. Якасць вызначаецца на смак — звычайна не менш за 45-50 градусаў.

Фестываляў зашмат не бывае

За два дні на галоўнай сцэне свята самабытнай культуры «Покліч Палесся» выступіла амаль тысяча прафесійных і самадзейных артыстаў. Свае традыцыі, мастацтва і промыслы прадставілі дзясяткі населеных пунктаў рэгіёна. Часам здавалася, што тутэйшыя жыхары сышлі з фотаздымкаў пазамінулага стагоддзя. Памятныя прызы і дыпломы ўдзельнікам фестывалю ўручыў намеснік міністра культуры Тадэвуш Стружэцкі:

— Фестываляў многа не бывае. Калі яны ладзяцца з канкрэтнай мэтай, калі арганізатары ведаюць, чаго хочуць дасягнуць. Гэты новы фестываль этнакультурных традыцый не павінен паўтараць іншае. Вельмі ўважліва мы павінны падыйсці да таго, каб паказаць самабытнасць і традыцыйнасць.

Так, бо яны сёння каштуюць даражэй за ўсё — людзям ва ўсім свеце надакучыла штучнасць. Вельмі хочацца сапраўднасці, а не падробкі. Як адзначыў віцэ-прэм'ер, старшыня аргкамітэта фестывалю «Покліч Палесся» Іван Бамбіза, Палессе наша — унікальнае, такога ў свеце больш няма нідзе:

— Мы ганарымся, што ёсць такая цудоўная тэрыторыя, і яна заслугоўвае таго, каб развівацца. Мы хочам падняць эканоміку гэтага краю і на яе базе стварыць добрыя ўмовы для тых, хто тут жыве, і для тых, хто сюды будзе прыязджаць. Для тых, хто хоча ўбачыць унікальную прыроду, адчуць сябе свабодным чалавекам у такім цудоўным кутку палескай зямлі. Мы плануем у будучыні пашырыць геаграфію фестывалю, прыцягнуць да ўдзелу і нашых суседзяў-палешукоў з Украіны, Расіі... Можна заводзіць сюды больш турыстаў — тым больш, што ў Нацыянальным парку «Прыпяцкі» для гэтага ёсць усе ўмовы. Вядома, нам патрэбна многа дапрацаваць — магчыма, з прыцягненнем і грамадскасці, і нават вуковых колаў. Але ж самае галоўнае тое, што этнакультурныя традыцыі Палесся мы павінны захаваць. Трэба, каб падцягваўся бізнэс і вырашалася, якім чынам рэалізоўваць турыстычныя магчымасці рэгіёна.

Палессе пакліча зноў і зноў

Самая важная падзяка — ад саміх палешукоў, якія на сваёй зямлі даўно не бачылі такога маштабнага свята з вядомымі артыстамі і нават феерверкам. І вераць, што такі фэст стане традыцыйным. Людміла Куневіч прыехала ў Ляскавічы з вёскі Камаровічы — гэта 50 км ад роднага населенага пункта. Кажа, усё спадабалася, усё — вельмі цікава:

— Наш народ цудоўны, таленавіты. Мы дома сядзім і нічога не бачым — а тут так хораша. Трэба выбірацца часцей, такое свята не забудзеш доўга.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Факт

ПАДПАЛІЎ БАЦЬКОЎСКУЮ ХАТУ

Падобна на тое, што ў разладзе з усім светам знаходзіўся 37-гадовы жыхар пасёлка Мухавец Брэсцкага раёна, які пайшоў на безразважны ўчынак. Спачатку мужчына пасварыўся з жонкай і перайшоў жыць да маці ў вёску Абяроўшчына Камянецкага раёна. Але і там жыццё не заладзілася: пачаліся высвятленні адносінаў з маці, сястрой.

Як расказаў карэспандэнту газеты **начальнік папярэдняга расследавання Камянецкага РАУС Вячаслаў САЦЭВІЧ**, пасля адной са сварак з роднымі мужчына выліў змесціва бляшанкі з фарбай на падлогу пакоя, дзе жыў, і падпаліў. Сам тым часам сеў у машыну і з'ехаў да пастаяннага месца жыхарства. Але ўзгаранне адразу заўважылі маці і сястра зламысніка, якія знаходзіліся недалёка ад дома. Жанчыны выклікалі пажарных. Полымя хутка ўтаймавалі, ад агню пацярпела абстаноўка аднаго пакоя. А падпальшчык быў затрыманы, узяты пад варту. Вядзецца следства.

Яна СВЕТАВА.

ЗЛОДЗЕЙ У ХРАМЕ

Работнік Баранавіцкага аддзялення чыгункі знаходзіўся ў храме Святых жанчын-міраносіц, што ў Баранавічах.

І хоць чалавек быў у царкве нядоўга, але ў яго нехта ўкраў фотаапарат SONY ALFA коштам 3 млн рублёў.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

РОК-ОПЕРА «ІСУС ХРЫСТОС — СУПЕРЗОРКА» ЗАГУЧЫЦЬ ПА-БЕЛАРУСКУ

Сусветна вядомая рок-опера «Ісус Хрыстос — суперзорка» загучыць на беларускай мове. Драматычны тэатр імя Горкага вядзе перамовы з кампаніяй аўтара твора Эндру Лойда Вебера The Really Useful group у сувязі з яе пастаноўкай.

Сталічных тэатралаў чакае таксама цікавы міжнародны тэатральны праект — прэм'ера спектакля «Дзева і смерць». Гэту пастаноўку славутага польскага рэжысёра Кшыштафа Занусі гледачы ўбачаць 21 і 22 верасня.

Алена ГУСАЧЭНКА,
«Мінск—Навіны».

Выбары-2010

У ПЕРШУЮ ЧАРГУ

АХВОТНЫЯ ўзяць удзел у прэзідэнцкай кампаніі цяпер фарміруюць свае ініцыятыўныя групы, якія будуць збіраць подпісы ў падтрымку свайго паплечніка. Падаваць адпаведныя спісы разам з заявай аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы можна да канца тыдня. Час яшчэ дазваляе, і патэнцыйныя кандыдаты не надта спяшаюцца. Цэнтрвыбаркам зарэгістраваў пакуль толькі адну ініцыятыўную групу. 1300 чалавек будуць збіраць подпісы для вылучэння кандыдатам у прэзідэнты Віктара Цярэшчанку, старшыню савета «Асацыяцыі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва».

— Патэнцыйных кандыдатаў нішто не змушае быць першымі, тым больш, што яны змогуць збіраць подпісы не раней за 30 верасня, — адзначае **старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія ЯРМОШЫНА**.

Пачатак тым не менш пакладзены. Чыя цяпер чарга? Свае «прэзідэнцкія» апетыты выказвалі многія палітыкі, ці столькі ж будзе вылучэнцаў?.. Даведаемся ўжо ў найбліжэйшыя дні.

Першыя ластаўкі ёсць і ў стане назіральнікаў. Што да нацыянальных назіральнікаў, то Беларускі Хельсінкскі камітэт ужо вылучыў свайго прадстаўніка для нагляду на пасяджэннях Цэнтрвыбаркама. Астатнія грамадскія аб'яднанні ды палітпартыі яшчэ не актыўнічаюць.

— Палітычныя партыі пакуль увогуле не праяўляюць інтарэсу да магчымасці назірання, — канстатуе Л. Ярмошына.

Яна дапускае, што назіральнікі ад партый з'явяцца ўжо пасля вылучэння кандыдатаў. Самі ж кандыдаты, як будуць зарэгістраваныя, змогуць прызначыць сваіх прадстаўнікоў у склад ЦВК з правам дарадчага голасу.

Старшыня Цэнтрвыбаркама падкрэслівае, што запрашэнні для назірання за выбарамі скіраваныя дзвюм міжнародным місіям своечасова — літаральна праз некалькі дзён пасля абвяшчэння даты электаральнай падзеі.

З ліку міжнародных назіральнікаў у першую чаргу праявілі інтарэс прадстаўнікі місіі СНД. Паводле слоў Л. Ярмошынай, яны ўжо выйшлі на кантакт з Цэнтральнай камісіяй і папрасілі дасласць анкеты, неабходныя для акрэдытацыі. Дарэчы, пяцярых доўгатэрміновых назіральнікаў яны гатовыя скіраваць ужо ў найбліжэйшыя дні.

У першых радах не назіраецца «заходніх» назіральнікаў. Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ на кантакт з ЦВК у гэту электаральную кампанію яшчэ не выходзіла. Верагодна, спачатку яны звяжуцца з нашым знешнепалітычным ведамствам, — мяркуюць у Цэнтрвыбаркаме. Што ж, будзем сачыць з нецярпеннем... за папаўненнем усіх шэрагаў.

Зоя ВАРАНЦОВА.

Сацапытанне

АМАЛЬ 86 ПРАЦЭНТАЎ ГРАМАДЗЯН БЕЛАРУСІ НЕ ДАВЯРАЮЦЬ АПАЗІЦЫЙНЫМ ПАРТЫЯМ

Апазіцыйным партыям не давяраюць 85,9 працэнта грамадзян Беларусі: 71,5 працэнта адзначылі графу «не», 14,4 працэнта — «хутчэй, не». Такія звесткі сацапытання, праведзенага ў жніўні 2010 года Аналітычным цэнтрам EcooM, паведамілі БЕЛТА ў цэнтры.

Апазіцыйным партыям давяраюць 3,1 працэнта рэспандэнтаў, а 2,2 працэнта — «хутчэй, так». Без адказу пытанне сацыёлагаў пакінулі 8,8 працэнта. У той жа час партыям, якія супрацоўнічаюць з уладай, давяраюць 48,6 працэнта грамадзян, «хутчэй» давяраюць — 18,2 працэнта. Не карыстаюцца яны папулярнасцю ў 16,6 працэнта апытаных («не» — 7,4 працэнта, «хутчэй, не» — 9,2 працэнта). Не змаглі вызначыць сваё стаўленне да іх 16,6 працэнта ўдзельнікаў апытання. У час сацыялеследавання апытаны 1,4 тыс. грамадзян Беларусі ва ўзросце ад 18 гадоў і старэйшых. Памылка выбаркі — у дапушчальных межах.

Падрабязнасці

ДА 2020 ГОДА ШЫРОКАМАШТАБНЫХ ЗАКУПАК НОВАЙ ТЭХНІКІ І ЎЗБРАЕННЯ ДЛЯ СУХАПУТНЫХ ВОЙСКАЎ НЕ БУДЗЕ

Сухапутныя войскі сёння прадстаўляюць аптымальную структуру Узброеных Сілаў, якая ў стане рэальна выконваць ускладзеныя на яе задачы, заявіў генерал-маёр Аляксандр Нікіцін, камандуючы сухапутнымі войскамі УС РБ, на прэс-канферэнцыі, прымеркаванай да Дня мотастралкоў.

— Вядома, ёсць пэўныя праблемы, бо, скажам, ніхто не чакаў эканамічнага крызісу, але я магу далажыць вам, што нават ва ўмовах эканомнага і мэтазгоднага расходавання і фінансавых, і матэрыяльных сродкаў сёлета мы дастаткова шчыльна і ў поўным аб'ёме выканалі план падрыхтоўкі сухапутных войскаў, ніводнае мерапрыемства не было адменена — мы іх усе правялі, — сказаў генерал-маёр Аляксандр Нікіцін.

На сёння, па словах Аляксандра Мікалаевіча, колькасць асабістага саставу сухапутных войскаў складае каля 16 тысяч чалавек, а гэта каля 40 % ад усёй колькасці Узброеных Сілаў.

Што тычыцца ўзбраення і тэхнікі, то на сёння камандуючы сухапутнымі войскамі лічыць пакінутую ў спадчыну савецкую тэхніку цалкам баяздольнай:

— Кожная дзяржава, у тым ліку і Рэспубліка Беларусь, падыходзіць дастаткова рацыянальна і аптымальна да ўтрымання войска, мы ўсе добра разумеем, што гэта вельмі дарагая забава, таму сёння пытанне стаіць у большай ступені не ў насычэнні сучаснымі ўзорамі ўзбраення і тэхнікі, а ў рацыянальным выкарыстанні таго, што ёсць, — сказаў Аляксандр Нікіцін і дадаў, што аснову сухапутных войскаў складае ўзбраенне і тэхніка савецкага ўзору. — У бліжэйшай перспектыве парк узбраення і тэхнікі будзе заставацца савецкім, але пры ўсіх умовах мадэрнізацыі я ўсё-такі галоўным лічу ўмелае іх прымяненне. І сённяшні іх стан дазваляе цалкам забяспечваць выкананне задач, — сказаў генерал-маёр і прывёў прыклад апошніх батальённых вучэнняў, дзе прымянялася ўзбраенне і тэхніка, што да гэтага знаходзілася на захаванні ў воінскіх часцях і не дала ніводнага збою на вучэннях.

Але ж зразумела, што бясконца эксплуатаваць узбраенне савецкага ўзору немагчыма, таму «Звязда» пацікавілася ў Аляксандра Мікалаевіча, калі ж пачнецца глабальнае пераўзбраенне сухапутных войскаў:

— Ёсць пэўныя запланаваныя рэчы, звязаныя з канцэпцыяй развіцця Узброеных Сілаў да 2020 года, таму да гэтага часу шырокамаштабных закупак для сухапутных войскаў не будзе. Недзе да 2015 года мы плануем перайсці на баявую сістэму салдата, — сказаў Аляксандр Нікіцін. — Што тычыцца сістэм прыярытэтнага развіцця — разведкі, кіравання, сістэм РЭБ, — то ў гэтым кірунку праца ідзе і сёння, у тым ліку частка прадпрыемстваў абароннага комплексу краіны займаецца глыбокай мадэрнізацыяй.

Камандуючы сухапутнымі войскамі таксама адзначыў, што створаная зараз сістэма падрыхтоўкі афіцэраў і сістэма ваеннай адукацыі з'яўляецца аптымальнай і адпавядае патрэбам дзяржавы і войска.

Павел БЕРАСНЕЎ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

НЕМКА ПАДАРВАЛА МУЖА І АБСТРАЛЯЛА ШПІТАЛЬ

Трагедыя адбылася ў нядзелю ў горадзе Лерах на поўдні Германіі. Адна з мясцовых жыхарак уварвалася са стрэльбай у клініку Святой Лізаветы пры каталіцкім прыходзе.



Жанчына адкрыла бязладную стральбу па наведвальніках і працаўніках бальніцы, параніўшы трох чалавек, і ўдарыла нажом санітара, які памёр ад страты крыві. Зламысніца ўступіла ў перастрэлку з паліцэйскімі, якія прыбылі на месца НЗ, і была забітая снайперам. Незадоўга да нападу на бальніцу ў суседнім доме адбыўся выбух, а пад завалами ў адной з кватэр былі знойдзены трупы мужчыны і дзіцяці. Пазней следчыя высветлілі, што гэта менавіта жанчына са стрэльбай зрабіла выбух у кватэры, дзе жылі яе сямігадовы сын і муж, з якім яна жыла ў фіктыўным шлюбе, але некаторы час таму разышлася. Жанчына знішчыла кватэру з дапамогай лёгкаўзгаральных рэчываў, папярэдне застрэліўшы мужа і сына, пасля чаго выбегла з вінтоўкай на вуліцу, параніўшы некалькіх мінакоў і накіраваўшыся ў клініку. Жанчыне быў 41 год, яна працавала адвакатам у мясцовым бюро і некалькі месяцаў жыла асобна ад сваёй сям'і. Яшчэ адна падобная сямейная драма адбылася ў нядзелю ўвечары ў прыгарадзе амерыканскага Х'юстана. Там паліцыя знайшла ў адным з прыватных дамоў целы трох дзяцей: дзяўчынак 13 і 7 гадоў і васьмігадовага хлопчыка. У адным з пакояў быў знойдзены іх бацька Мухамед Гоэр, які спрабаваў застрэліцца. Па версіі следства, Гоэр, які страціў апеку над дзецьмі пасля разводу з жонкай і чакаў новага судовага разгляду, асцерагаўся канчаткова пазбавіцца права на спатканні з малымі. Па меркаванні следчых, гэта і стала прычынай нападу.

РЫС У АБМЕН НА ПРАБАЧЭННІ

Паўднёвая Карэя можа аднавіць пастаўку ў КНДР гуманітарнай дапамогі ў выглядзе харчавання ў поўным аб'ёме ў тым выпадку, калі Пхеньян прызнае сваю адказнасць за знішчэнне карвета «Чханан», а таксама прынясе афіцыйныя прабачэнні і пакарае вінаватых.

Сеул лічыць такія дзеянні з боку КНДР абавязковай умовай паляпшэння ўзаемаадносінаў паміж дзвюма рэспублікамі. Да 2008 года Сеул штогод прадстаўляў Паўночнай Карэі 400 тысяч тон рысу ў якасці гуманітарнай дапамогі. Пасля таго, як да ўлады ў Паўднёвай Карэі прыйшоў новы ўрад на чале з кансерватарам Лі Мен Бакам, адносіны паміж Сеулам і Пхеньянам прыкметна пагоршыліся, і пастаўкі былі спыненыя.

ЗМОВА ДВОРНІКАЎ СУПРАЦЬ ПАПЫ АКАЗАЛАСЯ ЖАРТАМ

Шасцёра дворнікаў, якіх падазравалі ў арганізацыі замаху на Папу Рымскага, былі затрыманыя пасля таго, як іх калега не зразумеў іх жарт.

За чаем адзін з дворнікаў выказаў здагадку, што застрэліць Папу няпроста, бо папамабіль, напэўна, куленепрабівальны. Іншы прапанаваў выкарыстоўваць гранатамёт, для снарадаў якога браня машыны пантыфіка — не перашкода. Потым яны засмяяліся і змянілі тэму гутаркі. Дворнік, які чуў гутарку, патэлефанаваў у паліцыю. Дворнікаў, шасцярых выхадцаў з паўночнай Афрыкі ва ўзросце ад 26 да 50 гадоў, затрымалі ў пятніцу. Пазней іх выпусцілі.

АКТОБЭРФЭСТУ — 200 ГАДОЎ

У Мюнхене 18 верасня адкрыўся традыцыйны фэст піва «Актобэрфэст», які працягнецца да 4 кастрычніка. Спецыяльны размах святу надае той факт, што сёлета «Актобэрфэст» адзначае свой 200-гадовы юбілей. З выпадку юбілею ў мюнхенскім музеі гарадской гісторыі арганізавана тэматычная выстава. Першую бочку — сёлета яна была са «Шпатэнам» — па традыцыі адкрыў бургамістр Мюнхена. Пасля чаго голасна даў каманду «Налівайце!», якую старанна будуць выконваць да канца фэсту.



68 гадоў таму выйшаў чацвёрты падпольны нумар «Звязды»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Калі мы да іх прыйшлі з мамай, то павіталіся з імі на рускай мове. А яны нам адказалі на беларускай. І мы таксама перайшлі на беларускую, — узгадвае Сяргей Барысаў.

Пасля таго, як выхавальнік інтэрната Сяргей Хмялеўскі (заўважце, як цесна пераплецены лёсы — у гонар яго бацькі, Героя Савецкага Саюза Аркадзя Хмялеўскага, названа адна з вуліц у Мінску) расказаў дзецям пра вайну, пра нашу газету-падпольшчыцу і пра сям'ю Хадасевічаў, пасля таго, як былі ўскладзеныя кветкі, мы пагаварылі з Анатолем Бяляўскім, загадчыкам інтэрната, пра адну невялікую праблему: мемарыяльная дошка ёсць, дзеці з задавальненнем ускладаюць кветкі, але месца для кветак... не прадугледжана. Прыходзіцца класці на зямлю побач, у невялікую клумбу. Мы з Анатолем Бяляўскім сышліся на тым, што нядрэнна было б пад мемарыяльнай дошкай зрабіць невялікую палічку для кветак.

Ужо вярнуўшыся ў рэдакцыю, я патэлефанаваў у адміністрацыю Савецкага раёна Мінска і пагутарыў з начальнікам аддзела культуры Сяргеем Мядзведзевым:

— Я думаю, тут няма нічога складанага! — аднёсся з разуменнем да такой нашай прапановы Сяргей Уладзіміравіч. — Я паспрабую пагутарыць з ЖРЭА нашага раёна і з ЖЭСам. Думаю, што яны сваімі сіламі гэта змогуць зрабіць.

Так што, відаць, з дапамогай адміністрацыі Савецкага раёна ў наступны раз дзеці змогуць ускласці кветкі да мемарыяльнай дошкі. У сваю чаргу, рэдакцыя «Звязды» ўдзячная навучэнцам 76-й школы, жыхарам і адміністрацыі інтэрната за тое, што яны не забываюць гісторыю нашай газеты і тых людзей, якія аддалі сваё жыццё за тое, каб «Звязда» выходзіла на акупаванай фашыстамі Беларусі.

Павел БЕРАСНЕЎ.

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 21.09.2010 г. (для б/н разлікаў)

Агенцтва Уладзіміра Грэўцова

▲1 долар ЗША	3 029,00
▼1 еўра	3 972,53
1 латвійскі лат	5 600,44
1 літоўскі літ	1 149,87
1 чэшская крона	160,90
1 польскі злоты	1 005,06
▲1 расійскі рубель	97,77
1 украінская грыўня	381,97

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	30,9809
10 UAH	39,0557
1000 BYR	10,2281
EUR	40,5416

Открытое акционерное общество «Сантехэлектромонтаж» приобретает на баланс Общества простые (обыкновенные) акции, выпущенные ОАО «Сантехэлектромонтаж»,

в количестве до 4000 штук по цене 25 000 рублей за одну акцию с оплатой денежными средствами с целью дальнейшей продажи инвесторам. **Срок**, в течение которого акционеры должны предоставить предложения о продаже принадлежащих им акций, — **с 27.09.2010 г. по 08.10.2010 г. по адресу: г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8а**.

Выкуп простых обыкновенных акций произвести в период **с 11.10.2010 г. по 22.10.2010 г.** с оформлением сделок купли-продажи акций пропорционально поданным заявлениям. **Адрес**, по которому будут заключаться договоры купли-продажи акций: **г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8а**.

Сроки, форма и порядок оплаты — наличными денежными средствами или перечислением средств на счет продавца не позднее 60 банковских дней с момента заключения сделки. УНП 400052115

Конт. тел. 8 0232 57 41 91

ОАО «Управление механизации № 91» извещает своих акционеров, что внеочередное собрание акционеров состоится 27 сентября 2010 года в 10 часов по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11

Регистрация участников начинается с 08 часов 45 минут по предъявлении документа, удостоверяющего личность.

Повестка дня:

1. О предварительном решении об увеличении уставного фонда путем дополнительного выпуска акций с передачей их в собственность Республики Беларусь.

Тел. 8 017 226 77 63

Наблюдательный совет ОАО «Управление механизации № 91». УНП 100055130

Филиалу «Экспериментальная база «Жодино» Республиканского дочернего унитарного предприятия по племенному делу «Заречье»

Срочно требуются на работу:

Трактористы-машинисты на энергонасыщенные трактора МТЗ-3022, МТЗ-1522, К-700.

Высокая заработная плата. Предоставляется жилье.

Контактный телефон: 8 (029) 1334210 — директор Владимир Васильевич.

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

Аукцион состоится 26 октября 2010 года в 16.30 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: **г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206** в рабочие дни **с 08.00 до 17.00**. Последний день приема заявлений **– 20.10.2010** года до 17.00.

Продажа земельного участка производится гражданам Республики Беларусь в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Условие проведения аукциона – **наличие не менее двух участников**.

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон, желающие принять участие в аукционе представляют в сроки, указанные в извещении:

а) квитанции о **внесении задатка** на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета **№ 3642017441709** в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 **(разовый платеж)**; б) документ, удостоверяющий личность **(паспорт)** покупателя, а в случае участия в аукционе его представителя – **паспорт и нотариально заверенную доверенность**.

Порядок осмотра на местности земельного участка: выезд по желанию, предварительное ознакомление с земельно-кадастровой документацией всем желающим. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: строительство инженерных коммуникаций будет осуществлено в соответствии с ПСД за счет бюджета города. Продажа земельного участка производится без изменения целевого назначения.

Победитель аукциона обязан: в течение десяти рабочих дней после принятия решения о предоставлении земельного участка в частную собственность **внести плату за земельный участок** (задаток засчитывается при внесении платы); **возместить затраты на организацию и проведение аукциона**, в том числ

ТЭЛЕВІЗАРЫ — У ДОБРЫЯ РУКІ

ЧАРГОВЫ выезд звяздоўцаў «у людзі» быў здзейснены таксама з размахам: трэба было ўручыць нашым падпісчыкам адразу два каляровыя тэлевізары — на Міншчыне і Гродзеншчыне. Па старой добрай традыцыі на «падарункавы» маршрут была «пасаджана» максімальная колькасць раёнаў, дзе нас маглі чакаць падпісчыкі.

Зразумела, што ваяж на Валожыншчыну, дзе свой каляровы «Віцязь» зачакалася Таццяна Шырвель, не мог прайсці без наведвання Дзяржынскага краю. Зноў прыемная сустрэча з ужо старым знаёмым, намеснікам старшыні мясцовага райвыканкама Аляксандрам Чаганам, які нават не выказаў і долі сумнення, што старэйшае беларускамоўнае выданне зможа калі-небудзь мінуць прыгранічны са сталіцай рэгіён, дзе зараз ужо нямала мінчан набылі ў маёмасць дачы ці дамы. Можна не сумнявацца, што прыкладна такая ж сітуацыя і са Стоўбцамі, якія па маскоўскіх мерках можна лічыць гарадской ускраінай. Тут таксама «Звязда» была сустрэта добрым настроем і аптымістычнымі прагнозамі на завяршаючы этап падпісной кампаніі на 4-ы квартал 2010 года.

Пра сустрэчы на Валожыншчыне можна казаць шмат. Супрацоўнікі аддзела ідэалогіі райвыканкама з разуменнем адносіцца да нашай просьбы правесці фотасесію на галоўнай пошце раёна з удзелам адказных за падпіску асобаў і ўжо накіраваліся на сумесную «аўдыенцыю» туды. Праўда, гэтым планам не суджана было збыцца. У той час, калі мы выцягвалі з салона рэдакцыйнага аўто «блакітны экран», з суседняй на паркоўцы машыны пачуўся голас: «Навошта несці на пошту — давайце адразу сюды перагрузім». Здалося, што гэта жарт, аднак потым аказалася, што па суседстве знаходзяцца нашы даўнія падпісчыкі з вёскі Суднікі, якія на самай справе прыехалі за галоўным прызам у раённы цэнтр. Лепшага варыянту сустрэчы і не прыдумаць. Пазіраваць прыйшлося Таццяне Вячаслававуне і Генадзю Іванавічу Шырвелям. Кампанію ім склаў начальнік Валожынскага РВПС Зігмунд Лужынскі (**фота 1**). Пры гэтым Зігмунд Сільвестравіч новаспечаным уладальнікам каштоўнага прыза нагадаў, што «Звязда» заўсёды прывозіць падарункі па месцы пражывання сваіх падпісчыкаў, чым і адрозніваецца ад іншых выданняў. Дзякуй за камплімент! У якасці пацвярджэння сваіх цёплых слоў начальнік раённай пошты з задавальненнем нас правёў у мясцовую гімназію № 1, дзе мы мелі сустрэчу з яе дырэктарам Наталляй Чарнышовай.

У багажніку нашага аўто яшчэ чакаў свайго лёсу другі тэлевізар «Віцязь», які праз Іўе накіроўваўся на Навагрудчыну. Трэба сказаць, што гэты куток Гродзенскай вобласці ўжо даўно і па праве носіць званне «звяздоўскага», таму такія прызы накшталт тэлевізараў — тут не рэдкасць. Як не ў навінку аказалася тое, што галоўны прыз выйграла Марыя Федарака. Праўда, Марыя Максімаўна падхапіла зараз нейкую прастуду, таму з вёскі Кашалёва да Навагрудка прыехаць не змагла. Выручыла братава жонка Марыя Уласевіч, якая, праўда, доўга не згаджалася засведчыць на фота факт набыцця каштоўнага падарунка. Але ў рэшце рэшт пад напорам начальніка Навагрудскага РВПС Святланы Дзедавец і начальніка аддзела ідэалогіі райвыканкама Уладзіміра Гундара здалася (**фота 2**).

Наша сустрэча на Навагрудчыне была б няпоўнай, калі б мы не наведалі з падпісной місіяй адно з вядомых у краіне прамысловых прадпрыемстваў — Навагрудскую швейную фабрыку «Крэда». Аптымізму яе кіраўніка Аліны Бахар можна толькі пазайздросціць. У няпростых эканамічных умовах Аліна Іванаўна не толькі ўмела вырашае пытанні вытворчасці прадукцыі і яе рэалізацыі, але і не забывае пра патрэбы калектыву. А ў сацыяльны пакет удала можа ўпісвацца і газета «Звязда».

Наша паездка перад фінішным рыўком на Мінск працягнулася ў Карэлічах. Здаўна гэты рэгіён меў звяздоўскую «афарбоўку». Мы не сумняваемся, што і апошні візіт пакінуў пасля сябе адпаведную аўру з мэтай, каб у самы бліжэйшы час сюды вярнуцца. Калі не для ўручэння каштоўных прызоў, то для вітання з кіраўніцтвам раённай вертыкалі, паштавікамі і пастаяннымі падпісчыкамі — у абавязковым парадку.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

Мінск—Дзяржынск—Стоўбцы—Валожын—Іўе—Навагрудак—Карэлічы—Мінск.

ГРЫБНЫ ЧЭМПІЯНАТ У ДРЭТУНІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сёлета грыбное свята ў Дрэтуні праходзіла напярэдадні Дня лесніка, таму святочная тусоўка перад вясковым клубам нагадвала хутчэй сход работнікаў лесу. І нічога дзіўнага ў гэтым не было, Дрэтунь, бадай, самая «лесніковая» вёска ў краіне: тут ажно чатыры (!) лясніцтвы. Прадстаўнікі гэтых устаноў лясной гаспадаркі, суседніх лясніцтваў і яшчэ добры

дзясятак камандаў Полаччыны ўжо ў восем гадзін раніцы пачалі ціхае, але надзвычай хуткае паляванне, каб за тры гадзіны сабраць па... 50 і болей кілаграмаў баравікоў, падасінавікаў і іншых відаў ядомых грыбоў.

— Наш край надзвычай грыбны, і адной гэтай падставы дастаткова для правядзення незвычайнага чэмпіянату,— кажа старшыня Маласітнянскага сельсавета Полацкага раёна Ірына Бандарэнка. — Але сёлета, як ніколі, надзвычай баравічны год. А яшчэ мы ладзім гэтае свята ў рамках праекта «Дрэтунь — турыстычная вёска».

Грыбное багацце перашкаджала вызначыць адзінага пераможцу, бо вялікія вёдры збіральнікаў былі поўнымі. Але ўсё ж самай спрытнай у спаборніцтве стала каманда Баравухскага сельсавета, якая прынесла з лесу ажно 120 (!) кіло грыбоў. Усяго ж, па прыблізных падліках, дрэтуньскі лес толькі ўдзельнікам чэмпіянату «ахвяраваў» амаль паўтары тоны грыбоў.

Пакуль у вёсцы лесаводаў падлічвалі сабраны ўраджай, узнагароджвалі ўдзельнікаў, варылі грыбныя клёцкі і спявалі вясёлыя песні, уздоўж шашы ад Полацка да Дрэтуні ўсё прыпаркоўваліся легкавушкі з грыбнікамі. І ніхто з іх не выходзіў з лесу з пустымі кошыкамі. Але ўжо гэты сабраны ўраджай падлічыць нікому не дадзена. Цяпер, калі я чытаю надпісы на аншлагах кшталту «Лес — наша багацце», разумею, што маецца на ўвазе.

На фотаздымках: імгненні грыбнога свята ў Дрэтуні.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

Марак СІКОРА: «Я ЗАДАВОЛЕНЫ ГУЛЬНЁЙ СВАЁЙ КАМАНДЫ»

НА мінулым тыдні хакейны клуб «Дынама-Мінск» здзівіў сваімі нечаканымі поспехамі на старце новага сезона КХЛ. Такіх вынікаў чакалі хіба толькі самыя аптымістычныя аматары хакея. Новае становішча каманды ў турнірнай табліцы — не ў канцы спісу, а ў самым яго пачатку, пад нумарам адзін — прыемна парадавала ўсіх. Дынамаўцы правялі цяжкую серыю выязных матчаў: за тыдзень хакеісты некалькі разоў мянялі гадзінны пояс, і за апошнюю перамогу змагаліся ў далёкім Хабараўску. Цяпер каманду чакаюць хатнія сустрэчы ў «Мінск-Арэне». Сваімі ўражаннямі ад набытых перамог і спадзяваннямі на новыя з карэспандэнтам «Звязды» падзяліўся галоўны трэнер «Дынама» Марак СІКОРА.

Фота Пятра ФАМІНА.

— Пан Сікора, ці чакалі вы на выездзе такога поспеху ад сваёй каманды?

— Спорт — гэта не прамысловасць, у якой можна нешта планаваць. Спачатку хацелася атрымаць дзве перамогі, а атрымалася тры. Гэта цудоўна, таму я задаволены.

— Атрыманыя перамогі — гэта хутчэй шчаслівая выпадковасць ці заканамернасць?

— Ніякіх выпадковасцяў быць не можа, бо мы ігралі сапраўды добра.

— Што адчувае трэнер, калі яго каманда атрымлівае перамогу за перамогай?

— Трэнер шчаслівы, трэнер усміхаецца. Але адначасова я разумею, што такія поспехі не могуць паўтарацца з матча ў матч. І трэнер, і хакеісты павінны быць рэалістамі: крыху радавацца, крыху сумаваць. Усяго ў меру.

— Ці можаце вы сказаць, што знайшлі патрэбны падыход да хакеістаў?

— Я думаю, што так. Апошнім часам у мяне няма праблем, асабліва з тымі, хто размаўляе па-руску. І хакеісты таксама ўжо зразумелі, які я чалавек. Я не пытаюся ў іх, задаволены яны мной ці не — мяне гэта не цікавіць. Я на іх гляджу як на каманду прафесіяналаў, у якіх са мной адна мэта.

— «Дынама» сапраўды выглядала ўпэўнена на лёдзе. Ці ўсё атрымалася з вашага пункту гледжання? Над чым яшчэ трэба працаваць?

— Працаваць яшчэ трэба вельмі шмат. Напрыклад, мы апошнія ў рэалізацыі большасці на пляцоўцы. Зразумела, гэта вельмі дрэнны паказчык. Трэба хутчэй рэагаваць на сітуацыю, больш кідаць па варотах. Многія каманды забіваюць менавіта ў большасці. Але мы над гэтым працуем, у нас ёсць вялікі рэзерв.

— Ці можаце вы адзначыць гульню якіх-небудзь асобных хакеістаў?

— Выбачайце, але я гэтага не зраблю. Мы робім свае вынікі ўсёй камандай, а не асобнымі хакеістамі. Ды і не хацелася б абмяркоўваць іх на старонках СМІ.

— Калі пасля такога паспяховага старту патрабаванні да каманды павысяцца, як вы адрэагуеце?

— Вядома, ад гэтага павялічваецца адказнасць і мая, і хакеістаў. Гэта нармальна. Я разумею, што ўсе хочуць толькі перамогі.

— Наступная сустрэча вашай каманды з чэмпіёнам мінулага сезона «Ак Барсам». Які настрой на гэты матч?

— Лепш за ўсё пасля серыі перамог сустракацца менавіта з моцнай камандай, таму што пераможны настрой ужо створаны. Мне не трэба неяк дадаткова рыхтаваць хакеістаў — яны і самі цудоўна разумеюць, што значыць матч з «Ак Барсам». Я наадварот больш асцерагаюся гульняў з тымі камандамі, над якімі ўсе чакаюць перамогі. Гэта расслабляе.

— Які хакей чакаеце ўбачыць сёння?

— Мая філасофія вельмі простая: калі хочаш выніку, трэба добра дзейнічаць у абароне. Супраць «Ак Барса» тое ж самае. Гэта датычыцца не толькі нашай зоны — усе павінны ведаць, дзе і як лепш сыграць. І, вядома, контратака. Мы будзем спрабаваць зноў развіваць гульню па гэтай схеме.

Аляксандра ПАРАХНЯ.

Спорт-тайм

ВІКТОРЫЯ ПАЎЛОВІЧ — ЧЭМПІЁНКА ЕЎРОПЫ!

Беларуска Вікторыя Паўловіч выйграла золата асабістага турніру на чэмпіянаце Еўропы па настольным тэнісе. Ён завяршыўся ў выхадныя ў чэшскім Остраве. У фінальным паядынку Вікторыя ўзяла верх над Лю Цзя з Аўстрыі — 4:3. У мужчынскім адзіночным разрадзе лідар беларускай зборнай Уладзімір Самсонаў выбыў на стадыі чвэрцьфіналу і застаўся без узнагарод. Нагадаем, што раней у камандным турніры мужчынская зборная Беларусі стала сярэбраным прызёрам, саступіўшы золата камандзе Германіі, а жаночая дружына нашай краіны стала ўладальнікам бронзы кантынентальнага першынства.

У НОВІКАВАЙ — СЕРАБРО

Фота БЕЛТА.

Наша цяжкаатлетка Анастасія Новікава заваявала серабро ў суме дваяборʼя на чэмпіянаце свету па цяжкай атлетыцы, які праходзіць у Турцыі. Яна заняла другое месца ў вагавай катэгорыі да 58 кг. Па суме двух практыкаванняў Анастасія паказала вынік 233 кг (рывок — 103 кг, штуршок — 130 кг). Чэмпіёнкай свету стала кітаянка Дэн Вэй — 237 кг (102+135).

БЕЛАРУСЫ ПРАЙГРАЛІ СЛАВАКАМ У КУБКУ ДЭВІСА

Беларускія тэнісісты выбылі ў другую групу Еўра-Афрыканскай зоны Кубка Дэвіса. Яны прайгралі вырашальны матч славакам з лікам 1:4.

Нагадаем, што 17 верасня Уладзімір Ігнацік выйграў у другой ракеткі гасцей Марціна Кліжана — 7:6, 6:2, 6:2, а другі нумар беларусаў Сяргей Бетаў саступіў лідару славакаў Лукашу Лацко. На наступны дзень у парнай сустрэчы Максім Мірны і Уладзімір Ігнацік прайгралі Міхалу Мерцінаку і Філіпу Палашаку — 6:7, 6:3, 6:4, 4:6. У нядзелю Уладзімір Ігнацік прайграў Лукашу Лацко — 1:6, 6:3, 1:6, 7:6, 4:6. У пятым паядынку, які ўжо не меў турнірнага значэння, наш другі нумар Сяргей Бетаў прайграў другому нумару славакаў Марціну Кліжану — 6:7, 2:6.

«ПАРТЫЗАН» НЕ ЗДАЎСЯ БАТЭ

У матчах 25 тура чэмпіянату краіны па футболе адбыліся дзве нечаканасці: мінскае «Дынама» было разгромлена «Шахцёрам», а БАТЭ ўнічыю згуляў з «Партызанам». Сталічнае «Дынама» саступіла прамому канкурэнту ў медальнай барацьбе салігорскаму «Шахцёру» — 3:0. Лідар чэмпіянату барысаўскі БАТЭ таксама страціў ачкі ў барацьбе з аўтсайдарам «Партызанам» — 1:1. «Мінск» перайграў «Нёман» 2:0 і наблізіўся ў турнірнай табліцы да барысаўчан. Абласное дэрбі паміж «Дняпром» і «Белшынай» скончылася мірна — 1:1. «Нафтан» перайграў брэсцкае «Дынама» 1:0.

Турнірнае становішча: БАТЭ — 55 ачкоў (24 гульні), «Мінск» — 51 (25), «Шахцёр» — 48 (25), «Дынама» (Мінск) — 43 (24), «Белшына» — 37 (25), «Нафтан» — 33 (25), «Днепр» — 32 (25), «Дынама» (Брэст) — 32 (25), «Віцебск» — 22 (25), «Тарпеда» — 20 (25), «Нёман» — 18 (25), «Партызан» — 15 (25).

ГУРЭНКА ДЫСКВАЛІФІКАВАНЫ

Пасяджэнне дысцыплінарнага камітэта Беларускай федэрацыі футбола, разгледзеўшы інцыдэнты, якія адбыліся падчас матчаў 24-га тура вышэйшай лігі чэмпіянату краіны, вынесла некалькі суровых рашэнняў. Жодзінскае «Тарпеда», якое змагаецца за захаванне прапіскі ў элітным дывізіёне, чатыры бліжэйшыя матчы правядзе без свайго галоўнага трэнера Сяргея Гурэнкі, які, акрамя таго, аштрафаваны на 50 базавых велічынь. Такі кошт нястрыманасці трэнера, які 12 верасня пасля хатняга паядынку, прайгранага салігорскаму «Шахцёру» (0:1), накінуўся на мінскага рэферы Нікіту Пырэева, які не прызначыў у вароты салігорцаў пенальці. Пасля матчу Гурэнка і яго асістэнт зневажалі судзейскую брыгаду, а ў падтрыбунным памяшканні галоўны трэнер тарпедаўцаў пагражаў і фізічнай расправай. А на дэсерт трэнер жорстка раскрытыкаваў арбітраў на пасляматчавай прэс-канферэнцыі.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРИСПОЛКОМ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В г. МОГИЛЕВЕ

Аукцион состоится 26 октября 2010 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

№№ лота	Адрес земельного участка	Площадь, га	Срок аренды	Цель использования, условия продажи	Кадастровый номер	Стоимость землеустроительного дела (руб.)	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
№ 1	Улица Королева, остановка «Завод «Электродвигатель» (в центр)	0,0014	1 год	Установка и обслуживание торгового киоска в остановочном павильоне	740100000004003262	1 162 436	158 000	14 000
№ 2	Улица Крупской, остановка «Средняя школа № 15» (в центр)	0,0020	до 1.06.2011	Установка и обслуживание торгового киоска (№ 1) в остановочном павильоне	740100000002005514	1 128 006	95 000	9 000
№ 3	Переулок 4-й Мечникова район жилого дома № 3	0,0030	1 год	Установка и обслуживание торгового павильона по продаже непродовольственных товаров	740100000002005512	1 126 836	190 000	17 000
№ 4	Бульвар Непокоренных район жилого дома № 19	0,0015	1 год	Установка и обслуживание торгового павильона по продаже продовольственных товаров	740100000005004452	1 126 436	163 000	15 000

Принимать участие в аукционе могут юридические лица, индивидуальные предприниматели и граждане.

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон желающие принять участие в аукционе представляют:

Заверенную копию платежного поручения **о внесении задатка** на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета № 3642017441709 в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 (разовый платеж).

Юридические лица: доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица; документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

Индивидуальные предприниматели: копию свидетельства о государственной регистрации; копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность.

Граждане – копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность.

Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении **нескольких предметов** аукциона, вносят **задаток** в размере, установленном для предмета аукциона **с наибольшей начальной ценой**.

1) Условия инженерного развития инфраструктуры: земельные участки расположены на застроенной территории, в непосредственной близости имеются инженерные коммуникации.

2) Условие проведения аукциона – наличие не менее двух участников.

3) Условие предоставления земельных участков в аренду: согласование типа киоска, павильона с управлением архитектуры и градостроительства Могилевского горисполкома.

4) Порядок осмотра на местности земельных участков: выезд по желанию, предварительное ознакомление с земельно-кадастровой документацией всем желающим.

5) В течение **10 рабочих дней** со дня принятия решения о предоставлении в аренду земельных участков победителям аукциона **оплатить стоимость предмета аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона**, в том числе **расходы**, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решениях об изъятии земельных участков для проведения аукциона. Ориентировочная сумма затрат на организацию и проведение аукциона (на всех победителей) составляет 7 миллионов рублей.

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: **г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206** в рабочие дни с 8.00 до 17.00. **Последний день приема заявлений – 20.10.2010 года до 17.00**.

Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63.

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ В г. МОГИЛЕВЕ

Аукцион состоится 4 октября 2010 года в 16.30 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: **г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206** в рабочие дни **с 08.00 до 17.00**. Последний день приема заявлений **– 28.09.2010** года до 17.00.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов. Условие проведения аукциона – **наличие не менее двух участников**.

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон желающие принять участие в аукционе представляют в сроки, указанные в извещении:

а) квитанцию о **внесении задатка** на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета **№ 3642017441709** в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 **(разовый платеж)**;

б) документ, удостоверяющий личность **(паспорт)** покупателя, а в случае участия в аукционе его представителя – **паспорт и нотариально заверенную доверенность**.

Порядок осмотра на местности земельных участков: выезд по желанию, предварительное ознакомление с земельно-кадастровой документацией всем желающим. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: строительство инженерных коммуникаций будет осуществлено в соответствии с ПСД за счет бюджета города. Продажа земельных участков производится без изменения их целевого назначения. Граждане, желающие участвовать в аукционе по нескольким лотам, вносят **задаток** в размере, установленном для земельного участка с наибольшей начальной ценой.

Победители аукциона обязаны: в течение десяти рабочих дней после принятия решения о предоставлении земельного участка в частную собственность **внести плату за земельный участок** (задаток засчитывается при внесении платы); возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе **расходы**, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения. Ориентировочная сумма затрат на организацию и проведение аукциона (на всех победителей) составляет 4 миллиона рублей.

№№ Лота	Адрес земельного участка	Площадь, га	Кадастровый номер	Стоимость землеустроительного дела (руб.)	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
Лот № 1	переулок 1-й Ровчакова, 1	0,0921	740100000001004766	448 544	17 180 000	1 546 000
Лот № 2	переулок 1-й Ровчакова, 5	0,0938	740100000001004768	448 544	17 497 000	1 575 000
Лот № 3	переулок 1-й Ровчакова, 7	0,0942	740100000001004769	448 544	17 572 000	1 581 000
Лот № 4	переулок 1-й Ровчакова, 9	0,0946	740100000001004770	453 364	17 647 000	1 588 000
Лот № 5	переулок 1-й Ровчакова, 11	0,0973	740100000001004771	448 544	18 150 000	1 634 000
Лот № 6	переулок 2-й Ровчакова, 2	0,0990	740100000001004774	448 544	17 937 000	1 614 000
Лот № 7	переулок 2-й Ровчакова, 4	0,0986	740100000001004776	448 544	17 865 000	1 608 000
Лот № 8	переулок 2-й Ровчакова, 10	0,1074	740100000001004781	448 544	19 459 000	1 751 000
Лот № 9	переулок 3-й Ровчакова, 4	0,0998	740100000001004783	448 544	18 082 000	1 627 000
Лот № 10	переулок 3-й Ровчакова, 6	0,0972	740100000001004784	461 519	17 611 000	1 585 000
Лот № 11	переулок 1-й Сараканайский, 7	0,0932	740100000001004765	448 544	16 886 000	1 520 000

Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В г. ОРШЕ

№ п/п	Месторасположение и площадь земельного участка	Начальная цена продажи (руб.)	Условия заключения договора аренды	Инженерное обеспечение участка	Сумма задатка (руб.)
1.	Земельный участок по ул. Красноармейской в г. Орше площадью 0,0020 га. Кадастровый номер 242400000004002564	114 436	Срок договора – 5 лет. Целевое использование – под торговый киоск. Получение разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработка архитектурно-строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий два года. Начало строительства объекта в течение 6 месяцев со дня утверждения архитектурно-строительного проекта и осуществление строительства в сроки, определенные проектно-сметной документацией.	В квартале застройки по ул. Красноармейской, где находится земельный участок, имеются сети водоснабжения, канализации, электрической и телефонной связи, с возможностью подключения к ним предполагаемого объекта. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: централизованное газоснабжение – отсутствует, централизованное теплоснабжение – отсутствует, электроснабжение – имеется, наличие асфальтированного подъезда – имеется, центральное водоснабжение – имеется, доступность автодорог (менее 500 м по прямой) международного и республиканского значения – имеется.	11 440
2.	Земельный участок по ул. Советской в г. Орше площадью 0,0013 га. Кадастровый номер 242400000001000878	69 677	Срок договора – 5 лет. Целевое использование – под торговый киоск. Получение разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработка архитектурно-строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий два года. Начало строительства объекта в течение 6 месяцев со дня утверждения архитектурно-строительного проекта и осуществление строительства в сроки, определенные проектно-сметной документацией.	В квартале застройки по ул. Советской, где находится земельный участок, имеются сети водоснабжения, канализации, электрической и телефонной связи, с возможностью подключения к ним предполагаемого объекта. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: централизованное газоснабжение – имеется, централизованное теплоснабжение – имеется, электроснабжение – имеется, наличие асфальтированного подъезда – имеется, центральное водоснабжение – имеется, доступность автодорог (менее 500 м по прямой) международного и республиканского значения – имеется.	6 960

1. Аукцион состоится в **11.00 26 октября 2010 г.** в г. Орше в здании Оршанского горисполкома по ул. Островского, 2.

2. Для участия в аукционе необходимо подать заявление. К заявлению прилагаются заверенная банком копия платежного поручения о внесении задатка в размере 10 % от начальной цены объекта, а также:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица – доверенность, выданная юридическим лицом или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица– легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

3. Победитель аукциона обязан:

- подписать протокол аукциона в день его проведения;

- внести плату за право заключения договора аренды земельного участка;

- возместить расходы, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка**,** в течение 10-ти рабочих дней со дня принятия решения горисполкома о предоставлении земельного участка победителю аукциона;

- заключить с Оршанским горисполкомом договор аренды земельного участка;

- в двухмесячный срок со дня заключения договора аренды земельного участка осуществить государственную регистрацию земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него.

4. Задаток вносится на расчетный счет Оршанского горисполкома № 3642304000494 в АСБ «Беларусбанк», МФО 150801647, УНП 300053911.

5. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Орша, ул. Островского, 2, кабинет 18, сектор по управлению госимуществом и приватизации управления экономики Оршанского горисполкома с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 **по 22 октября 2010 года** включительно.

Контактные телефоны в г. Орше: (8 0216) 21 13 14, 21 12 42. Предварительное ознакомление с объектами торгов – контактный телефон в г. Орше: 24 40 32.

Ведай нашых!

З ЛЮБОЎЮ ДА АБРАНАЙ СПРАВЫ

Як ужо паведамлялася («Звязда» 18.09.10), з 15 па 17 верасня на базе адпачынку «Дружба» адбыўся конкурс прафесійнага майстэрства начальнікаў гарадскіх і сельскіх аддзяленняў сувязі, які, несумненна, запомніўся многім. Некаму — бліскучай перамогай, некаму — крыўдным паражэннем. Журы (як прызналася яго старшыня Ірына Ігнацьеўна Саксонава) ...шокам, які давялося перажыць, калі падлічвалі сумы балаў, набраныя кожным з канкурсантаў і кожнай з камандаў.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Пераможцы конкурсу прафесійнага майстэрства Алена АНІШЧАНКА (начальнік АПС Чырвоны Бераг-1, што на Жлобіншчыне, і Таццяна СУХАДОЛЬСКАЯ (начальнік АПС-74 г. Мінск).

Зрэшты, калі па парадку, то гэты, чатырнаццаты конкурс, без перабольшання, майстроў сваёй справы, пачаўся, як і папярэднія — з вітальных слоў (у тым ліку генеральнага дырэктара РУП «Белпошта» Юрыя Аляксандравіча Комара), з прадстаўлення камандаў. Усе яны былі з выдумкай, з вершамі, з танцамі, да таго ж адно (што варта падкрэсліць) — каманды сталіцы — гучала па-беларуску.

Досыць складаным сёлета ўяўлялася хатняе заданне: паштавікі кожнай з абласцей і горада Мінска павінны былі расказаць пра год якасці на сваім прадпрыемстве. Згадзіцеся, было ад чаго разгубіцца і дзе разгарнуцца, паказаць свае высокія прафесійныя і тэхнічныя магчымасці, акцёрскія здольнасці, гумар...

Карацей — цяжка давялося журы, якому трэба было не проста ўсё гэта бачыць, а яшчэ і ацэньваць, вызначаць, якая з камандаў лепшая: мацнейшымі выглядалі ўсе.

З «экзаменамі» па тэорыі, з выкананнем практычных заданняў было, відавочна, прасцей, бо бліскучыя веды можна адрозніць ад проста выдатных, як і ўзорную працу ад бездакорнай.

— Конкурсы прафесійнага майстэрства на нашым прадпрыемстве ладзяцца штогод, — патлумачыла потым старшыня журы, намеснік генеральнага дырэктара РУП «Белпошта» Ірына Ігнацьеўна Саксонава. — Але падводзячы вынікі сёлетняга, чатырнаццатага, мы ўпершыню сутыкнуліся з тым, што амаль усе ўзнагароды давядзецца аддаць камандзе аднаго, Гомельскага філіяла. Алена Анішчанка, начальнік аддзялення паштовай сувязі (АПС) Чырвоны Бераг-1, што на Жлобіншчыне, стала лепшым і тэарэтыкам, і практыкам. У выніку за ёй першае месца сярод начальнікаў сельскіх (АПС). Другое і трэцяе месца ў яе сябровак па камандзе Марыны Шыдлоўскай з АПС Ціхінічы, што на Рагачоўшчыне, і Алы Пырх з АПС Левашы Рэчыцкага раённага вузла паштовай сувязі. З гэтай жа каманды і Марына Шарай — начальнік АПС-5 г. Калінкавічы, якая паказала бліскучае веданне тэорыі і заняла другое месца сярод начальнікаў гарадскіх паштовых аддзяленняў. Згадзіцеся: журы было ад чаго разгубіцца?!

І не толькі ў гэтым выпадку. У лідары сярод каманд, безумоўна, выйшлі паштавікі Гомельшчыны. Але, скажам так, не... адны. На гэты раз вельмі добра паказала сябе каманда вытворчасці «Мінская пошта». Таму першынство рашылі падзяліць.

Рашыць — лягчэй, а як узнагароджваць, калі кубак прызавы толькі адзін?

Пасля таго як ён быў уручаны капітану каманды гамяльчан (мінчанам паабяцалі аддаць на святочнай вечарыне ў гонар Сусветнага дня пошты), не маглі не спытаць у капітана каманды, намесніка дырэктара Гомельскага філіяла РУП «Белпошта» Марыны Перагуды, як жа ім так пашанцавала?

— Не, не пашанцавала... Гэта іншае, — сказала Марына Антонаўна. — У нас ніколі не было такой моцнай каманды, як сёлета. І вынік — зусім не штудзіраванне, не падрыхтоўка цягам нейкага там апошняга тыдня ці месяца. Гэта — штодзённая праца нашых дзяўчат.

Адна з іх — самая, можна сказаць, тытулаваная — Алена Анішчанка, начальнік аддзялення сувязі Чырвоны Бераг-1. У прафесіі 14 гадоў. Закончыла вучылішча сувязі ў Гомелі, завочна — Віцебскі каледж, працавала паштальёнам, потым аператарам, цяпер — начальнікам.

— Калектыў у нас вельмі добры, малады: чатыры паштальёны, адзін аператар. А я, дарэчы, ужо трэці раз прымаю ўдзел у рэспубліканскім конкурсе... Аднак перамога ўсё роўна была нечаканай!

— Столькі адрэналіну за гэтыя тры дні, столькі эмоцый — не перадаць! — гаварыла і яе паплечніца па п'едэстале — начальнік АПС 74 Мінска Таццяна Сухадольская (першае месца сярод начальнікаў гарадскіх аддзяленняў сувязі)... Я вельмі люблю сваю працу!.. Што ў ёй самае цікавае? Стасункі з людзьмі. Вельмі люблю назіраць за імі, адкрываць нешта новае. Сядзець у кабінеце з паперкамі — гэта не маё. Я пастаянна ў зале — з людзьмі.

І ў адной, і ў другой пераможцы — добрыя сем'і, вырашаныя праблемы з жыллём, таму новыя халадзільнікі ў якасці прызоў вядома ж не пашкодзяць.

Што да іншых узнагародаў, то імі адзначаны вельмі многія: Вольга Шавярэнка (вытворчасць «Мінская пошта»), як лепшы майстар-практык сярод начальнікаў гарадскіх АПС; Тэрэса Васільчык, начальнік АПС Гудагай Астравецкага РВПС за вернасць прафесіі (26 гадоў як ніяк!); Галіна Марчанка — лепшы майстар-практык, намеснік дырэктара Магілёўскага філіяла; Святлана Карнілава і Тамара Цвілевіч — лепшыя паштаведы, начальнікі аддзелаў эксплуатацыі і бяспекі паштовай сувязі адпаведна Мінскага і Віцебскага філіялаў, каманды Мінскага і Гродзенскага філіялаў за творчы, крэатыўны падыход пры падрыхтоўцы хатняга задання, Мінскі — за лепшы дызайн фірменнага касцюма (і ён жа — за перамогу ў конкурсе «Паштовая эстафета»)... Лепшым знаўцам прафсаюзнага руху прызнана Святлана Раманоўская, старшыня пярвічнай арганізацыі прафсаюза вытворчасці «Мінская пошта» і галаўнога прадпрыемства РУП «Белпошта»...

Граматамі за волю да перамогі ўзнагароджаная каманда Брэсцкага філіяла (другое месца). На трэцім — Магілёўскі філіял.

Кожны ўдзельнік конкурсу атрымаў да таго ж кветкі і памятныя падарункі ад аб'яднага прафкама прадпрыемства — за ўдзел, за любоў да абранай прафесіі.

Уручала свае сціплыя прызы і газета «Звязда»: прас адзінаму сярод канкурсантаў мужчыну Аляксандру Трацяку (начальнік АПС -9 г. Слонім), фірменныя чырвоныя кепачкі — сваёй падпісчыцы Таццяне Сухадольскай, Ліліі Матвіец і Вользе Шавярэнцы (вытворчасць «Мінская пошта») за беларускамоўную візітоўку, фірменныя майкі камандзе Віцебскага і Гродзенскага філіялаў, якія на гэты раз, на жаль, у пераможцы не выйшлі... А яшчэ — нашы звяздоўскія календары (у тым ліку на 2011 год) з просьбай перадаць іх усім, хто выпісвае «Звязду» на іх поштах. Разам з нашай удзячнасцю.

— На такіх вось конкурсах, — прызнала старшыня журы Ірына Саксонава, — як нідзе, відавочны рост прафесіяналізму нашых кадраў. Начальнікі аддзялненняў паштовай сувязі, паштальёны, аператары паказваюць усё лепшыя вынікі. І гэта сведчанне таго, што пошта развіваецца, што ў нас ёсць рэзервы. Бо, нягледзячы на значнае развіццё інфармацыйных тэхналогій, рашаючым звяном былі і застаюцца людзі, якія непасрэдна кантактуюць з кліентамі, павышаюць імідж прадпрыемства сваімі ведамі, майстэрствам, узроўнем адукацыі.

Яна, гэта адукацыя, яшчэ пару гадоў таму была, як правіла, сярэдняя альбо прафесійна-тэхнічнай. Цяпер — пераважна сярэдняя спецыяльнай, а то і вышэйшай. Што заканамерна на прадпрыемстве, якое аказвае сваім кліентам каля 50 відаў паслуг...

Дарэчы, у адным з хатніх заданняў быў цікавы рэкламны «ролік». Хлопчык (відаць, вялікі аматар камп'ютарных гульняў) тэлефануе дзяўчынцы. Кажа, прыходзь — пагуляем. Перашкаджаць, маўляў, ніхто не будзе — бабуля на пошту пайшла. Пакуль там пенсію атрымае, нешта купіць, падпіску аформіць... Гэта надоўга.

— Дзіўна, — адказала дзяўчынка, — мая бабуля ўсё гэта робіць не выходзячы з хаты. Паштальён да яе сам прыязджае.

На што хлопчык зазначыў:

— Добра, што мая бабуля пра гэта не ведае.

То на ўсялякі выпадак паведамляем.

Валянціна ДОЎНАР.

КАНТАКТ
№ 1 (1)
СПЕЦПРАЕКТ «ЗВЯЗДЫ» СУМЕСНА З «БЕЛСАЮЗДРУКАМ», «БЕЛПОШТАЙ»

Васіль МАРЭЙКА:

«Газета павінна быць каралевай продажу»

Дырэктар «Брэстаблсаюздрука» Васіль МАРЭЙКА любіць паўтараць, што спачатку было слова. А ўжо потым спатрэбіліся тыя, хто мог гэтае слова прафесійна прадаць. Але гэта з гісторыі друку наогул. А мы гутарым з Васілём Мікалаевічам пра сучасны дзень прадпрыемства «Брэстаблсаюздрук».

— Васіль Мікалаевіч, калі звярнуцца да гісторыі, але больш позняй, чым стварэнне сістэмы «Саюздрука», што бачыцца найбольш важным на шляху да поспеху вашага прадпрыемства?

— Першая палова 90-х гадоў згадваецца як час разрухі і неймаверных цяжкасцяў. Была магутная даходная структура, і раптам стала стратнай. Давялося, што называецца, уздымаць з руін прадпрыемства. Спачатку быў перыяд нейкай разгубленасці. Потым агледзеліся, звярнулі ўвагу на тое, як хто зарабляе грошы. І паспрабавалі самі. Першыя грошы атрымалі ад продажу ў Расію збожжа, мясных вырабаў, спірту. Было і такое.

Зараз гадавы абарот «Брэстаблсаюздрука» павялічыўся ў параўнанні з сярэдзінай 90-х гадоў прыкладна ў 40 разоў. На шчасце, пра гандаль спіртам ці збожжам даўно забыліся. Цяпер 43 працэнты продажу складаюць перыядычныя выданні, 57 працэнтаў — іншыя тавары.

Прадпрыемства мае трывалую гаспадарку. Так, у 2004 годзе на набыццё новых кіёскаў, аўтатранспарту былі патрачаны 72 мільёны рублёў, праз тры гады — ужо 412 мільёнаў, далей — болей. Летась на развіццё выдаткавалі 832 мільёны рублёў. Сёння абласны «Саюздрук» мае 166 кіёскаў у вобласці, у тым ліку 5 спецыялізаваных магазінаў.

— Лічыцца, што перыядычныя выданні апошнім часам чытаюць меней...

— Гэта памылковае меркаванне. Гадоў 15 таму мы прадавалі прыкладна два мільёны выданняў у год. Зараз прадаём каля 12 мільёнаў. Агульная лічба вырасла прыкладна ў шэсць разоў. Проста памяняліся змест і афармленне газет, а таксама густы пакупніка. Даводзіцца канстатаваць, што продаж грамадска-палітычных газет крыху зніжаецца, а вось папулярнасць забаўляльнай прэсы расце. Болей сталі чытаць і глянцавыя часопісы. Вельмі змяніліся і самі газеты. Яны зрабіліся больш прывабнымі і маляўнічымі, больш дэмакратычнымі па змесце, меншымі па аб'ёме сталі інфармацыйныя нататкі, са старонак амаль знік чалавек працы...

— І вось гэтыя новыя газеты вы паспрабавалі прадаваць па-новаму. Кажуць, да вас ужо ездзяць з усёй краіны вопыт пераймаць.

— Здараецца, прыязджаюць, і не толькі з краіны. Бо аказалася, на ўсёй постсавецкай прасторы няма такой сістэмы гандлю перыёдыкай, якую мы распрацавалі і ўкаранілі ў сябе. Умоўна яе можна назваць «Газета без бар'еру». У кіёсках мы памянялі гандлёвыя залы, зрабілі ўвесь тавар даступным для пакупніка. Цяпер наведнік заходзіць у кіёск зранку і не называе толькі патрэбную газету, як было раней, а сам разглядае і выбірае перыёдыку. Я і мае аднадумцы, а гэта практычна ўвесь наш калектыў, перакананыя, што газета, часопіс павінны стаць бліжэй да пакупніка ў прамым сэнсе. Газета мусіць сама сябе рэкламаваць, быць каралевай продажу ў кіёску ці краме. І чалавек, зірнуўшы на загалоўкі, ілюстрацыі, у рэшце рэшт прагаласуе за тую ці іншую газету сваім рублём.

— У нашым мікрараёне «Кавалёва» за апошні час з'явіліся тры кіёскі, так бы мовіць, новага фармату. Не раз, стоячы на прыпынку ў чаканні транспарту, баўлю час за разглядваннем перыёдыкі. Бывае, нешта набываю...

— На тое мы і разлічвалі. Гандлёвыя залы абсталёўваюцца такім чынам, каб шлях пакупніка да касы праходзіў уздоўж стэлажоў. Чалавек пагартае выданне, што кінулася ў вока, і можа зрабіць незапланаваную пакупку. Першай крамай, дзе мы змянялі арганізацыю гандлёвай залы, была «Прэса» па вуліцы Пушкінскай. Продаж газет і часопісаў павялічыўся там прыкладна ў восем разоў. Адчуваеце розніцу? Наступнай крамай, дзе сучасныя тэхналогіі новых продажаў удасканалілі і развілі, стала крама «Сябрына». Тады пайшлі далей, і памянялі кіёскі ў цэнтры горада, а цяпер актыўна вядзём гэтую работу ў мікрараёнах.

— Але ж кіёскі сталі значна большыя па памерах. Патрабуюцца большыя выдаткі на іх утрыманне?

— Новыя кіёскі — наша ўласная распрацоўка. Таму сістэму энергазберажэння мы прадумалі адразу. Асноўная гандлёвая зала не ацяпляецца. Газеты ж з часопісамі не замерзнуць. Ацяпляецца толькі месца для кіяскёра. А яно яшчэ меншае, чым у павільёне старога ўзору. Так што не прагадалі.

— Над чым працуе прадпрыемства зараз, якіх навінак чакаць у абслугоўванні?

— У абласным цэнтры, лічу, мы прыстойна абслугоўваем свайго кліента. А вось у раёнах трэба многае ўдасканаліць. Найперш мы рэарганізавалі кіраваннем сістэмай. Зараз кіраванне прадпрыемствам ажыццяўляецца галаўной арганізацыяй. У выніку толькі папяровы зварот паміж падраздзяленнямі скараціўся на чатыры тоны паперы ў год. Напалову меней стала бухгалтараў, значна паменшыўся кошт банкаўскага абслугоўвання. Ну і галоўны наш клопат — аптымізацыя пастаўкі друкаванай прадукцыі ў самыя аддаленыя гарады. Я часта кажу падначаленым, што газета, асабліва штодзённая, павінна прадавацца толькі раніцай. У поўдзень яна актуальная, але нясвежая, а вечарам яна — амаль макулатура.

— А якія газеты зранку на рабочым стале дырэктара «Брэстаблсаюздрука»?

— Найперш мясцовыя, брэсцкія, у дні, калі яны выходзяць. Ну і кожны дзень — «Звязда», бо гэта мая газета, я працаваў у ёй уласным карэспандэнтам. Затым — астатнія рэспубліканскія.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

«БЕЛСАЮЗДРУК»: там, дзе прадаюць газеты

Вось ужо 92 гады прайшло з моманту, калі ў Беларусі быў прыняты Дэкрэт, які фактычна паклаў пачатак рознічнаму продажу газет, часопісаў і кніг. З гэтага часу змянілася шмат чаго: людзі асвоілі космас, з'явіліся мабільныя тэлефоны, камп'ютары, інтэрнэт, але газета — крыніца навін і думак — сваю функцыю захавала.

РУП «Белсаюздрук» займае вядучыя пазіцыі па распаўсюджванні перыёдыкі ў Беларусі. Сёння мы размаўляем з **намеснікам дырэктара РУП «Белсаюздрук» Соф'яй ЦЯРЭШКАЙ**. Пра тое, газеты якой тэматыкі карыстаюцца ў пакупнікоў найбольшым попытам, чаму некаторыя газеты ў шапіках можна купіць толькі пасля 12.00 і чаму ў беларускай сталіцы няма ніводнага мужчыны-кіяскёра, Соф'я Цярэшка расказала нашаму карэспандэнту.

— Соф'я Мікалаеўна, «Белсаюздрук» на сёння пазнавальны брэнд. Якая ў яго гісторыя?

— З 1948 года ў Беларусі пачало існаваць самастойна Мінскае гарадское агенцтва «Саюздрук», якое да гэтага дзейнічала на базе гарадскога аддзела Беларускага дзяржаўнага выдавецтва. У 2000 годзе МГП «Саюздрук» было перайменавана ў Гандлёвае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Мінгарсаюздрук». А праз шэсць гадоў адбылася рэарганізацыя гэтай сістэмы, у выніку якой гарадскія і абласныя прадпрыемствы набылі большую эканамічную самастойнасць. На сёння РУП «Белсаюздрук» г. Мінска — буйнейшае ў гэтай сістэме.

— Што яно ў сябе ўключае на сёння?

— Наша арганізацыя дзейнічае ў сталіцы. Мінск падзелены на дзевяць участкаў — дзевяць раёнаў, кожны з якіх абслугоўвае свая група кіяскёраў і прадаўцоў. Усяго ў «Белсаюздруку» ў нас працуе 1089 чалавек. У цэлым у горадзе ў нас размешчаны 371 гандлёвы аб'ект. З гэтай колькасці мы маем 344 кіёскі і 27 магазінаў. Калі казаць пра друкаваную прадукцыю, якую мы рэалізоўваем, то яе аб'ём у агульным тавараваросе складае каля 50 працэнтаў.

— З чаго складаецца праца «Белсаюздрука»?

— Праца «Белсаюздрука» арганізавана такім чынам, што кожны аддзел адказвае за пэўны сектар працы. Так, напрыклад, газетна-часопісная экспедыцыя атрымлівае і сартуе перыядычныя выданні, адказвае за пагрузку пошты і яе дастаўку да гандлёвага аб'екта. Гэтая ж служба займаецца і экспедіраваннем перыёдыкі ў абласныя прадпрыемствы «Саюздрука». А, напрыклад, будаўнічая група прадпрыемства рамантуе кіёскі, іх замяняе і вырабляе. Хвароба сённяшняга дня — размяляваныя кіёскі. Не праходзіць і дня, каб які-небудзь гандлёвы аб'ект не размалявалі.

— Распавядзіце, калі ласка, больш падрабязна пра сістэму распаўсюду перыёдыкі.

— Сістэма распаўсюду такая: да нас можа звярнуцца любы выдавец, які мае пасведчанне аб рэгістрацыі, выдадзенае ў Міністэрстве інфармацыі, і хоча распаўсюджваць выданне ў нашай гандлёвай сетцы, і мы заключаем з ім дамову. Пасля ўзгадняюцца ўсе юрыдычныя пытанні.

Але акрамя перыёдыкі мы гандлюем і дадатковымі таварамі. У асноўным гэта канцылярскія тавары, таксама мы аказваем паслугі па рэалізацыі інтэрнэт-карт, латарэйных білетаў, праязных білетаў і талонаў.

— Наколькі мне вядома, дастаўка пошты мае два графікі?

— Так, дастаўка перыёдыкі адбываецца ў дзве пошты. Першая пачынаецца з трох гадзін раніцы — мы павінны развезці пошту на аб'екты да пачатку працоўнага дня. Другая пошта — пасля 12:00. Існуюць газеты, што выходзяць пазней за астатнія, таму і на вітрыну кіёска яны трапляюць не з самага ранку. Іх мы давозім другой поштай. Хацелася б падкрэсліць, што дастаўка газет у продаж залежыць не ад выдання, а ад часу яго выхаду.

— А ці ідуць працаваць у кіёскі мужчыны?

— Не, мужчынаў-кіяскёраў у Мінску няма. На жаль. Прыходзілі маладыя людзі на практыку, але заставацца далей не захацелі. Праца не з лёгкіх. Атрыманне два разы на дзень перыёдыкі, спісанне нерэалізаванай прэсы, а таксама матэрыяльная адказнасць патрабуюць вытрымкі і працавітасці. Таму ніводнага мужчыны-кіяскёра ў нас і няма.

— Мінчане могуць аформіць падпіску ў кіёску. Як функцыянуе гэты механізм?

— Так, адзін з напрамкаў нашай дзейнасці — гэта прыём падпіскі ад насельніцтва па ўласных каталогах і атрыманне падпісчыкамі выданняў праз гандлёвыя аб'екты «Белсаюздрука». Падпіска ўнікальная тым, што газеты прывозяць у кіёск вельмі рана і яны захоўваюцца ў ім да запатрабавання. Аформіць такую падпіску жыхары сталіцы могуць па факсе і тэлефоне. На сёння такой паслугай карыстаецца каля 30 тысяч мінчан.

— Газеты якой тэматыкі беларусы чытаюць найбольш?

— Больш за 85 працэнтаў прэсы, якая рэалізуецца, — гэта рэспубліканскія выданні (шэсць працэнтаў тут займаюць дзяржаўныя газеты і часопісы). Астатняя частка — гэта замежная прэса, у большасці — газетна-часопісная перыёдыка з Расіі. Паводле звестак мінулага года, 45 працэнтаў выданняў, якія ў нас купляюць, прызначаныя для вольнага часу, 37 працэнтаў — выданні грамадска-палітычнай тэматыкі.

— Якія планы ў «Белсаюздрука»?

— У бліжэйшых планах — адкрыццё лагістычнага цэнтра. Сёлета мы ўжо плануем распачаць яго будаўніцтва. Новы цэнтр будзе размяшчацца ў раёне Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Гэта будзе фактычнае злучэнне ў адзін вузел усіх нашых структурных аб'яднанняў, бо на сёння мы размяшчаемся ў памяшканнях, якія арэндуем.

— Дзякуй за размову!

Гутарыў Ілья ЛАПАТО.

УВАГА: ПЕРАВОДЫ ПА НОВЫХ ПРАВІЛАХ

З 23 верасня ў сілу ўваходзіць закон «Аб унясенні зменаў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях прадухілення, легалізацыі даходаў, атрыманых злачынным шляхам, і фінансавання тэрарыстычнай дзейнасці», у сувязі з гэтым пастановай Савета Міністраў унесены некаторыя змяненні ў правіла аказання паслуг паштовай сувязі.

У адпаведнасці з пастановай аператар паштовай сувязі павінен атрымаць і захоўваць інфармацыю аб фізічнай асобе ці арганізацыі, якія здзяйснялі грашовыя пераводы на суму роўную ці большую за 100 базавых велічынь (акрамя разлікаў з выкарыстаннем пластыкавых банкаўскіх картак). Асоба, якая здзяйсняе падобную аперацыю, прадстаўляе наступную інфармацыю: прозвішча, імя і імя па бацьку, нумар рахунку ці нумар фінансавай аперацыі, месца жыхарства, пашпартныя звесткі. Асобам, якія не прад'яўляюць патрэбных дакументаў, аператары паштовай сувязі маюць права адмовіць у абслугоўванні.

ПА ГАЗЕТУ З КУБАЧКАМ КАВЫ

Што ні кажы, а хадзіць па газету становіцца ўсё прыемней. Вы заўважылі, як змяніліся шапкі? За вялікімі шклянымі вітрынамі ўвесь тавар як на далоні. Але мяняюць воблік і крамы.

Напрыклад, зусім нядаўна пасля рамонту адчынілася крама «Белсаюздрука» № 16, што па вуліцы Веры Харужай. Людзі, якія тут даўно не былі, заходзяць, здзіўляюцца. І справа не толькі ў тым, што сучасная крама пашырыла асартымент, стала больш прасторнай. Сюды проста прыемна заходзіць. Калі вас заспеў дождж, яго можна спакойна перачакаць у самой краме, утульна ўладкаваўшыся за столікам... за кубачкам гарбаты. А мо і толькі што набытую «Звязду» пачытаць. Зручна. А як прыемна, разумееш, што ў такой краме пакупніку сапраўды рады. Тым больш што і прадаўцы ветлівыя, не пакінуць без увагі, падкажуць, дапамогуць адшукаць патрэбную інфармацыю.

Для малечы, якая тут бывае даволі часта, нават мульцікі круцяцца. Для юных пакупнікоў свой куток абсталяваны, дзе на продаж выстаўлены дзіцячыя кніжкі, цацкі. Зручна — пакуль дарослыя выбіраюць газетку, штосьці прыгледзець сабе могуць і дзеці.

— Мы стараемся, каб быў добры асартымент. Каб выданні прадаваліся на розны густ, а заадно можна было набыць і патрэбныя рэчы, пачынаючы ад сшыткаў для дзяцей і рэчаў для офіса (канцтавары, папера для ксэракса), да проста сувеніра, падарунка калегу. У нас тут шмат офісаў, і ў абедзенны перапынак людна. Чэргі бываюць і зранку — за свежай прэсай ідуць перад працай, і ў канцы дня — каб было што пачытаць вольным вечарам, — распавядае прадавец Наталля Леглік.

Новы выгляд крамы прыйшоўся даспадобы былым пакупнікам, але сюды пацягнуліся і новыя. Ужо зараз адчуваецца, што продаж паболеў, людзей прыбывае. У краме прасторна, і што зноў жа зручна: любы тавар добра праглядаецца. І газеты, і кнігі не нагрувашчваюцца адна на адну, лёгка знайсці і ўзяць менавіта тое, што патрэбна. А прыходзяць сюды чытачы з самымі рознымі густамі, кагосьці цікавяць спартыўныя навіны, кагось выданні па хобі, ды і агульнапалітычная перыёдыка разыходзіцца добра.

— А можа вы ведаеце нейкі такі сакрэт, якой павінна быць газета, каб яе купілі? — спрабую выведаць у Наталлі Леглік.

— Якой бы ні была інфармацыя, яна павінна быць пададзена так, каб яе было цікава чытаць. Людзей цікавіць рознае. Але, напэўна, рэцэпты, анекдоты, крыжаванкі, абвесткі, дзе што адбываецца, падабаюцца многім. Газета павінна быць рознабаковай, каб хто б яе ні ўзяў, усім было што пачытаць. Яна павінна быць такой, каб яе можна было праглядаць усёй сям'ёй: і дзіцячая старонка знойдзецца, і нешта для моладзі, і для людзей сталага ўзросту. Па газеты на беларускай мове даволі часта прыходзяць школьнікі. Чытаць навіны па-беларуску любіць моладзь, людзі сталага ўзросту. А вось сярэдні ўзрост, відаць, чытае газеты менш з-за таго, што можа выцягваць інфармацыю з інтэрнэту, альбо таму, што яму проста няма калі.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ. Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Вітанка-віншаванка

Гэтая рубрыка — падзяка калегам, родным, людзям, якія гатовыя нас выслухаць, падтрымаць, а мо і прыйсці на дапамогу. Тут можна не толькі віншаваць са святамі паштавікоў і супрацоўнікаў «Белсаюздрука», але і дзякаваць ім за тое, што яны для нас робяць.

* * *

Супрацоўнікі РУП «Белпошта» віншуюць з Днём нараджэння **БАДМАНАВУ Святлану Іванаўну**, кіраўніка аддзялення паштовай сувязі горада Наваполацка № 8. Зычаць ёй творчых поспехаў, кар'ернага росту, здароўя і шанцавання.

* * *

Калегі віншуюць з Днём нараджэння старшыню прафсаюза вытворчасці «Мінская пошта» **РАМАНОЎСКУЮ Святлану Мікалаеўну**. Здароўя, дабрабыту і далейшых дасягненняў (на рэспубліканскім конкурсе прафесійнага майстэрства кіраўнікоў гарадскіх і вясковых аддзяленняў паштовай сувязі камандa «Мінскай пошты» аказалася адной з лепшых)!

Да віншаванняў далучаюцца і супрацоўнікі «Звязды».

«Звязда»

МІНУСЫ...

На маю думку, газеце бракуе глыбокіх, аналітычных матэрыялаў. На розныя тэмы.

Няблага, думаю, было б «зводзіць» на старонках людзей розных поглядаў на тую ці іншую праблему.

Варта (зноў жа, па-мойму) вярнуць рубрыку пра нашы беларускія словы, якую некалі вёў шаноўны спадар Клышка...

Нарэшце, мяне як вельмі даўняга і пастаяннага чытача беларускамоўнай агульнанацыянальнай газеты не задавальняе тое, што рэкламадаўцы парушаюць маё канстытуцыйнае права атрымліваць інфармацыю на беларускай мове. Зразумела, што яны, так бы мовіць, хаваюцца за дзяржаўным двухмоўем, прыкрываюцца ім, аднак наша заканадаўства вымагае ад дзяржаўных устаноў падаваць інфармацыю на той мове, якую выбірае кліент, а не чыноўнік.

Мы, падпісчыкі, чытачы «Звязды», выбралі для сябе права атрымліваць інфармацыю па-беларуску. Рэкламадаўцы павінны ведаць гэта, павінны лічыцца з нашымі запатрабаваннямі. Вазьміце, напрыклад, Швейцарыю. Там чатыры дзяржаўныя мовы. Але пры гэтым ніхто і ніколі ў нямецкую газету Tages Anzeiger Zurich не падасць сваю аб'яву на французскай, а ў французскую La Tribune de Geneve на нямецкай ці італьянскай, як не падасць і ў італьянскую Corriere del Ticino на нямецкай ці французскай... Ці возьмем Бельгію. Наўрад ці фламандскамоўная De Standaard надрукавала б рэкламныя матэрыялы па-французску, як і французскамоўная Le Soir — па-фламандску.

Ды і рэдактары газет паважліва, ашчадна ставяцца да мовы сваіх чытачоў, не парушаюць іх канстытуцыйных правоў. Як не парушаюць пры гэтым і заканадаўства.

Дзмітрый ПАЎЛАВЕЦ, дацэнт Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны.

...І ПЛЮСЫ

Газета «Звязда» з'явілася ў нашай сям'і з лёгкай рукі майго бацькі, якога, на вялікі жаль (і амаль 30 гадоў), на гэтым свеце ўжо няма... Але выпісваю я, прычым пастаянна, з года ў год. І не толькі гэтае выданне: прыходзяць у сям'ю іншыя газеты і часопісы. Таму ёсць магчымасць параўноўваць, ёсць права гаварыць пра адметнасці.

Першая і галоўная — гэта мова, якой я навучылася ад сваёй маці, а яна калісь ад сваёй...

Другая — шчырасць. «Звязда», як ніякае іншае выданне, прыцягвае ёй, заварожвае, дорыць уражанне, што пісалася ўсё не для грамады, не для тысяч чытачоў, а непасрэдна для мяне. Прычым у любым жанры: для мяне навіны, для мяне палемічныя нататкі, разважанні, эканамічныя агляды, парады дактароў, падказкі пра тое, як жаніцца, як хрысціцца, каго і дзе тады пасадзіць...

Для мяне цікавыя і патрэбныя парады з «Хатняй энцыклапедыі», для мяне «Казкі для дарослых» і звяздоўскія конкурсы — на лепшае апавяданне і на лепшы подпіс да здымка.

Сочачы за імі, не стамляюся дзівіцца таму, наколькі ж разумны і таленавіты ў нас народ! Можа ж убачыць нешта нябачнае, а потым «раскруціць» ды яшчэ і падаць! Прычым у вершах!

Заўсёды чакаю і чытаю рубрыку «Алё, народ на праводзе!», бо ў ёй, як той казаў, усё наша — перажытае і незабытае. Перажытае нашымі бабулямі і дзядулямі, данесенае імі ж да дзяцей і ўнукаў. Прычым (з дапамогай газеты, што вельмі важна...) не толькі да сваіх.

Асобная размова пра «карацелькі» Валянціны Доўнар. Бывае, чытаючы іх, лаўлю сябе на думцы, што прыкладна тое ж чула і бачыла сама. Але напрыканцы з'яўляецца выснова і ты... абяззброены, бо бачыш усё зусім па-іншаму.

Адно, падаецца, што ў апошні час гэта няпростая «Простая мова» становіцца ўсё больш сумнай. Мо таму, што меней культуры (асабліва ў моладзі), болей навушнікаў і «мабільнікаў», а добрую кніжку ці тую ж «Звязду» схільны прачытаць не кожны. А не прачытаў (тут я згодна з кітайцамі) — значыць розуму не прыбавіў — пра нешта не даведаўся, нечага не зразумеў, не ўспомніў, нечаму не навучыўся.

Не ведаю, як іншым чытачам, мне настрой на ўвесь дзень задаюць і звяздоўскія здымкі — нечаканыя, цікавыя, яркія ад Анатоля Клешчука, лірычныя, філасофскія з вершамі Яўгена Пясецкага. Так і хочацца павучыцца ў іх (я таксама люблю здымаць) выбіраць сюжэты і ракурсы, спыняць цудоўныя імгненні.

З асалодай разгадваю ў «Звяздзе» крыжаванкі. Калегі спачатку здзіўляліся, як гэта — «кроссворд... На белорусском?!». Адказваю, што менавіта ад гэтага ён у сто разоў цікавей!

Таму і раю — ім і ўсім — разгадвайце! Чытайце! Любуйцеся! Здзіўляйцеся, смейцеся, вучыцеся.

І трымайцеся мовы сваёй!

Раіса ЖЫГАЛКА, намеснік начальніка аддзела паштовай сувязі Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь.

Матэрыялы спецпраекта падрыхтавалі: У. ЗДАНОВІЧ, В. ДОЎНАР, І. ЛАПАТО, А. ДЗЯДЗЮЛЯ, С. ЯСКЕВІЧ.

Спадчына

ДУША ЗАБЫЧАННЯ

Пенсіянерка, у былым дырэктар саўгаса і камуніст, змагаецца за аднаўленне вясковага праваслаўнага храма

Зося Дзмітрыеўна БЯЛЯЕВА: «Як я верыла ва ўладу і народ, так я заўсёды верыла ў Бога».

ПЕРАЖЫЛА ЎСЕ НЯГОДЫ

Адна са славутасцяў Касцюковіцкага раёна, **Свята-Узнясенская царква**, была зачыненая амаль 80 гадоў. І па сённяшні дзень, нягледзячы на вяртанне будынка праваслаўнай абшчыне, сюды ходзяць толькі цікаўныя людзі, ды мясцовыя хлапчукі гуляюць у вайну.

Пры Вялікім Княстве Літоўскім уладальнік зямлі, на якой цяпер стаіць вёска Забычанне, даслаў сюды свайго лепшага працаўніка. Трэба было стварыць гаспадарку і даваць пану даход. Тут было шмат добрай пашы для жывёлы, таму сталі лоны, тоўстыя сцены з чырвонай цэглы, светлая тынкоўка. Святар з Касцюковічаў айцец Міхаіл расказваў, што гэты храм калісьці быў адметны залатым іканастасам на кіпарысавых дошках. Тут спяваў добры мужчынскі хор, а рэгента выпісалі з Санкт-Пецярбурга. Гавораць, што мясцовы памешчык хацеў запрасіць у Забычанне грэчаскіх мастакоў, каб распісаць сцены і купал храма фрэскамі, але гэтыя планы перакрэсліла Кастрычніцкая рэвалюцыя.

Сёння тут усе сцены распісаныя надпісамі кшталту «Тут быў Вася». Земляная падлога ў ямінах ад дзейнасці чорных археолагаў. Купалы параслі кустамі. Выдрапаная на сцяне зорка — адбітак савецкіх часоў. Апошняя служба ў храме адбылася ў пачатку 1930-х гадоў, на знак новага жыцця з царквы скінулі звон у паўсотню пудоў. Гавораць, уначы забралі святара і яго сям'ю, і больш іх ніхто не бачыў.

Свята-Узнясенская царква ў вёсцы Забычанне.

вырошчваць быкоў. З усіх ваколіц людзі прыязджалі набываць жывёлу: яны ехалі «за быкамі». Гавораць, што менавіта так і нарадзілася назва гэтай вёскі.

Напрыканцы XIX стагоддзя гэта было вялікае паселішча, дзе памешчык заснаваў ткацкую вытворчасць і вінакурню. Працаваў вадзяны млын, на Духаў дзень збіраліся на таргі сяляне. А ў 1897 годзе была пабудаваная мураваная царква.

Царква стаіць на невялікім пагорку, унізе — рака Жадунька. Непадалёк — старадаўні калодзеж з дахам з шэрага дрэва, які быў калісьці пабудаваны на месцы крынічкі. Калодзежам даўно не карыстаюцца, у вёсцы ёсць водаправод. Унізе пагорка — вялізная стогадовая ліпа, яшчэ з панскіх пасадак. У дупле можа схавацца дарослы чалавек, калі не пабаіцца калоніі аранжавых жучкоў на ствале.

Сама царква — вельмі гарманічны будынак. Магутны каменны падмурак, карызны і металу не спакусіліся на ажурныя каваныя краты на вокнах і масіўныя дубовыя дзверы. Мясцовыя кажуць, што гэта найпрыгажэйшая царква перажыла ўсе нягоды мінулага стагоддзя, а цяпер трэба яе аднавіць на радасць людзям.

Праваслаўная абшчына ў Забычанні збірае ахвяраванні на аднаўленне царквы: рахунак 3015000001628, код 561, УНП 700849256.
Філіял № 712 «Беларусбанк»

У Забычанні быў арганізаваны калгас «Ленінскі шлях», і царкву пераўтварылі ў гаспадарчы склад. Але, нягледзячы на прарэхі ў даху і вечна адчыненыя дзверы, храм усё ж такі нядрэнна захаваўся. Расказваюць, што па ім стралялі ў вайну, але ніводны снарад не трапіў у цэль. Ды і ў наш час меркантыльныя збіральнікі старажытнасцей не спрабуюць яго разабраць на цэглу.

КАМУНІЗМ І БОГ

Зося Дзмітрыеўна БЯЛЯЕВА жыве ў вёсцы Забычанне шмат гадоў. У свае 83 гады яна сабраная, з камандным голасам і выразнай мовай.

— Я прайшла ўсё: працавала ў гаспадарцы, сельсавеце, партыйных органах, — расказвае жанчына. — Ад простай сялянкі, калі пасляваеннае жыццё было цяжкае і ўсе працавалі бясплатна, да дырэктара саўгаса, які стварылі напрыканцы 1950-х гадоў на тэрыторыі некалькіх бедных калгасаў. На гэтай пасадзе я была 15 гадоў. Я тут працавала ўсюды. А цяпер і ў царкве...

Так, зараз Зося Дзмітрыеўна па просьбе вяскоўцаў стала старшынёй праваслаўнай абшчыны Забычання. Актыўная пенсіянерка, ініцыятар збору подпісаў і грошай, настойліва просіць улады перадаць царкву абшчыне, дапамагчы ў аднаўленні гістарычнага помніка.

— За гэты час было дастаткова фінансаў, каб аднавіць царкву, — узгадвае Бяляева. — Але гэта было немагчыма, я адразу стала б ворагам народа.

Яна не цураецца грамадскай нагрузкі. Дзяцей у Бяляевай няма: яна расказала, што яе муж быў заходнікам, а яна — тыповая ўсходніца, таму разумення паміж маладымі не атрымалася, і яны пайшлі кожны сваёй дарогай. Вось так чэсна і прынцыпова. І ў такім жа стылі Зося Дзмітрыеўна растлумачыла, што абсалютна не бачыць супярэчнасці паміж колішнімі камуністычнымі перакананнямі і цяперашнім гарачым жаданнем аднавіць царкву.

— Мне падаецца, што гэта ўласціва чалавеку — зазнаць жыццё, — тлумачыць яна. — Я была грамадзянінам савецкай дзяржавы, і камуністычнае вучэнне за тым часам было перадавым. Я зазнала яго і стала камуністам. Я хацела працаваць у сельскай гаспадарцы і зрабіла гэта. Але як я верыла ва ўладу і народ, так я заўсёды верыла ў Бога.

Не ўсім гэта выснова зразумелая. Людзі, гавораць, нават прыдумалі гэтай сітуацыі прымальнае тлумачэнне. Маўляў, Зося Дзмітрыеўна ўбачыла прарочы сон, у якім быў запавет: адрадзіць царкву, якую ў часы свайго кіравання саўгасам выкарыстоўвала як склад. Сама жанчына гаворыць, што гэтыя пагалоскі — проста глупства:

— У мяне ёсць Біблія, і я яе чытаю. Я і за савецкім часам цікавілася і зазнавала, няхай усё гэта і забаранялі. Каб параўноўваць і шукаць праўду. У Бога вераць у душы, а не на словах.

БУДУЧАЕ ВЁСКІ

— Царква народу патрэбная, — перакананы **старшыня Забычанскага сельскага Савета Уладзімір БЕЛАБАРОД**. — Яна павінна быць у вёсцы, як бальніца і школа. Школа дае адукацыю. Бальніца лечыць цела чалавека, а царква — яго душу.

Сёння ў Забычанні жыве больш за 300 чалавек, і вёска ўвогуле робіць добрае ўражанне. Прыгожыя дамы з палісаднікамі, ветлівыя людзі.

— Вёска стала драбнець пасля Чарнобыля (Касцюковіцкі раён пацярпеў ад радыяцыі), — гаворыць Уладзімір Белабарод. — Але ў мясцовую школу ходзіць цяпер 70 дзяцей. Захавалася ўся інфраструктура. Хоць Забычанне не ўвайшло ў склад аграгарадкоў, але будучае ў гэтай вёскі ёсць.

Галоўнае, што ў вяскоўцаў ёсць праца. Забычанне ўваходзіць у склад вельмі паспяховай сельскай гаспадаркі: «Цэмагра» — падраздзяленне Беларускага цэментнага завода, дзе працуюць і стабільна зарабляюць 140 чалавек.



Арцём, якому 9 гадоў, гуляе ў царкве разам са сваімі сябрамі ў вайну.

— Мы ўсёй душой за адраджэнне вёскі, — гаворыць **дырэктар Забычанскага вучэбна-педагагічнага комплексу Аляксандр МЯДВЕДНІКАЎ**. — Праўда, колькасць дзяцей усё ж патроху скарачаецца, але ў вёсцы ёсць жыллё і праца. Я бачу па дзецях, што яны добра апранутыя і дагледжаныя, таму што іх бацькі атрымліваюць нармальныя грошы. Шэсць бліжэйшых гадоў мы дакладна будзем прымаць дзяцей у першы клас. А ёсць школа — і вёска жыве.

Сам Аляксандр Аляксеевіч прыехаў у Забычанне працаваць настаўнікам больш за 20 гадоў таму. Так тут і застаўся: прыгожыя мясціны, усё ёсць для жыцця. Палюбіў гэтае месца і яго гісторыю.

Нездарма на двары школы пасярод бярозак і рабін стаіць вялікі камень, на якім напісана: «Школа заснаваная ў 1883 годзе». Навучальная ўстанова прынцыпова вядзе свой адлік з адкрыцця царкоўна-прыходскай школы пры старой царкве. Таму і справу аднаўлення храма ў вёсцы дырэктар школы лічыць і сваёй таксама.

Раённыя ўлады падтрымліваюць высілкі праваслаўнай абшчыны Забычання. Райвыканкам звярнуўся ў Міністэрства культуры з просьбай прызнаць Забычанскую царкву гісторыка-культурнай каштоўнасцю: у такім разе, спадзяюцца вяскоўцы, і дзяржава дапаможа ў яе аднаўленні. У Касцюковічах падлічылі, што на аднаўленне Забычанскай царквы патрабуецца не менш за 5 мільярдаў рублёў.

— Вядома, усё гэта справа не аднаго года, — прызнае старшыня сельсавета. — Тут запатрабуюцца не толькі сродкі, але і цярплівасць. Але я ўпэўнены: усё атрымаецца.

— Стагоддзямі ў Забычанні жыве традыцыя — падтрымліваць адзін аднаго, тым людзі і жывуць, — нагадала Зося Бяляева. — Будзем спадзявацца на саміх сябе і дапамогу добрых людзей.

Ілона ІВАНОВА. Фота аўтара.
Касцюковіцкі раён.

Ад прадзедаў...

Золата Беларусі

Не з каштоўнага металу — з саломы!

НАПЯРЭДАДНІ рэспубліканскіх «Дажынак», якія сёлета праводзяцца ў Прынямонні, у Гродзенскім дзяржаўным музеі гісторыі рэлігіі адкрылася выстава «Золата Беларусі», якая знаёміць з адным з найбольш старажытных відаў рамёстваў — саломапляценнем. Гэта этнічны сімвал, знак беларускай культуры, можна сказаць, яе «візітоўка», як, напрыклад, разьба і роспіс па дрэве ў расіян.

— Выстава звязаная з надыходам восені і з такой з'явай у жыцці беларусаў, як дажынкі. Саломапляценнне ўзнікла на нашых землях на мяжы другога-трэцяга тысячагоддзяў да нашай эры. І было звязана з тым, што жыта і пшаніца давалі не толькі хлеб, але і матэрыял, саломку, з якой выраблялі рэчы, неабходныя як у хатнім побыце, так і ў абрадавай сімволіцы, — апавядае **навуковы супрацоўнік Гродзенскага дзяржаўнага музея гісторыі рэлігіі Аліна РАМАТОЎСКАЯ** і запрашае азнаёміцца з некаторымі, найбольш папулярнымі на Беларусі вырабамі з саломкі.

Гэта ў першую чаргу прадметы хатняй гаспадаркі, разнастайныя віды посуду — хлебніцы, цукерніцы, куфэркі, вазы. Таксама шырока ўжываліся нашымі продкамі кублы для захоўвання збожжа, вельмі эфектыўныя ў справе захоўвання гэтых прадуктаў, паколькі забяспечвалася добрая цыркуляцыя паветра. Праўда, іх у музейных калекцыях няшмат. Чаму мала захавалася? Бо саломка была вельмі даступным матэрыялам, і калі гэты посуд псаваўся, то не ставілі мэту аднавіць, а лёгка выраблялі новы.

І гэта тычыцца не толькі рэчаў хатняга побыту, але і, напрыклад, лялек, якія таксама прадстаўленыя на выставе «Золата Беларусі». Браліся некалькі пучкоў саломы — атрымлівалася сімвалічная выява лялькі.

Але, разам з тым, саломка прыдатная і для сапраўдных высокамастацкіх твораў. У гэтым пераконваюць, напрыклад, «Батлейка» (аўтар П. Гатоўка з Вілейскага раёна), «Калядная зорка» (Я. Саламянка з г. Баранавічы), альбо «Сава», «Конь» (Н. Ржэўцкая з Барысаўскага раёна). Многія з жывёл, якія выкарыстоўваюцца ў саломапляценні — знакавыя, сімвалічныя ў беларускай культуры.

— У прыватнасці, конь са старажытных часоў быў не толькі асноўным памочнікам земляроба, але і казачным героем, добрай прыкметай. Здаўна лічылася, што суседства чалавека з канём вельмі добра ўплывае на стан чалавечай душы. Гэта датычыцца і птушак — некаторыя з якіх таксама ўвайшлі ў побыт у выглядзе лялькі з саломы. Напрыклад, галубы на святы падвешваліся на покуці пад абразамі, — зазначае Аліна Раматоўская.

А што датычыцца беларускага касцюма, то неад'емным элементам з'яўляецца капялюш, альбо брыль. На выставе прадстаўлены і картуз працы майстра Сярпейкі з Ашмянскага раёна — капялюш з брыльком, на манер гарадскога. Увогуле ж найбольш шырокае распаўсюджанне капелюшы мелі на вёсцы, сярод пастухоў. Менавіта яны лічыліся і найбольш знанымі майстрамі ў іх пляценні.

...Пасля дажынак з саломінак, што засталіся ў полі, нашы продкі рабілі бараду — апошні сноп, які потым захоўваўся ў хаце на ганаровым месцы, у чырвоным куце, і чакаў наступнага ўраджаю. Менавіта з яго бралі насенне для наступнай нівы. Нашы продкі верылі ў божую сілу зерня, саломы і, магчыма, таму саломапляценне набыло такое распаўсюджванне, а зараз з'яўляецца, так бы мовіць, беларускім брэндам. Заслугоўваючы, напэўна, не толькі музейных экспазіцый у Беларусі і іншых краінах, але і ўласнага музея, дзе былі б прадстаўленыя ўсе кірункі гэтага мастацтва.

«Шэдэўрам саломапляцення з'яўляюцца Царскія брамы для палескіх цэркваў, якія былі шырока распаўсюджаныя напачатку XIX стагоддзя. Адны з іх знаходзяцца ў Гродзенскім дзяржаўным гістарыка-археалагічным музеі.

А адны з самых старажытных і, бадай, самых загадкавых твораў з саломкі — гэта «павукі». Сяляне падвешвалі іх напярэдадні Новага года ў чырвоным куце як абярэг хаты і яе гаспадароў. «Павук» быццам убіраў у сваю павуціну ўсе дрэннае, што магло перашкодзіць жыццю гэтай сям'і. Штогод старых «павукоў» спальвалі і на іх месца размяшчалі новага. «Павука» таксама навешвалі над калыскай дзіцяці і над галовамі маладых падчас вяселля».

Барыс ПРАКОПЧЫК. Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

ЛЬВУ САПЕГУ ПАСТАВІЛІ ПОМНІК

У Лепелі падчас святкавання Дня горада адкрылі помнік славутаму палітычнаму дзеячу, мецэнату часоў Вялікага Княства Літоўскага Льву Сапегу. Менавіта дзякуючы яму цяперашні лепельскі край пры ягоным жыцці актыўна развіваўся і быў у росквіце. У 1563-м паселішча (цяпер вёска Стары Лепель) атрымала статус горада, а ў 1586-м недалёка быў заснаваны Новы Лепель, на тэрыторыі якога і месціцца цяперашні раённы цэнтр. Выканаў скульптуру (а разам з пастаментам яна дасягае вышыні 3,5 метра) мінскі скульптар Леў Аганаў. Такім чынам адкрыццё помніка ля ўвахода ў гарадскі парк стала адной з галоўных падзей святкавання 571-й гадавіны першай пісьмовай згадкі пра Лепель.

Правінцыйны горад нават някруглую дату пастараўся адсвяткаваць, каб падзея запомнілася надоўга. Мерапрыемствы праходзілі на працягу двух дзён. Арганізатары ў ліку іншага пастараліся, каб горад быццам бы перанёсся ў часе: дзякуючы «акцёрам» у строях старадаўніх часоў. У мясцовым летнім амфітэатры ганарова адкрылі свята і далі канцэрт «Горад дзяцінства», канцэрт прайшоў і ў доме культуры. Працавалі «Горад майстроў» і гандлёвыя кірмашы. Правялі свята марожанага (пастараўся мясцовы вытворца гэтага смачнага прадукту), розныя спартыўныя спаборніцтвы, вернісаж фотаздымкаў і іншыя вельмі цікавыя акцыі. Зразумела, не абышлося без феерверку.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

На хвалях «Блакітнай стужкі Вілейшчыны»

Турыстычны брэнд Беларусі



Гэта ўнікальнае для Беларусі дрэва схаванае ад вачэй. Мясцовыя жыхары называюць яго «Слаком» — магчыма, таму, што, калі глядзець крыху збоку, можна пабачыць хобат і вялікія вушы. Асабліва любяць гэтае дрэва дзеці, бо ўнутры можна схавацца, як у хатцы. Але і дарослыя з задавальненнем заглядваюць «унутр» дрэва. Мне «пашчасціла» — разам з іголкамі ў капюшоне заблукаў... павук-крыжаносец. Плакучая (ці змеявідная) елка — бадай што самы незвычайны, але далёка не адзіны турыстычны аб'ект у найцікавейшым новым беларускім зялёным маршруце «Блакітная стужка Вілейшчыны», які стварыўся і напаўняецца пры садзейнічанні праекта ЕС/ПРААН «Устойлівае развіццё на мясцовым узроўні» **(фота 2).**

Умоўны «старт» зялёнага маршруту пачынаецца з цэнтра Вілейкі. Тут размясціліся галоўныя выдатныя мясціны горада — касцёл Узвышэння Святога Крыжа **(фота 4)**, які ўключаны ў лік «7 цудаў Міншчыны», і Свята-Марыінская царква.

Далей шлях цягнецца да вёскі Камена, дзе знаходзіцца знакаміты помнік археалогіі «Варацішын крыж» з надпісамі XII стагоддзя **(фота 3)**. Недалёка ад каменя цячэ рака Вілія (адкуль, дарэчы, стартавала экспедыцыя графа Тышкевіча). Па задумцы арганізатараў зялёнага маршруту, яго ўдзельнікі могуць перасесці на лодкі ці байдаркі і працягнуць свой шлях па вадзе. Існуе легенда, што ў далёкія часы хлопец з дзяўчынаю

так пасварыліся, што ён ператварыўся ў камень, а яна — у рачулку. Легенда паказвае, што яны зноў стануць хлопцам і дзяўчынай толькі тады, калі рака дойдзе да каменя. Але на працягу столькіх стагоддзяў гэтага на адбываецца **(фота 1).**

Яшчэ адно цікавае месца ў маршруце — наведванне старажытнага татарскага могільніка.

Пакупацца ў Вілейскім вадасховішчы, пакатацца на конях у сядзібе Старынкі, заехаць у госці да знакамітага мастака Барыса Цітовіча на хутар Забродзе — за адзін дзень пабачыць увесь маршрут «Блакітнай стужкі Вілейшчыны» проста немагчыма. Фарміраванне «зялёнага» маршруту яшчэ працягваецца. І, безумоўна, ёсць надзея, што Вілейшчына стане прывабнай не толькі для замежнага турыста, але і для кожнага беларуса.

Марына БЕГУНКОВА. Фота аўтара.
Вілейшчына.

Крымінал, здарэнні

МАЛАДЫЯ, ЗАКАХАНЫЯ І...

Як паведаміла прэс-служба Магілёўскага УУС, 12 верасня позна ўвечары ў Магілёўскую гарадскую бальніцу хуткай дапамогі трапіў 16-гадовы хлопец з атручэннем перакісам вадароду і ў нецвярозым стане. Выявілася, што малады чалавек пасварыўся з дзяўчынай і вырашыў развітацца з жыццём, для чаго на прыпынку грамадскага транспарту ў цэнтры Магілёва выпіў перакіс вадароду. Добра, што суіцыд не ўдаўся: брыгада хуткай медыцынскай дапамогі забрала хлопца прама з прыпынку ў бальніцу.

13 верасня позна ўвечары ў Крычаве з 17-гадовым вучнем мясцовага каледжа адбылося непрыемнае здарэнне іншага кшталту, хоць вынік той жа самы — шпіталізацыя. Малады чалавек спрабаваў у інтэрнаце перабрацца з трэцяга паверха на ніжні з дапамогай коўдры. Аднак гэты «кіношны» план не ажыццявіўся: хлопец упаў з вышыні трэцяга паверха і атрымаў траўмы. У цэнтральную раённую бальніцу ён таксама трапіў у стане алкагольнага ап'янення.

Алена КАЗЛОВА.

У АСТАТНЯЙ ЧАСТЦЫ ПРЫГАВОР — БЕЗ ЗМЯНЕННЯЎ

Судом Брагінскага раёна тры браканьеры прызнаныя вінаватымі ў незаконнай здабычы рыбы, якая пацягнула нанясенне прыродзе шкоды ў асабліва буйным памеры.

Ім было прызначана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на адзін год кожнаму з адбыццём пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму, якое, з выкарыстаннем яшчэ аднаго артыкула Крымінальнага кодэкса, не прыводзіцца ў выкананне з выпрабавальным тэрмінам на адзін год. Рэчавыя доказы — надзіманая гумавая лодка, два вяслы, лодачны матор — канфіскаваныя. Прад'яўлена шкода ў суме 3,5 мільёна рублёў. Гэтае рашэнне парушальнікі абскардзілі ў касацыйнай калегіі па крымінальных справах Гомельскага абласнога суда. Яе вызначэннем прыгавор суда Брагінскага раёна зменены — выключаны з рэзалютыўнай часткі прысуду ўказанні аб адбыцці імі пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму. У астатняй частцы прыгавор пакінуты без змяненняў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЗАПРАСІЎ ВЫПІЦЬ

Расіянін, індывідуальны прадпрымальнік з Кіраўскай вобласці, вырашыў у в. Парахонск (Пінскі раён) выпіць з 30-гадовай маладзіцай. Запрасіў жанчыну ў аўтамашыну «Вольва», а калі тая пакінула прадпрымальніка, то ён заўважыў, што знікла 23 тыс. расійскіх рублёў. Грошы міліцыя знайшла ў беспрацоўнай з гэтай жа вёскі, якая ўжо пабывала ў калоніі за крадзеж.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

АРСЕНАЛ НА КАМБІНАЦЕ ХЛЕБАПРАДУКТАЎ

Пры правядзенні земляных работ на тэрыторыі камбіната хлебапрадуктаў у Полацку рабочыя знайшлі небяспечныя «жалезкі». Выклікалі сапёраў, і тыя дасталі з зямлі цэлы арсенал: тры гранаты, больш за 280 узрывальнікаў да ручных гранат, нямецкую супрацьпяхотную міну. Знаходку знішчылі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

(Працяг. Пачатак на стар. 1.)

АД НЯМІГІ ДА АМУДАР'І РУКОЙ ПАДАЦЬ, КАЛІ ГЭТА РУКА СЯБРОЎСТВА

Мінералы, падняты з глыбінь зямлі, нясуць у сабе багатую інфармацыю, расказвае загадчыца лабараторыі магазяванняў карысных выкапняў Анжэліка ЗЛЕБАВА. З дапамогай камп'ютарных прагрmaм на экране ўзнікаюць нябачныя з паверхні падземныя «краявіды».

— Сяргей Фёдаравіч, а чаму ўсё ж перавагу гаспадары аддалі вам, як вы думаеце? Па якіх параметрах ішло параўнанне?

— Калі мы пачалі праектаваць і будаваць Чырвонаслабадскі руднік у Беларусі, то да таго часу ніхто ў свеце гадоў 30 не будаваў калійных руднікоў. Так што за гэты даволі вялікі перыяд мы былі першыя і адзіныя, хто спраектаваў саляны руднік, і ён быў пабудаваны па нашым праекце і пад нашым аўтарскім наглядам. Відома ж, разам з беларускімі шахтапраходчымі, будаўнічымі і спецыялізаваными фірмамі. І да таго часу, калі быў аб'яўлены конкурс на новае будаўніцтва, назапасілі свежы вопыт і змаглі даволі пераканаўча прадэманстраваць свае магчымасці. Калі падыходзіць да праблемы комплексна, то ў нас ёсць не толькі свае праектныя падраздзяленні, але і свая навука. Зараз інстытут па колькасным складзе — амаль тысяча кваліфікаваных супрацоўнікаў, праектаваннем займаецца больш за 40 гадоў. Сёння такога комплексанага інстытута, вазьму на сябе смелась сказаць, больш няма нідзе. Канстатую факт, які ўсе прызнаюць.

Даследаванні праводзіць інжынер лабараторыі водазабеспячэння і каналізацыі Валянціна ЛІСОЎСКАЯ.

У нас у «актыве» быў удзел у будаўніцтве горнаўзбагачальнага камбіната ва Узбекістане, дзе мы дапамагалі карэктаваць тэхналогію абагачэння. Мы выйгралі і тэндар на праектаванне рудніка ў Валгаградскай вобласці, што, відаць, было ўзята ў разлік. (Там у тэндары прымалі ўдзел паўтара дзясятка арганізацый, уключаючы нямецкія, канадскія, расійскія кампаніі.) І месяц назад адралі гатовы праект на экспертызу ў «Галоўдзяржэкспертызу» Расійскай Федэрацыі. Што было не проста, бо ў Расіі яраз выйшлі новыя нарматывы і адказных выканаўцаў.

Спраў там шмат — і праходка, і наогул усе горныя работы. Неабходна таксама пабудаваць усё, што належыць, наверсе рудніка, узвесці фабрыку, дапаможную вытворчасць, інфраструктуру, і падыходы павінны быць цалкам рэалістычнымі.

Такім чынам, што зроблена сёння? Падрыхтавана ўся праектная дакументацыя і ўвесь пакет дакументаў адпраўлены ў Туркменістан для экспертызы і зацвярджэння. Разумеем: дакументы будуць разглядацца дастаткова ўважліва, нават прыдзірліва, што цалкам апраўдана, бо рэч — пра шахтавае будаўніцтва ў сейсмічна актыўным раёне. І кансультанты ў «Туркменхіміі» выступаюць вопытным спецыялістам з канадскай фірмы.

— І зараз там распачынаюцца будаўнічыя работы...

— Яшчэ раней ім пацвярджаны графік работ, і мы ідзём па графіку. У прыватнасці, адсыпаюцца дарогі, падсыпаецца і планіруецца (выроўнёваецца) пляцоўка. Само месцанараджэнне размешчана ў перадгор'і, і гэта надае яму своеасаблівасць. З гор пастаянна сыходзяць дажджавыя патокі, месцовыя жыхары называюць іх селевымі, але яны ўтрымліваюць у асноўным не столь глебы, колькі дробняк. Тым не менш абарынцца ад іх патрэбна, і вядуцца спецыяльныя работы.

Брыгады «Белгеалогіі» бураць свідравіны, тут заняты кваліфікаваныя спецыялісты са Слуцкай геалагічнай экспедыцыі. Працуюць высокімі тэмпамі, праходзяць у суткі 25-30 метраў, гэта нямала. Выхад керна — амаль 100 працэнтаў, паказчык вельмі добры. З іх дапамогай удакладняем геалагічнае будаванне, структуру залежаў, адбіраем пробы, каб правесці выпрабаванні.

Ужо завершана бурэнне асноўнай свідравіны, і керн адпраўляецца для правядзення рознабаковых аналізаў у навуковыя арганізацыі Туркменістана і Беларусі.

Пачалося таксама ўзвядзенне гаражда для будаўнікоў. Ад іх бытавой удалечынасці многае залежыць. Асабліва калі ўлічыць, што жыць і працаваць даводзіцца двум у дзесці гарачым кліматам, і важна, каб было дзе адпачыць.

Аб'ект — інтэрнацыянальны, узводзяць ГАК і беларусы, і туркмены, іх актыўны ўдзел прадугледжаны ўмовамі кантракта (30 працэнтаў будаўнікоў павінны быць туркмены). Татагарафічныя здымкі выканала іх 5-ге прадпрыемства, земляныя работы таксама вядуць мясцовыя ўпраўленні.

Грузы пакуль на будоўлю не пайшлі, хоць што асобныя элементы для жылога пасёлка. Прампляцоўка размешчана фактычна на краі пустыні, і дарог у раёне нашай дыслакацыі да гэтага часу не было, мастоў праз роў альбо няма, альбо разбураныя, і грузы дастаўляць не проста. У асноўным яны пакуль пойдуць праз пантонныя масты. Патрэбна аператыўна вырашаць пытанне з чыгункай, у свой час яна там будавалася, але не даявалі да нашага аб'екта кіламетраў сем. Займаюцца гэтым будзе заказчык, згодна з умовамі кантракту, ён павінен забяспечыць нас транспартнай складовай, а таксама электраэнергіяй і газам. Наша справа — даць праект пракладкі чыгункі да прамысловай пляцоўкі, чым і займаемся.

— З якім настроем сустрэла мясцовае насельніцтва перспектывы такой грандыёзнай будоўлі?

— Адназначна — з радасцю, здавальненнем. Бо людзям будзе работа, а значыць, і неблагія заробкі. Сельскай гаспадаркі — вітамінаў ўрадлівасці, бюджэту — істотная валютная падтрымка, бо калійныя ўнясенні абавязкова пойдуць на экспарт і гарантавана знойдуць збыт. Для эканомікі Туркменіі гэта новабудоўля мае першаступенную важнасць. Усе ў далёкай краіне надзвычай зацікаўленыя ў ёй, была спецыяльная пастанова іх Прэзідэнта.

Скажу нават больш. Гарлыкскае месцанараджэнне — не адзінае ў Туркменіі, і, пасля таго, як яно пачне «працаваць», на чарзе будзе асваенне Карабіль-скага радовішча калійнай солі. Так што перспектывы там вялікія. Нядаўна мы падпісалі рамачнае пагадненне на давыручэнне Карабільскага месцанараджэння і запрасілі ўсе геалагічныя матэрыялы, якія ёсць у заказчыка, каб мець магчымасць спланаваць сваю работу наадпаведна.

— Калектыў інстытута буйны, адмабілізаваны і працуе не толькі па адным гэтым аб'екце. Мы ведаем пра ваш актыўны ўдзел у многіх міжнародных праектах. Раскажыце, калі ласка, хаця б коратка пра найбольш прыкметныя.

— Наша дзейнасць люстэркава адлюстроўвае знешнепалітычную дзейнасць краіны, Прэзідэнта і Урада. Мы ідзём услед за палітыкамі і працуем на ўмацаванне іміджу Беларусі, а таксама на вырашэнне буйных народнагаспадарчых задач. Цікавыя задачы выконваем у Венесуэле, дзе адкрылі сваё прадстаўніцтва. Зараз заканчваем там дараздзелку месцанараджэння, распрацуем ТЭА і будзем вызначацца са стварэннем СП. Падпісаны рамачныя пагадненні з В'етнамам па праектаванні шахтных стваловў на вугальных месцанараджэннях. Ёсць аналагічныя прапановы з Лаоса. Нашы спецыялісты пабывалі ў іншых краінах Азіі, Паўднёвай Амерыкі і Афрыкі і прыйшлі да высновы, што там таксама могуць быць запатрабаваныя нашы магчымасці. Гэта датычыцца як калійных соляў, так і іншых карысных выкапняў.

Калі браць бліжэйшае замежжа, то ў нас працуюць прадстаўніцтва ў Маскве і філіял у Валгаградзе. Прысутнасць інстытута за межамі Беларусі зразастае. І можна сказаць, што расце аўтарытэт, бо нас звяртаюцца за дапамогай і ў нейкіх «нятыпатных» сітуацыях. На просьбе украінскага боку нашы спецыялісты выязджалі на праблемны Сцебнікаўскі калійны завод і рабілі незалежную ацэнку яго стану і магчымых перспектыў інтэнсіфікацыі выварчкі. Яшчэ раней інстытут падрыхтаваў экспертнае заключэнне аб прычынах аварыі на адной з расійскіх калійных шахт. Такія просьбы мы ўспрымаем як сведчанне даверу да падрыхтаванасці нашага калектыву, у якім сабраны адны з лепшых спецыялістаў. І ўспрымаем таксама як давер, калі нашых прадстаўнікоў уключаюць у склад дзяржаўных дэлегацый. Разам з Сяргеем Сяргеевічам Сідоркім давялося пабываць у Казахстане, там таксама чакаецца цікавая сумесная работа па асваенні калійных соляў, фасфарытавых месцанараджэнняў. Усё гэта — тэма для асобнага, больш падрабязнага расказу ў наступных публікацыях.

— Сяргей Фёдаравіч, мы не пісалі пра інстытут два з паловай гады. А што за гэты час зроблена новага «дома», у Беларусі.

— Тут мы арыентаваныя галоўным чынам на «Беларуськалій» — гэта асноўны наш партнёр і заказчык. За апошнія гады з нашым непасрэдным удзелам пабудаваны Краснаслабодскі руднік, завяршаецца будаўніцтва Бярозаўскага, плануецца ўзвядзенне сёмага на ліку рудніка. Рэканструяваны практычна ўсе абагачальныя фабрыкі вытворчага аб'яднання. Усё ідзе планава, у тым ліку асваенне новых тэхналогій здабычы і абагачэння. Калі ў мінулыя гады вялася распрацоўка пластоў з высокім утрыманнем карыснага прадукту, то зараз пераважае больш гаспадарскі падыход: мы забіраем фактычна ўсё, што ёсць. І даводзіцца ўдасканальваць, карэктаваць тэхналогію абагачэння руды, каб якасць не падала і прадукцыя была па-ранейшаму канкурэнтаздольнай. Усё гэта робіцца на нашых праектах.

Працуем таксама на іншых прадпрыемствах нафтахіміі — у Навалоцку, Мазыры, на рэканструкцыі магілёўскага «Крыёна». Звяртаюцца да нас і Гомельскі хімзавод, іншыя калектывы галіны. Пад іх патрэбы арыентаваныя магчымасці нашых аддзелаў.

Я хацеў бы падкрэсліць: брацца за новую справу заўсёды адразна, але і не брацца нельга, бо гэта азначала б спыніцца ў развіцці. Беларусь — трэцяя ў свеце краіна па запасах калійнай руды, адзін з сусветных лідараў па вытворчасці калійных угнаенняў. І галіновая навука не мае права таптацца на месцы. Браць на сябе новыя задачы і саставіць канкурэнцыю вядучым калійным фірмам — гэта па-нашаму.

ЗА АСНОВУ БЯРЭЦЦА СУСВЕТНЫ ПОСЫП

Гаворыць намеснік генеральнага дырэктара па капітальным будаўніцтве Аляксандр Максімчык, з якім мы сустрэліся напярэдадні яго чарговай працяглай камандзіроўкі ў Туркменію.

— Як вам толькі што расказалі, шэраг беларускіх і туркменскіх арганізацый ужо прыступілі да выканання будаўніча-мантажных работ на гэтым аб'екце. Дазлюся з вамі самай апошняй інфармацыяй на гэты час: нашы геолагі не толькі завяршылі бурэнне асноўнай свідравіны, на базе якой будзе будавацца шахтавы ствол, але і пачынаецца бурэнне свідравіны для другога шахтавага ствала. Тольк што я размаўляў з дырэктарам «Белгеалогіі» Аляксандрам Мікалаевічам Шуравіным, вырашаецца пытанне аб прыцягненні да работ мясцовай геалагічнай эксцэдыцыі. Лагічна, што мясцовыя арганізацыі і фірмы будуць удзельнічаць даволі актыўна. А да нас, беларусаў, там стаўленне цудоўнае, усе задаволены, што будоўлю вядуць менавіта беларусы.

Мясцовыя арганізацыі ўжо выказалі вертыкальную планіроўку, зрабілі агароджванне як прамысловай пляцоўкі, так і бытавога гарадка, пабудавалі часовую дарогу і некалькі домікаў для будаўнікоў. Нашы тапографы дапамагаюць заказчыку вызначыцца з месцам праходжання лініі электраперадачы — разам вядуць тапаграфічныя здымкі. Актыўна вядуцца работы на дамбе і водаадводным канале, якія абаронякуць ад патокаў з гор. Праектная дакументацыя на гэтыя работы ёсць, яна выканана інстытутам, неабходная тэхніка таксама ў наяўнасці. Варта дадаць, што па агульнай згодзе дамбу вырашана будаваць пакуль часовую, а ў ходзе эксплуатацыі паглядзім, як яна сябе пакажа. Збярэм усе неабходныя звесткі і ўжо потым на аснове часовай узвядзём, калі спатрэбіцца, пастаянную.

Раён у пяўным сэнсе сейсмаактыўны, што накладвае дадатковую адказнасць на праекціроўшчыкаў і будаўнікоў. Сейсміка бярэцца ў разлік, шахтавыя стваллы і іншыя збудаванні праектуюцца і будуць выкананы па максімуме бяспечна, з выкарыстаннем цюбінгаў і іншага надзейнага горнага абсталявання. Там, дзе патрэбна, будзе выкананы бетанаванне, прычым арміраваныі бетонамі належнай таўшчыні — у разліку на тыя балы па шкале Рыхтара, якім канструкцыі павінны будуць супрацівацца.

Гаспадары будоўлі пастаянна цікавяцца вопытам «Беларуськалія», што цалкам зразумела. Напрыклад, перад тым, як разгарнуць работы на Гарлыку, разам з прадстаўніком заказчыка, дырэктарам дырэкцыі новабудоўлі Габбарам Сейлханавым мы спускаліся ў шахты нашага салігорскага прадпрыемства. Пры ўзвядзенні Гарлыкскага ГАКа будзе ўлічана ўсё лепшае, што ёсць на ААТ «Беларуськалій», у тым ліку і больш ашчадныя і разам з тым надзейныя метады будаўніцтва новых руднікоў і інфраструктуры.

— Як будзе вырашацца пытанне з забеспячэннем аб'екта будаўнічымі матэрыяламі?

— Пясок, гравій, шчабёнку, якія патрэбны для прыгатавання будаўнічых раствораў і бетонаў, мы будзем браць на месцы, і ўжо бяром. Побач з намі знаходзяцца буйны кар'ер інертных матэрыялаў, гэта аблягчае справу. Цэментнага завода побач няма, ён толькі будуецца турэцкай кампаніяй, але цэмент у Туркменістане ёсць, прычым розных вытворцаў. Так што з Беларусі не павязём. Іншая справа, што для замежных кампаній ён прадаецца па высокай цане і за долары. Але кантрактам прадугледжана, што будаўнічыя матэрыялы павінны нам адпускацца па дазвалёнай цане, на што мы вельмі разлічваем. Бо вельмі важна «ўпісацца» ў выдзеленыя рэсурсы. Дзякуй адпраўлялу заказчыку пісьмо з разлікамі па гадах і кварталах, чаго і колькі нам спатрэбіцца, і просім садзейнічання.

— А што з тэхнікай?

— У мясцовых будаўнічых арганізацыях ёсць і агульнабудаўнічая тэхніка, і жаданне папрацаваць на прэстыжным аб'екце. Яны прапануюць свае паслугі, але мы не спяшаемся з арэндай, бо патрэбна вызначыць асноўных падрадчыкаў — і на стваллы, і на надземную частку. А падрадчыкі, як правіла, самі валодаюць наборам тэхнічных сродкаў. Калі яны палічаць за лепшае арандаваць механізмы на месцы, мы дапаможам дамовіцца з заспадарамі.

— Ці бывае прадстаўніцтва інстытута ў Туркменіі зараз?

— Прадстаўніцтва інстытута адкрыта ў сталіцы, у Ашхабадзе. У яго складзе раней было 5 чалавек, зараз колькасць павялічылася за кошт таго, што дадаткова, пад значныя аб'ёмы работ, прынялі на працу прыёмшчыкаў. Так што зараз там да 20 супрацоўнікаў.

— Якія вашы самыя моцныя ўражанні за паўгода работы ў Туркменіі?

— Шмат цікавага, экзатычнага, асабліва прырода. Сустракаюцца змеі і ядавітыя павукі. Не часта, але яны ёсць. Таму трымаем пад рукой (дакладней, у хатадальніку) сываратку на ўсялякі выпадак. І па-добраму ўразілі людзі. Вельмі добразычлівыя, дружалюбныя, як і беларусы.

— Наш чытач захоча даведацца, якога ўзроўню спецыялісты кіруюць такой буйной будоўляй непасрэдна на месцы, з якім вытворчым вопытам за плячыма. Раскажыце пра себе.

— Сюючны Бросцкі інжынер-будаўнічы інстытут, працаваў на будоўлях. Калі коратка, то ў іншых складаных угнаенняў, і пад гэта даводзіцца пераарыентаваць вытворчы працэс. Значнай увагі вымагаюць і шламасховішчы, спатрэбяцца меры па іх захаванасці, затым — па рэкультываваці, шмат усялякіх іншых пытанняў.

Зараз эпіцэнтр усіх нашых клопатаў паступова будзе перамяшчацца з сцэнаў «Белгорхімпрама» непасрэдна на пляцоўку, пачынаецца жывая работа, а гэта ўдзел у штабах, калектыўнае прынятае рашэнняў, адпраўка ў Мінск новых зьыходных звестак для комплекснай ацэнкі ў галіновых аддзелах. І той жа аўтарскі нагляд за работай будаўнікоў — таксама справа важная і адказная. А калі заглядваць далей, то і за эксплуатацыяй рудніка.

У праект закладзены перадавыя тэхналогіі, якія прымяняюцца ў свеце. Хоць прынцып флатацыі агульны, у кожнага радовішча заўсёды ёсць асаблівасці, якія трэба ўлічваць. Так, напрыклад, у Гарлыку ў асноўным сапрыкопчыя выкапні адбавязкова ўтрымліваюцца нейкія свае дадатковыя прымесі, якія патрэбна выдаліць. І кожны раз вядзецца падбор рэагентаў — ён паўсюдна індывідуальны, што, вядома, пэўным чынам уплывае на тэхналогію.

Улічваючы цэлы комплекс умоў, у тым ліку сейсмічасць раёна, залягванне грунтовых вод і іншыя абставіны, прадугледзелі для пачатка этапа так званую камерную сістэму выемкі руды. А ўвогуле тэхналогія здабычы будзе апрабоўвацца розная і падбірацца найбольш эфектыўная і бяспечная.

Перыядычна засядае міжурадавая туркмена-беларуская камісія, якая стварыла рабочую групу па рэалізацыі праекта. З беларускага боку ўвайшлі прадстаўнікі цэлага шэрагу міністэрстваў і ведамстваў. Ва ўсім, што датычыцца ўзвядзення ГАКа, яны працуюць па сваіх напрамках з такімі ж ведамствамі Туркменістана. Скажам, з удзелам рабочай групы вырашалася пытанне аб магчымасці прымянення дзеючых у Беларусі нарматыўна-тэхнічных дакументаў на тэрыторыі Туркменіі. Бо ў іх пакуль няма горназдабываючай галіны і нарматыўных дакументаў таксама.

У нас пэўны кантакт з дзяржаўнай карпарацыяй «Туркменгеалогія», яны аказваюць усебаковую падтрымку. І тыя віды аналізаў, якія можна рабіць у Ашхабадзе, робім там.

Чырвонаслабодскі руднік таксама праектаваў «Белгорхімпрам».

Намеснік генеральнага дырэктара па капітальным будаўніцтве Аляксандр МАКСІМЧЫК.

Праект бізнэс-цэнтра на праспекце Пераможцаў у Мінску — адна з маштабных распрацовак ААТ «Белгорхімпрам».

ЭПІЦЭНТР РАБОТ ПЕРАМЯШЧАЕЦЦА НА ПЛЯЦОЎКУ

Яшчэ адзін наш суразмоўца — галоўны інжынер праекта (ГІП) Уладзімір Дзяшко.

Цікава, што родам Уладзімір Іванавіч з Салігорска, з шахцёрскай сям'і: бацька працаваў на другім салігорскім руднику, брат і зараз на «Беларуськалію». Так што гэтыя клопаты яму добра знаёмыя. Пасля заканчэння горнага інстытута ў Санкт-Пецярбургу прайшоў добрую школу ў «Белгорхімпраме».

— Сёння можна сказаць, што стадыя праекта завершана, а яна цесна звязана з атрымваннем дазвальных дакументаў на будаўніцтва. Маючы агульнабудаўнічую ліцэнзію на праектаванне ў Туркменіі, зараз атрымліваем ліцэнзію на праектаванне небяспечных вытворчасцяў.

Выконваецца рабочая дакументацыя на асноўныя праекта: непасрэдна рабочыя чарцяжы кожнага будынка, збудавання, шахтавага ствала і гэтак далей. На гэтых рабочых чарцяжах і пачне весціся будоўля. І мы будзем суправаджаць яе ад самага пачатку і да поўнага завяршэння.

На прыкладзе «Беларуськалія» мы з вамі ведаем, што распрацоўка месцанараджэння — справа не аднаго дзесяцігоддзя, уводзяцца новыя і новыя рудні. Значыць, пастаянна ідзе спатрэбіцца рыхтаваць праектную дакументацыю для новых выпрацовак, атрымліваць для гэтага зьыходныя звесткі, каб выбіраць дакладныя накірункі. Патрэбна суправоджаць і работу абагачальнай фабрыкі — у тым сэнсе, што мяняецца кан'юнктура рынку, і ён патрабуе, напрыклад, больш комплексных альбо нейкіх іншых канцэнтратаў. Усе гэтыя пытанні аператыўна вырашаем таксама разам з канцэрнам «Белнафтахім», а калі ў гэтым ёсць патрэба, выходзім на рабочую групу ці на ўрад.

ЧАКАЮЦЬ НАС НА БЕРАГАХ АМУДАР'І

Раказвае галоўны навуковы супрацоўнік Анатоль Грэчка, які стаіў, можна сказаць, ля самых «вытокаў» праекта.

— Работа па Гарлыскім (Карлюкскім) праекце пачалася ў «Белгорхімпраме» вясной 2009 года. Адбыліся некалькі паездак генеральнага дырэктара інстытута Анатоля Далілавіча Смычкіна з удзелам спецыялістаў у Ашхабад, дзе прайшлі даволі энергічныя перамовы на ўсіх узроўнях — па магутнасці камбіната, тэрмінах будаўніцтва і цане. Каб былі зразумелымі аб'ёмы і кошт работ, інстытуту давялося ў спешным парадку выконваць тэхніка-эканамічнае абгрунтаванне. У выніку перамог і былі вызначаныя магутнасць 1,4 мільёна тон калійных угнаенняў у год і тэрмін будаўніцтва — пяць гадоў.

Адразу актыўна падключыўся інстытут, пачала выконвацца серыя праектных работ. У тым ліку і ацэнка ўдзеюнай сувязі падземнага горада з «вялікай зямлёй».

Сёння работы выйшлі на новы этап, Гарлык аднаўжыў ў цэнтры ўвагі не толькі нашага, але і многіх іншых вытворчых калектываў. Ход работ кантралююць намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя РБ Анатоль Ліс, дырэктар дэпартамента па геалогіі Уладзімір Карпук, генеральны дырэктар РУП «Белгеалогія» Аляксандр Шуйчанкін (ён нагоду прадаве па дзве-тры тыдні на гэтым аб'екце).

Мы б хацелі, каб беларускія арганізацыі актыўна ўдзельнічалі ў гіганцкай новабудоўлі на Берагах Амудар'і, каб на аб'ект пастаўляліся беларускія тэхніка і абсталяванне. У нас у краіне ёсць шэраг прадпрыемстваў, якія аблсугоўваюць Салігорск — выраблякоў шахтавыя канвееры, гідраўслінныя стойкі, пад'ёмныя машыны, падземны транспарт і нават горназдабываючая машыны, любыя запчасткі для ўсёй гэтай спецыфічнай тэхнікі. Чаму б ім не атрымаць заказы з Туркменіі?

— У якой меры вам спатрэбіўся набыты вопыт міжнародных стасункаў?

— Ён надае нашым спецыялістам упэўненасці ў сваіх сілах. Раней мы, магчыма, з залішнім піетэтам ставіліся да заходняй прафесійнай школы праекціроўшчыкаў. Нічога дзеннага ў гэтым няма, яны таго заслугоўваюць. Але ўсё ж калі мы выйгралі тэндар і пачалі праектаваць Грамнчанскі ГАК, пачалі мець больш шырокія стасункі з калегамі — спецыялістамі Канады, Германіі, Паўднёвай Афрыкі, — то зразумелі, што нашы спецыялісты па сваім узроўні ніколькі не горшыя за замежных.

Вопыт работы за межамі Беларусі ў тым ліку на Урале, вельмі нам спатрэбіўся, калі прыйшлі ў Туркменістан: мы ўжо ведалі, чаго чакаць і як сябе паводзіць. Унікальнасць Гарлыка ў тым, што там даволі складаная па якасці руды. Залягаюць тры тыпы руд, у тым ліку карналіты, а гэта ўжо праблема прымесь, якая перашкаджае абагачэнню, флатацыі. Пачуць мы пэўна на сільвінітавыя руды (там іх каля мільярда тон), дзе ўсё зразумела і са здабычай, і з абагачэннем.

У сваю чаргу, вопыт работы за межамі краіны спатрэбіўся дома. У нас зараз больш граматныя падыходы пры праектаванні, багаты інструментарый даследаванняў, дзякуючы чаму даразведаны поўнач чацвёртага шахтавага поля Старобінскага месцанараджэння калійных соляў, Дарасінскі ўчастак, Крыжоўскі блок, закончана дараведка на Нёмжы, і, такім чынам (з улікам Бярозаўскага ўчастка), фактычна вырашана задача з сыравінной базай для «Беларуськалія». У яго не павінна быць праблем з сыравінной базай да 2020—2025 гадоў.

Публікацыю падрыхтавалі
Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ,
Віктар ПАЗНЯКОЎ
і Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).
УНП 600024712.



Галоўны навуковы супрацоўнік Анатоль ГРЭЧКА.

Старшыня назіральнага савета намеснік генеральнага дырэктара Сяргей ШЭМЕТ.

Генеральны дырэктар ААТ «Белгорхімпрам» доктар тэхнічных навук, член-карэспандэнт НАН Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Анатоль СМЫЧНІК (справа) і галоўны інжынер праекта Уладзімір ДЗЯШКО на адным з міжнародных сімпозіумаў каля стэндаў ААТ «Беларуськалій» — свайго галоўнага партнёра і заказчыка ў Беларусі.

Група спецыялістаў інстытута разам са сваімі туркменскімі калегамі на месцы, дзе разгортваецца будаўніцтва.

Вядучы архітэктар Марына ДЗЕНДЗІВІЦКАЯ, галоўны архітэктар праекта Тамара ПУКАЧ, намеснік начальніка архітэктурна-будаўнічага аддзела Сяргей ЗДАНОВІЧ.



У сектар афармлення і выпуску праектаў паступае вялікі аб'ём распрацовак з розных падраздзяленняў інстытута. Вядуе адказным участкам Анатоль ШМІГЕЛЬСКІ. Аператару Ірыне ЛІТВІН даручана сучасная капіравальная тэхніка.

Тэхнарада ў ГІПа — галоўнага інжынера праекта.



Начальнік навукова-даследчага горнага аддзела, выконваючы абавязкі намесніка генеральнага дырэктара па навуковай рабоце Роберт ШВАБ (другі справа) з інжынерамі Яўгенам ЛУКШАМ, Аленай ПАЗНЯКОВАЙ, Андрэем БАЦЯНОЎСКІМ.

На месцы будучага горнаўзбагачальнага камбіната разгарнуліся работы.

«Белгорхімпрам» жыве клопатамі Ашхабада — далёкага, і разам з тым блізкага.

Інфарм-укол

КАМП'ЮТАР І МАБІЛЬНІК — ПАДАЛЕЙ АД ЦЯЖАРНЫХ

Любое дасягненне прагрэсу не толькі спрашчае наша жыццё, але і прымушае расплачвацца за гэта добрым самаадчуваннем. Няма сэнсу запалохваць будучых матуль згубным уплывам камп'ютараў, мабільнікаў і г.д., і ўсё ж такі некалькі карысных парад даць можна.

Паводле слоў медсястры 23-й дзіцячай гарадской паліклінікі г. Мінска Ірыны ШАЎЦОВАЙ, перш за ўсё трэба дамовіцца са сваім начальствам аб установоўцы сучаснага, найбольш бяспечнага камп'ютара. Звядзіце час работы за ім, а значыць, час, калі падвяргаецеся электрамагнітнаму апраменьванню, да мінімуму. Гэта асабліва важна на пачатковай стадыі цяжарнасці. Памятайце, што сцвярджэнне абывацеляў аб бяспецы ноўтбукаў не адпавядае сапраўднасці. Ноўтбук хоць і ў меншай ступені, чым стацыянарны камп'ютар, але таксама генерыруе выпрамяненне. Надзвычай неразумна класці ноўтбук на калені, у непасрэднай блізкасці да жывата, і праводзіць за праглядам фільмаў ці праслухоўваннем музыкі па 2-3 гадзіны ў дзень. Куды больш карысна прысвяціць гэты час прагулкам у парку.

Успрымайце мабільны тэлефон як сродак экстраннай сувязі, карыстайцеся ім тады, калі сапраўды неабходна вырашыць важныя пытанні. Як паказвае практыка, шматгадзінныя размовы з сяброўкамі па мабільніку ў большасці выпадкаў пазбаўленыя рацыянальнага сэнсу. Пазбаўцеся шкоднай звычкі выкарыстоўваць мабільны тэлефон у якасці будзільніка, — паклаўшы яго на прыложкавую тумбачку. Даверце справу абуджэння нармальнаму будзільніку-гадзінніку. Медыкамі да канца не вывучана, наколькі небяспечны мабільны для плода, аднак Сусветная арганізацыя аховы здароўя рэкамендуе цяжарным звесці да мінімуму час выкарыстання гэтым дасягненнем тэхнікі.

ШАВЯЛЮРА ШТО ТРЭБА

Псіхолагі сцвярджаюць, што ў першыя дзесяць секунд знаёмства наш спадарожнік звяртае ўвагу не на тое, якой фірмы нашы боцікі/сумачка, а на тое, як выглядае наша галава. Размова ідзе, вядома ж, не пра наш інтэлектуальны патэнцыял, а аб стане прычоскі.

Бабулі мылі галаву звычайным мылам, мамы раслі ў эпоху шампуняў, а зараз да нашых паслуг — цэлы арсенал касметычных, гігіенічных і лекавых сродкаў па доглядзе за рознымі тыпамі валасоў. Для пачатку купіце сабе новую расчоску — драўляную, з шырокімі зубцамі. Імкніцеся рабіць няхітры масаж — штодня расчэсваць валасы па сто разоў у адзін і другі бок. Сур'ёзна стаўцеся да набыцця шампуню. Давярайце толькі вядомым фірмам, якія добра сябе зарэкамендавалі. Калі не хочаце губляць час на гатаванне масак для валасоў па старых бабуліных рэцэптах, карыстайцеся гатовымі. Іх можна набыць як у магазіне, так і ў аптэцы. Няхай прымяненне маскі хоць раз на тыдні стане вашай добрай звычкай. Імкніцеся звесці да мінімуму згубнае ўздзеянне фена на валасы. Перад сушкай старанна вытрыце іх рушніком, а пасля сушкі нанясіце яшчэ на вільготныя валасы кандыцыянер, які не трэба змываць.

Стан валасоў ва многім залежыць і ад харчавання. Абавязкова ўключыце ў рацыён аліўкавы алей, які ўтрымлівае тлустыя кіслоты амега-3 і амега-6, адказныя ў тым ліку за здаровы стан валасоў і пазногцяў. Калі ж вы вырашылі пахудзець, то рабіце гэта з розумам. Рэзкая страта вагі можа паслужыць прычынай сур'ёзных праблем са здароўем і прывесці да выпадзення валасоў.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Краіна здароўя

Выпуск № 48 (217)

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Хойніцкая атака

У Хойніцкім раёне штогод праходзяць футбольныя чэмпіянаты. І сёлетняя нядаўняя спаборніцтвы яшчэ раз паказалі, што гэты гульнявы від спорту надзвычай папулярны на палескай зямлі.

Карысна ведаць

Пры прастудзе ешце ківі

У свеце, напэўна, няма ніводнага чалавека, які хоць бы раз не пакутаваў ад банальнай прастуды. І ў кожнага з нас ёсць свае ўпадабаныя спосабы барацьбы з гэтай немаччу. Аднак пачынаць лячэнне трэба... з дыеты.

Медыкі лічаць, што падчас прастудных захворванняў трэба прытрымлівацца агульных правілаў: харчавацца часта, маленькімі порцыямі, аддаючы перавагу здробненым прадуктам. Пюрэ з агародніны, слізістыя кашы, супы і кісялі — ідэальная ежа для арганізма, які «акупавалі» хваробатворныя вірусы. А вось вострае, салёнае і смажанае лепш выключыць са штодзённага рацыёну. Усе гэтыя прадукты яшчэ больш раздражняюць запалёную слізістую верхніх дыхальных шляхоў і ўзмацняюць яе ацёк.

Прастуджанаму чалавеку трэба выпіваць як мага больш (не менш за 2 літры ў суткі) вадкасці, якая ўвільгатняе слізістую і змывае з яе рэшткі разбураных клетак, а таксама тыя таксічныя рэчывы, што выдзяляюць мікраарганізмы. Пры гэтым вельмі важна сачыць за тэмпературай вадкасці. Калі праявамі хваробы з'яўляюцца гарачка і насмарк, то варта аддаваць перавагу гарачаму пітву. Калі ж прастуда ўскладняецца пяршэннем і болем у горле, то да запалёнай слізістай трэба ставіцца вельмі асцярожна і не траўмаваць яе высокімі тэмпературамі. Гарачая вадкасць дзейнічае на горла, як наждак, выдаляючы паверхневыя слаі запалёнай слізістай. Таму пасля такой «цеплавой працэдуры» чалавек адчувае толькі часовую палёгку. Піць лепш цёплую вадкасць.

Пры хворым горле звярніце ўвагу і на кіслотнасць напояў, якія ўжываеце. Моцна кіслае асяроддзе садзейнічае размнажэнню мікраарганізмаў, таму ўсе напоі павінны быць шчолачнымі або мець нейтральны pH: простая вада, гарбата, какава, адвары лекавых раслін або ягадныя кампоты. А вось журавінавы морс, а таксама сокі з цытрусавых і ананаса пры болях у горле піць не рэкамендуецца. Адмоўцеся таксама і ад газаваных ліманадаў, якія вызначаюцца вялікай агрэсіўнасцю.

«Жывых» вітамінаў, безумоўна, больш за ўсё ўтрымліваецца ў свежай агародніне і садавіне, але, на жаль, не ўсе плады можна бязбоязна ўключаць у рацыён прастуджанага чалавека. Напрыклад, цытрусавыя, якія лічацца сапраўднай скарбніцай вітаміну С, маюць кіслую рэакцыю і раздражняюць слізістую. Мена-

віта таму апельсінамі, лімонамі і грэйпфрутамі хвораму лепш не злоўжываць. Іх можна замяніць на ківі, у якім утрымліваецца сутачная доза вітаміну С і вялікая колькасць пекціну.

Ні ў якім разе нельга злоўжываць і вінаградам. Рэч у тым, што яго сакавітыя ягады змяшчаюць шмат глюкозы, якая асядае на ротаглотцы, засцілаючы яе слізістую. А як вядома, бактэрыі вельмі любяць салодкае асяроддзе. Менавіта таму медыкі рэкамендуюць пасля любога з'едзенага ласунка паласкаць рот антысептычным растворам.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

НАРОДНЫЯ РЭЦЭПТЫ

- Цыбуля з яблыкамі і мёдам: надзярыце на дробнай тарцы роўную колькасць цыбулі і яблыка, змяшайце з такой жа колькасцю мёду. Прымайце па 2-3 ч. лыжкі 2-3 разы на дзень.
- Настой цыбулі ў малацэ. Надзёртую цыбуліну заліце 0,5 л гарачага малака, настойвайце ў цяпле 2 гадзіны. Выпіце адну шклянку гарачага настою на ноч, другую — раніцай.
- Маліны з мёдам — цудоўны патагонны сродак. Заварыце ў шклянцы 2 ст. лыжкі сухіх або 100 г свежых ягад маліны, праз 10—15 хвілін дадайце 1 ст. лыжку мёду і прымайце ў цёплым выглядзе па шклянцы 3 разы на дзень — і адразу ў ложак.
- Сродак ад кашлю для дзяцей (можна ўжываць, калі няма дыятэзу і алергіі на мёд): да 1 ч. лыжкі мёду дадайце 2 ст. лыжкі насення анісу і крыху солі. Усё гэта заліце шклянкай вады, давядзіце да кіпення, працадзіце. Прымаць цёплым, па 1 ч. лыжцы кожныя 2 гадзіны.
- Імбірная гарбата ад прастуды. Заварыце звычайную зялёную гарбату без дабавак. Дайце ёй пастаяць хвілін пяць. Нарэжце невялікі кавалачак (3-4 см) імбіру і заліце гатовай гарбатай у тэрмасе. Дадайце крыху мёду і чырвонага вострага перцу. Пры прастудных захворваннях добра падыходзіць імбірная гарбата з мёдам і лімонам, а пры кашлі можна дадаваць у гарбату гваздзіку або карыцу.

Медагляд

КАЛІ Ў ДЗІЦЯЦІ СКАЛІЁЗ...

Сёння скаліёз з'яўляецца самай распаўсюджанай артапедычнай праблемай сярод дзяцей. Як адзначае загадчыца аддзялення гігіены дзяцей і падлеткаў Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ала Малахава, штогод падчас прафілактычных аглядаў упершыню рэгіструецца парушэнне постаці ў 22.000 школьнікаў, а розныя ступені скаліёзу — у 10.000 дзяцей. Прычым скаліёз — тая хвароба, якой нельга перахварэць у дзяцінстве аднойчы і назаўсёды. Яна можа пакінуць пасля сябе такія наступствы, як ранняе зношванне пазваночніка, які будзе старэць і выходзіць са строю

Улічваючы актуальнасць праблемы, санітарна-эпідэміялагічная служба рэспублікі акцэнтуе асаблівую ўвагу на пытанні забяспечанасці школьных установ зручнай вучнёўскай мэбляй. Так, у пачатковых класах рэкамендавана выкарыстоўваць пераважна школьныя парты, а не сталы і крэслы. Работа за апошнімі не дысцыплінуе дзіця, і яно сядзіць як хоча, не шкадуючы свайго пазваночніка. Яшчэ прапаноўваецца забяспечыць класы канторкамі па тыпу трыбуны для выступлення са стальніцай. За ёй дзіця можа пісаць нават стоячы і рабіць гэта рэкамендуецца на працягу 15-20 мінут.

Як самім вызначыць наяўнасць скаліёзу

Папрасіце дзіця стаць да вас спінай і расслабіцца (няхай яно прыме звычную для яго позу паставы). Перш за ўсё вы павінны звярнуць увагу на наступныя асноўныя прыкметы скаліёзу:

- адно плячо крыху вышэй за другое;
- выпірае рог адной з лапатак;
- розная адлегласць ад прыціснутай да бока рукі да таліі;
- пры нахіленні наперад бачная крывізна пазваночніка.

Калі вы знайшлі хаця б адну з гэтых прыкмет, тэрмінова вядзіце дзіця на прыём да раённага артапеда або хірурга.

Асноўная задача пры лячэнні скаліёзу ў дзяцей — дабіцца зніжэння прамернай нагрузкі на пазваночнік пры адначасовым умацаванні мышцаў спіны і ўсяго тулава, што ў спалучэнні з ростам дзіцяці дазволіць выправіць скрыўленне (канкрэтную методыку лячэння менавіта для вашага дзіцяці дасць урач-артапед).

На што трэба звярнуць увагу самім бацькам

Забяспечце дзіцяці аблегчаны рэжым для яго пазваночніка.

Купіце артапедычны матрац, калі няма такой магчымасці, няхай спіць проста на цвёрдым ложку з плоскім ватным матрацам на роўным шчыце з невялікай падушкай. У школу дзіця павінна хадзіць з ранцам, а не з сумкай у адной руце. Падбярыце яму стол і крэсла для заняткаў дома (яны павінны адпавядаць росту дзіцяці, быць зручнымі і фізіялагічнымі).

Развівайце ў дзіцяці ўнутраную самадысцыпліну.

Яно павінна пастаянна само сачыць за сваёй постаццю (калі ідзе, стаіць, сядзіць, адпачывае). Дзіця павінна штодзень займацца лячэбнай фізкультурай (комплекс практыкаванняў падбяруць у фізкультурным дыспансэры, пажадана, каб дзіця адзаймалася там хоць бы некалькі тыдняў, засвоіла практыкаванні і прывыкла да неабходнасці пастаянных нагрузак).

Прайдзіце курс лячэння ў спецыялізаваным санаторыі.

Практычна немагчыма забяспечыць дзіцяці ў хатніх умовах патрэбны рэжым для выканання комплексу лячэбных працэдур (артапедычныя ўкладкі, масаж, фізіятэрапія, ЛФК...) Таму вельмі пажадана правесці курс лячэння ў санаторыі-інтэрнаце, для таго, каб зафіксаваць развіццё скаліёзу і даць імпульс для наступнага самастойнага лячэння.

Застаўце дзіця палюбіць спорт.

Сумныя і аднастайныя практыкаванні лячэбнай фізкультуры часта не даспадобы школьнікам. Часам значна прасцей і эфектыўней прыцягнуць дзіця да спорту; захапляльнага, яркага, які дадасць яму аўтарытэту ў вачах равеснікаў. Існуе даволі вялікая колькасць відаў спорту, рэкамендаваных для лячэння скаліёзаў і іншых хвароб пазваночніка, у асноўным гэта цыклічныя віды спорту з «сіметрычнай» нагрузкай. Толькі трэба імі сапраўды займацца. (пажадана з трэнерам), а не «адбываць нумар». Плаванне — самы лепшы від спорту пры скаліёзе і пры любым скрыўленні пазваночніка. Вада натуральным чынам разгружае пазваночнік, а нагрузкі павышаюць моц і трываласць мышцаў спіны, адначасова развіваючы і трэніруючы сардэчна-сасудзістую і дыхальную сістэму.

Не забывайцеся пра агульнаўмацавальныя мерапрыемствы.

Здаровае харчаванне — немалаважная дэталь. Бялкі, тлушчы, вугляводы, вітаміны і мінералы — усё гэта ў патрэбных прапорцыях і ў патрэбнай колькасці павінна быць у рацыёне дзіцяці.

Кантрасны душ — карысная танізуючая працэдура для мышцаў і сасудаў усяго арганізма.

Курэнне — вельмі шкодная звычка ўвогуле, а для хворых скаліёзам дзяцей асабліва: нікацін прымушае звужацца сасуды і капіляры, пагаршаючы кровазабеспячэнне ў тым ліку і мышачна-звязачнага апарату, а смолы замаруджваюць функцыі дыхання, якія і так могуць быць значна парушаныя.

Не рабіце неабдуманых крокаў.

У апошні час наша медыцына ўсё больш камерцыялізуецца і з'яўляецца мноства «спецыялістаў», гатовых лячыць скаліёз рознымі метадамі — ад мануальнай тэрапіі да курса спецыяльных ін'екцый у мышцы спіны. Будзьце вельмі асцярожнымі ў выбары падобных сяброў лячэння. Напрыклад, мануальная тэрапія ўвогуле вельмі адказны і траўманебяспечны метад, а ў руках шарлатана ці проста няўмелага ўрача здольная прывесці да трагедыі. Акрамя таго большасць артапедаў лічаць, што мануальная тэрапія проста шкодная пры скаліёзе.

Вольга ШАЎКО.

Далікатнае

ВАС НЕ СЛУХАЕЦЦА МАЧАВЫ ПУЗЫР?..

Многія людзі нават не звяртаюцца да ўрачоў з гэтай праблемай, лічачы нетрыманне мачы натуральнай праявай жыццядзейнасці арганізма. І дарэмна, бо амаль кожны, хто страчвае кантроль над уласным мачавым пузыром, пры жаданні можа значна аблегчыць сваё становішча. Неабходна адзначыць, што эфектыўнасць лячэння ў многім залежыць ад своечасовасці звароту па медыцынскую дапамогу. Чым раней распачатае лячэнне, тым лепшых вынікаў можна дасягнуць.

Нетрыманне — гэта стан, пры якім адбываецца міжвольнае падцяканне мачы. Найбольш часта такі стан назіраецца ў жанчын. Узнікае ён у выніку анатамічнага або функцыянальнага парушэння работы сфінктараў (кругавых мышцаў) мачавога пузыра і ўрэтры. Справакаваць яго могуць родавая траўма, цяжкая фізічная праца, гарманальныя ваганні (часцей за ўсё недахоп эстрагенаў). Узмацняюць нетрыманне мачы інфекцыі, запоры, а таксама пабочныя дзеянні некаторых медыкаментаў.

Вылучаюць два асноўныя віды нетрымання мачы:

стрэсавае нетрыманне — міжвольнае падцяканне мачы падчас кашлю, смеху, бегу і іншых фізічных дзеянняў, што прыводзяць да павышэння ўнутрыбрушнога і, значыць, унутрыпузырнага ціску. Характэрнай асаблівасцю стрэсавага нетрымання мачы з'яўляецца адсутнасць позыву на мочаспусканне;

ургентнае нетрыманне мачы характарызуецца міжвольным падцяканнем мачы, якое звязанае з непераадольным позывам на мочаспусканне. Такі позыў называюць «загадным» або «імператыўным». Хворыя скардзяцца, што не паспяваюць дабегчы да прыбіральні пры ўзнікненні позыву. Ургентнае нетрыманне можа правакавацца знешнімі фактарамі. Часцей за ўсё ў якасці правакуючых раздражняльнікаў выступаюць гук струменю вады, мыццё рук, нервовае ўзбуджэнне і г.д. Большасць хворых адзначаюць павелічэнне эпізодаў нетрымання мачы ў халоднаю пару года.

Акрамя гігіенічных нязручнасцяў (вільготнасць, непрыемны пах, раздражненне скуры), нетрыманне выклікае і псіхалагічныя праблемы, аж да дэпрэсіі. Нярэдка наступствам з'яўляецца зніжэнне сацыяльнай актыўнасці або нават асуджэнне сябе на поўную ізаляцыю.

У цяперашні час існуе тры асноўныя метады лячэння нетрымання мачы: немедыкаментозны, медыкаментозны і хірургічны. Для кожнага з іх ёсць пэўныя паказанні, і выбар аптымальнага падыходу да лячэння канкрэтнага хворага з нетрыманнем мачы ажыццяўляе ўрач пасля стараннага абследавання пацыента. Хірургічнае лячэнне прымяняецца пры беспаспяховасці кансерватыўнай тэрапіі.

Кансерватыўнае лячэнне ўключае дыету, лячэбную гімнастыку, прыём лякарстваў, фізіятэрапію. Вялікую ролю ў барацьбе з нетрыманнем мачы адыгрывае і псіхатэрапія, бо ў стане нервовага напружання сімптомы хваробы абвастраюцца.

Прафілактыка гэтай немачы заключаецца, перш за ўсё, у беражлівых адносінах да свайго здароўя. Вось некаторыя рэкамендацыі спецыялістаў:

— адмоўцеся ад курэння, паколькі нікацін раздражняе мачавы пузыр, а кашаль, звязаны з курэннем, можа выклікаць міжвольнае нетрыманне мачы;

— пазбягайце пад'ёму цяжараў, што прыводзіць да дэфармацыі падтрымліваючых тазавых тканак;

— сачыце за масай цела: лішняя вага стварае дадатковую нагрузку на мачавы пузыр;

— своечасова лячыце інфекцыйна-запаленчыя захворванні мочапалавых органаў;

— прывучыце сябе цалкам апаражняць мачавы пузыр і старайцеся ніколі не даводзіць да яго моцнага напаўнення;

— рэгулярна апаражняйце кішэчнік, бо запоры могуць прывесці да парушэння кантролю за мышцамі мачавога пузыра;

— раскажыце свайму доктару пра лекавыя сродкі, якія вы прымаеце: многія прэпараты (мачагонныя, антыдэпрэсанты, антыгістамінныя лекі, некаторыя сродкі для лячэння гіпертаніі) правакуюць частае мочаспусканне і/або садзейнічаюць такому расслабленню мышцаў малога таза, што чалавек перастае кантраляваць свой мачавы пузыр;

— выключыце з харчовага рацыёну прадукты, якія аказваюць раздражняльнае дзеянне на мачавы пузыр: алкаголь, газаваныя напоі (пепсі, кола і інш.), каву, гарбату, цытрусавыя, памідоры, вострыя стравы, цукар, мёд, шакалад, штучныя заменнікі цукру;

— змяніце пітны рэжым. Многім здаецца, што калі абмежаваць ужыванне вадкасці, то і праблемы не будзе. Але гэта не так. Пры недахопе вады мача становіцца такой канцэнтраванай, што пачынае раздражняць мачавы пузыр і прыводзіць да пастаяннай патрэбы неадкладна бегчы ў прыбіральню. Каб гэтага не адбывалася, піце неабходны мінімум — 1,5—2 л у дзень, але не ўжывайце шмат вадкасці перад сном;

— пазбягайце каляровых або араматызаваных прадметаў асабістай гігіены, хімічных напаўняльнікаў для ваннаў, а таксама араматызаваных гатункаў мыла і туалетнай паперы;

— больш рухайцеся: займіцеся плаваннем, танцамі, ездзіце на веласіпедзе, рабіце ранішнюю гімнастыку;

— абавязкова асвойце практыкаванне Кегеля для трэніроўкі мышцаў тазавага дна.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

Комплекс лячэбнай гімнастыкі

1. Седзячы на падлозе (ногі сагнутыя ў каленях, рукі ва ўпоры ззаду) развядзіце калені, стараючыся дакрануцца да падлогі, а затым звядзіце. Тэмп сярэдні. Дыханне вольнае. Паўтарыць 4—12 разоў.

2. Лежачы на баку (спачатку на левым, затым на правым), на выдыху падцягніце ногі, сагнутыя ў каленях, да грудзей, дапамагаючы рукамі, на ўдыху вярніцеся ў зыходнае становішча. Паўтарыць 3—5 разоў.

3. Паміж каленямі змясціце мяч. Максімальна сціскайце мяч каленямі з адначасовым скарачэннем мышцаў прамежнасці і ягадзіц на працягу 3—10 секунд, затым вярніцеся ў зыходнае становішча і расслабцеся. Паўтарыць 3—12 разоў.

4. Стоячы (ногі на шырыні ступні, рукі апушчаныя) выканайце спружыністыя прысяданні, адначасова адводзячы максімальна назад прамыя рукі і напружваючы мышцы прамежнасці і ягадзіц. Паўтарыць 3—8 разоў.

ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО» (организатор аукциона)
25 октября 2010 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5
проводит **аукцион с применением метода понижения начальной цены**
по продаже находящихся в **республиканской собственности** объектов
и права заключения договоров аренды земельных участков, необходимых
для их обслуживания, которые составляют единые предметы аукциона

	Сведения о предметах аукциона	Начальная цена предмета аукциона, руб.	Минимальная цена предмета аукциона, руб.
Лот № 1	**Капитальное строение (инв. № 640/С-21364) и право заключения договора аренды земельного участка, необходимого для его обслуживания.** Здание клуба с холодной пристройкой, подвалом, общей площадью 888,3 кв.м, двухэтажное, фундамент бутобетонный, стены кирпичные, деревянные, перегородки кирпичные, перекрытия: чердачные – железобетонные и деревянные, междуэтажные и подвальные – железобетонные, крыша шиферная. Подведены инженерные коммуникации. Здание клуба 1933 года постройки, холодная пристройка и подвал – 1971 года постройки. Объект расположен по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. Социалистическая, д. 133, на земельном участке площадью 0,2389 га, назначение: земельный участок для обслуживания и эксплуатации строения клуба с холодной пристройкой. Введено ограничение в использовании земельного участка в связи с его расположением в охранной зоне канализационных коллекторов. Срок аренды земельного участка 40 лет.	183 923 900	66 253 860
Лот № 2	**Капитальное строение (инв. № 640/С-21366) и право заключения договора аренды земельного участка, необходимого для его обслуживания.** Здание учебного корпуса общей площадью 1131,8 кв.м, 1933 года постройки, двухэтажное, фундамент бутобетонный, стены и перегородки кирпичные, перекрытия чердачные и междуэтажные железобетонные, крыша совмещенная. Подведены инженерные коммуникации. Объект расположен по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. Социалистическая, д. 133, на земельном участке площадью 0,4457 га, назначение: земельный участок неустановленного назначения. Срок аренды земельного участка 38 лет.	324 116 043	117 493 473

Продавец объектов республиканской собственности: производственное республиканское унитарное предприятие «1993-я центральная инженерная ремонтная база» (Минская область, г. Слуцк, ул. Социалистическая, д. 133, тел. (8 01795) 48242, 42805). **Арендодатель земельных участков:** Слуцкий районный исполнительный комитет (Минская область, г. Слуцк, ул. Ленина, д. 189).

Задаток для участия в аукционе в размере 25 000 000 рублей перечисляется в срок по 21 октября 2010 года включительно на расчетный счет **№ 3642900000841** в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНП 100128686, получатель платежа – фонд «Минскоблгосимущество». Назначение платежа: задаток для участия в аукционе.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются организатором аукциона ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 312, тел. 224 39 76, 500 47 10. Начало приема заявлений 21 сентября 2010 г. Окончание приема заявлений 21 октября 2010 г. до 17.00.

Возможность ознакомления с объектами республиканской собственности обеспечивает продавец в срок по 21 октября 2010 г. Фотографии продаваемых объектов, а также информация о предметах аукциона дополнительно размещаются на сайте Минского облисполкома: **www. minsk-region.gov.by** на странице фонда «Минскоблгосимущество» в разделах «Власть», «Управления и комитеты облисполкома».

Лицо, желающее принять участие в аукционе, не позднее срока, указанного в извещении о проведении аукциона:

уплачивает задаток, размер которого указывается в извещении о проведении аукциона, путем перечисления денежных средств на текущий (расчетный) счет организатора аукциона. Внесение задатка дает право на участие в аукционе по всем выставляемым на аукцион объектам;

подает организатору аукциона заявление на участие в аукционе с приложением указанных ниже документов;

заключает с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе юридических или физических лиц, в том числе индивидуальных предпринимателей, прилагаются к заявлению, подаваемому:

юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь: копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица; заверенная банком копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона; представителем юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; заверенная банком копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона; представителем юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

индивидуальным предпринимателем: документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; заверенная банком копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона; представителем индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом, – заверенная банком копия платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона; документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – нотариально заверенная доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Продавец, организатор аукциона не имеют права требовать информацию о намерениях приобретения того или иного объекта республиканской собственности.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи объектов республиканской собственности на аукционах с применением метода понижения начальной цены, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 8 августа 2009 г. № 1049 «О мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 7 мая 2009 г. № 238».

При наличии двух участников аукциона и более, желающих приобрести предмет аукциона по начальной цене, аукционист повышает начальную цену в соответствии с шагом аукциона и называет номер участника аукциона, который первым поднял аукционный номер. Затем аукционист в соответствии с шагом аукциона объявляет новую цену. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет новую цену предмета аукциона и номер этого участника аукциона трижды и объявляет его победителем аукциона. Если после объявления аукционистом начальной цены предмета аукциона аукционный номер поднял только один участник аукциона, то аукционист называет номер такого участника аукциона трижды и объявляет его победителем аукциона. Если после объявления начальной цены предмета аукциона ни один из участников аукциона не поднял свой номер, аукционист понижает начальную цену в соответствии с шагом аукциона, объявляя новую цену. Начальная цена понижается в соответствии с объявленным шагом до момента, когда один из участников аукциона согласится приобрести предмет аукциона по объявленной аукционистом цене, но не ниже минимальной. Если после очередного понижения начальной цены предмета аукциона одновременно подняли свои номера два участника аукциона и более, в результате чего победителя определить невозможно, комиссия (организатор аукциона) принимает решение о снятии предмета аукциона с аукциона. По завершении аукциона по каждому отдельно взятому предмету аукциона аукционист объявляет о продаже данного предмета аукциона, трижды называя цену, по которой продан предмет аукциона, и номер участника аукциона, ставшего победителем аукциона. При отсутствии участников аукциона, готовых купить предмет аукциона по минимальной цене, аукционист называет эту цену трижды, после чего данный предмет аукциона снимается с аукциона. В случае признания аукциона несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается такому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Задаток, внесенный победителем аукциона (претендентом на покупку), учитывается при окончательных расчетах за объект республиканской собственности по договору купли-продажи и за право заключения договора аренды земельного участка. Если имеет место превышение задатка, внесенного победителем аукциона (претендентом на покупку), над ценой продажи предмета аукциона, сумма превышения подлежит возврату в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала проведения аукциона по каждому предмету аукциона, выставляемому на аукцион. Фонд «Минскоблгосимущество» имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: Подписать протокол о результатах аукциона; обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, а также внести в соответствующий местный бюджет плату за право заключения договора аренды земельного участка (в случае предоставления рассрочки ее внесения соответствующим местным исполнительным комитетом – часть платы), выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка, в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка; после совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, заключить в установленном порядке с Продавцом договор купли-продажи объекта республиканской собственности, а с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

ДЕПАРТАМЕНТ
ПО ЦЕННЫМ БУМАГАМ
Министерства финансов
Республики Беларусь
ЗАВЕРЕНО
«16» августа 2010 г.
_____ Гальперин А.Л.

белагропромбанк
традиции будущего

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

об открытой продаже облигаций открытого акционерного общества «Белагропромбанк» для физических лиц семьдесят седьмого, семьдесят восьмого, семьдесят девятого, восьмидесятого, восемьдесят первого, восемьдесят второго выпусков

1. Наименование эмитента
открытое акционерное общество «Белагропромбанк» (ОАО «Белагропромбанк»)
адкрытае акцыянернае таварыства «Белаграпрамбанк» (ААТ «Белаграпрамбанк»).

2. Место нахождения Банка, телефон, факс, электронный адрес (e-mail)
Местонахождение Банка: 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3
Телефон: (017) 229 63 26, факс (017) 229 64 43
Электронный адрес E-mail: info@belapb.by
УНП 100693551, ОКПО 00040577.

3. Наименование периодического печатного издания, в котором будет публиковаться бухгалтерский баланс, отчет о прибыли и убытках, и сроки их публикации
Бухгалтерский баланс и отчет о прибыли и убытках Банка ежегодно будет публиковаться в газете «Звязда» не позднее 25 апреля года, следующего за отчетным.
Бухгалтерский баланс на 1 января 2010 года и отчет о прибыли и убытках за 2009 год опубликованы Банком 30.03.2010 в газетах «Звязда» и «Рэспубліка».

4. Размер уставного фонда Банка
Уставный фонд Банка составляет 4 003 635 046 000 бел. рублей (Четыре триллиона три миллиарда шестьсот тридцать пять миллионов сорок шесть тысяч) белорусских рублей.

5. Дата, номер государственной регистрации Банка и наименование органа, его зарегистрировавшего
Банк преобразован из Белорусского республиканского банка Агропромбанк СССР учредительной конференцией 11.02.1991 и зарегистрировано Национальным банком Республики Беларусь 03.09.1991, регистрационный № 20. Устав Банка утвержден общим собранием акционеров 11.02.1991 (протокол №1).
Банк в своей деятельности руководствуется законодательством Республики Беларусь, международными договорами Республики Беларусь, локальными нормативными правовыми актами Банка, а также Уставом Банка.

6. Сведения о проведении открытой продажи облигаций семьдесят седьмого, семьдесят восьмого, семьдесят девятого, восьмидесятого, восемьдесят первого, восемьдесят второго выпусков

6.1. Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего это решение
Решения о выпуске облигаций семьдесят седьмого, семьдесят восьмого, семьдесят девятого, восьмидесятого, восемьдесят первого, восемьдесят второго выпусков для физических лиц на предъявителя в соответствии с Уставом Банка утверждены Наблюдательным советом Банка 03.08.2010, протокол № 23.

6.2. Форма выпуска и вид облигаций, объем эмиссии, количество, номинальная стоимость облигаций

№ выпуска	77	78	79	80	81	82
Валюта займа	Доллар США	Евро	Доллар США	Евро	Доллар США	Бел. рубль
Форма выпуска и вид облигации	Документарные, на предъявителя, процентные, неконвертируемые					
Объем эмиссии	$8 млн.	€3 млн.	$10 млн.	€9 млн.	$15 млн.	Br10 млрд.
Количество облигаций (шт.)	1600	600	20000	18000	15000	20000
Серия, номера облигаций	ОД77 000001-016000	ОЕ78 000001-000600	ОД79 000001-020000	ОЕ80 000001-018000	ОД81 000001-015000	ОБ82 000001-020000
Номинальная стоимость	$5000	€5000	$500	€500	$1000	Br500000

6.3. Цель выпуска облигаций
Выпуск облигаций Банка осуществляется в целях привлечения временно свободных денежных средств физических лиц для финансирования реального сектора экономики.

6.4. Сведения об обеспечении исполнения обязательств по облигациям
Выпуск облигаций осуществляется без обеспечения по согласованию с Национальным банком Республики Беларусь при условии, что общий размер обязательств по таким облигациям не превышает 80 процентов нормативного капитала Банка (подпункт 1.8 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28.04.2006 № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг»).
По состоянию на 01.07.2010 нормативный капитал Банка составляет 4 566 831,5 млн. бел. рублей.

6.5. Выпуск облигаций согласован Национальным банком Республики Беларусь (постановление Правления Национального банка Республики Беларусь от 12.08.2010 № 343).

6.6. Период проведения открытой продажи облигаций
Продажа (первичное размещение) облигаций осуществляется с 04.10.2010 по 03.10.2011 включительно, если больший срок не будет определен Правлением Банка. Срок открытой продажи облигаций может быть сокращен в случае полной реализации всего объема эмиссии облигаций.

6.7. Место и время проведения открытой продажи облигаций
Первичное размещение (продажа) облигаций Банка производится после согласования с Национальным Банком Республики Беларусь выпуска облигаций, регистрации в Департаменте по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь выпуска облигаций, опубликования заверенной Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь краткой информации об открытой продаже облигаций семьдесят седьмого, семьдесят восьмого, семьдесят девятого, восьмидесятого, восемьдесят первого, восемьдесят второго выпусков.
Первичное размещение облигаций осуществляется путем открытой продажи в филиалах, отделениях, расчетно-кассовых центрах, а также ОПЕРУ центрального аппарата Банка в течение их рабочего времени.
Владельцами облигаций могут быть только физические лица – резиденты и нерезиденты, приобретающие их не в целях предпринимательской деятельности.

6.8. Срок обращения облигаций – 548 календарных дней с 04.10.2010 по 04.04.2012. День начала размещения облигаций и день начала погашения облигаций считаются одним днем.

6.9. Дата начала погашения облигаций – 04.04.2012.

6.10. Порядок определения размера дохода по облигациям, условия его выплаты
Выплата дохода по облигации производится 1 раз в 6 месяцев в виде процентного дохода при условии предъявления физическим лицом оригинала облигации в Банк в следующие даты:
за первый период начисления дохода – 04.04.2011;
за второй период начисления дохода – 04.10.2011;
за третий период начисления дохода – 04.04.2012.
Начисление процентного дохода осуществляется со дня, следующего за днем размещения соответствующей облигации, по 04.04.2012 включительно. Со дня истечения срока обращения облигаций процентный доход не начисляется.
Процентный доход по облигации начисляется со дня, следующего за днем ее продажи Банком, по день начала выплаты процентного дохода за период начисления дохода, в котором была продана облигация, включительно. Последующие процентные доходы (включая последний) начисляются со дня, следующего за днем начала выплаты дохода за предшествующий период начисления дохода, по день начала выплаты процентного дохода по данному периоду начисления дохода включительно (дату начала погашения – 04.04.2012).
Расчет процентного дохода по семьдесят седьмому, семьдесят восьмому, семьдесят девятому, восьмидесятому, восемьдесят первому выпускам облигаций производится путем его начисления на номинал облигации за период начисления дохода по процентной ставке равной 8,0 (Восемь) процентов годовых.
Расчет процентного дохода осуществляется по следующей формуле:

$$Д = \frac{Н \times П \times Т365\ (Т366)}{100 \times 365\ (366)}$$

где:
Д – процентный доход по процентным облигациям, выплачиваемый периодически в течение срока их обращения;
Н – номинальная стоимость облигации;
П – ставка дохода (8,0% годовых) за соответствующий период начисления процентного дохода;
Т365 (Т366) – количество дней периода начисления дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 (366) дней.
Расчет процентного дохода по восемьдесят второму выпуску облигаций производится путем его начисления на номинал облигации за период начисления дохода по процентной ставке, равной ставке рефинансирования Национального Банка Республики Беларусь с учетом ее изменения плюс 7,0 (Семь) процентных пунктов.
Расчет процентного дохода осуществляется по следующей формуле:

$$Д = (П1*Н*Т1 + П2*Н*Т2 + \ldots. + Пn*Н*Тn) / (365\ (366)*100),$$

где:
Д – процентный доход;
П1, П2, Пn – ставка процентного дохода (процентов годовых) за соответствующую часть периода начисления дохода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной, равная действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь плюс 7,0 (Семь) процентных пунктов;
Н – номинальная стоимость облигации;
Т1, Т2, Тn – количество дней соответствующей части периода начисления дохода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной. При этом сумма Т1 + Т2 +….+ Тn должна быть равна количеству дней в соответствующем периоде начисления дохода.

При начислении процентного дохода принимается точное количество дней в году (365 или 366 в високосном году).
День размещения облигации и день выплаты процентного дохода за период начисления дохода, в котором была продана облигация, считаются одним днем. День выплаты дохода за предшествующий период начисления процентного дохода и день выплаты дохода за текущий период начисления дохода (дата погашения) считаются одним днем.
Выплата процентного дохода по облигации осуществляется филиалами, отделениями, расчетно-кассовыми центрами, а также ОПЕРУ центрального аппарата Банка в течение их рабочего времени. В случае, если день начала выплаты процентного дохода выпадает на нерабочий день, выплата процентного дохода осуществляется, начиная с первого рабочего дня, следующего за нерабочим днем. Выплата части процентного дохода не производится.

6.11. Условия и порядок досрочного погашения облигаций
Владельцы облигаций могут предъявить их к досрочному погашению по истечении 180 дней после даты приобретения. Выплата процентного дохода осуществляется за полностью истекшие периоды начисления дохода.

6.12. Порядок погашения облигаций
Облигации предоставляют своим владельцам право на получение номинальной стоимости облигаций при их погашении в денежных единицах, в которых выражена их номинальная стоимость.
Облигация погашается по требованию ее владельца при предъявлении оригинала облигации в Банк независимо от сроков обращения владельца облигации. Дата начала погашения облигации – 04.04.2012.
При погашении облигации владельцу выплачивается номинальная стоимость облигации наличными деньгами либо в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

6.13. Условия и порядок возврата средств инвесторам при запрете выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь
В случае запрета Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь выпуска облигаций Банк в месячный срок с момента получения уведомления о запрещении выпуска ценных бумаг возвращает владельцам облигаций денежные средства, полученные в оплату размещенных ценных бумаг.

6.14. Дата и номер государственной регистрации облигаций
Облигации зарегистрированы Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 16.08.2010.
Регистрационный номер:
Семьдесят седьмого выпуска: 5-200-02-0722
Семьдесят восьмого выпуска: 5-200-02-0723
Семьдесят девятого выпуска: 5-200-02-0724
Восьмидесятого выпуска: 5-200-02-0725
Восемьдесят первого выпуска: 5-200-02-0726
Восемьдесят второго выпуска: 5-200-02-0727.

7. Место, время и способ ознакомления с более подробной информацией (проспектом эмиссии облигаций)
С более подробной информацией (проспектом эмиссии облигаций) можно ознакомиться в филиалах, отделениях, расчетно-кассовых центрах, а также ОПЕРУ центрального аппарата Банка в течение их рабочего времени.
Адреса филиалов Банка и телефоны, по которым можно получить справку о продаже облигаций:
г. Брест, ул. Воровского, 11, тел. (8-0162) 27-05-00, 27-05-54,
г. Витебск, ул. Димитрова, 31, тел. (8-0212) 35-00-62, 37-05-23,
г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, тел. (8-0232) 79-26-49, 79-26-98,
г. Гродно, ул. Советских Пограничников, 110, тел. (8-0152) 52-64-76,
г. Могилев, пр-т Мира, 55, тел. (8-0222) 29-38-00, 29-38-01,
г. Минск, пр-т Победителей, 91, тел. (8-017) 209-77-67, 209-77-69,
г. Минск, ул. Ольшевского, 24, тел. (8-017) 228-57-19, 229-65-29,
г. Минск, пр-т Жукова, 3, тел. (8-017) 218-58-35, 218-58-37.

Заместитель Председателя Правления ОАО «Белагропромбанк» **С.П. Чугай**

Главный бухгалтер ОАО «Белагропромбанк» **М.А. Шаповалова**

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136
время работы Контакт-Центра Банка
8.00–20.00 – рабочие дни
8.00–18.00 – выходные и праздничные дни
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), Velcom, МТС) – по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

Кватэрнае пытанне

ЦЁТКА — СВАЯЧКА, АЛЕ НЕ ТАКАЯ

Мы ўступілі ў ЖБК, на будаўніцтва кватэры плануем скарыстаць чэкі «Жыллё». Нам іх падарылі мужавы бацькі і бабуля з дзедам. Не супраць аддаць свае чэкі і яго цётка. Але кажуць, што імі нельга пагашаць запазычанасць па крэдыце. Ці так гэта?
А. Карпюк, *г. Брэст.*

Перш за ўсё, неабходна адзначыць, што пасля 1 студзеня 2006 г. знаходзяцца ў абарачэнні і выкарыстоўваюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам толькі перарэгістраваныя чэкі «Жыллё».

Падпунктам 1.13 Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 чэрвеня 2005 г. № 6 вызначана, што грамадзяне і члены іх сем'яў, якія знаходзяцца на ўліку асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў, маюць права на індэксацыю чэкаў «Жыллё» для выплаты паявога ўзносу ў жыллёвым або жыллёва-будаўнічым кааператыве альбо пагашэння крэдыту (пазыкі), узятага на гэтае будаўніцтва, фінансавання індывідуальнага або калектыўнага жыллёвага будаўніцтва, рэканструкцыі аднакватэрных, блакіраваных жылых дамоў, долевага ўдзелу ў жыллёвым будаўніцтве, набыцця жылля шляхам пакупкі, а таксама для пагашэння запазычанасці па крэдытах банкаў і пазыках юрыдычных асобаў, якія ўзятыя і выкарыстаныя на названыя мэты.

Грамадзяне маюць права на індэксацыю чэкаў «Жыллё» як налічаных у вызначаным парадку непасрэдна ім, так і атрыманых у выніку дарэння ад мужа (жонкі), бацькоў, дзяцей, усынавіцеляў, усыноўленых, родных братоў і сясцёр, дзеда, бабкі, унукаў (чэкаў, налічаных дарыльшчыку ў вызначаным парадку), атрыманых у спадчыну альбо па рашэнні суда.

Такім чынам, чэкі «Жыллё», падараныя цёткай (або перадараныя), не могуць быць выкарыстаныя пры пагашэнні запазычанасці па крэдыце.

Асноўны напрамак выкарыстання перарэгістраваных чэкаў «Жыллё» — прыватызацыя займаемых жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду.

У выпадку, калі ўладальнік перарэгістраваных чэкаў «Жыллё» не мае патрэбы ў прыватызацыі займаемага жылога памяшкання (або яно не падлягае прыватызацыі), а таксама ў індэксацыі чэкаў (або не мае права на іх індэксацыю, паколькі не знаходзіцца на ўліку асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў) для выкарыстання іх у вышэйзгаданых мэтах, то ён можа падарыць іх па натарыяльна засведчаным дагаворы вышэйпералічаным блізкім сваякам. Гэтыя сваякі, у сваю чаргу, могуць выкарыстаць у вызначаным парадку падараныя чэкі «Жыллё» для прыватызацыі займаемых імі жылых памяшканняў у дамах дзяржаўнага жыллёвага фонду альбо для паляпшэння сваіх жыллёвых умоў (калі яны знаходзяцца на законных падставах на кватэрным уліку).

КАЛІ ПРАВА САПРАЎДЫ БЫЛО

З 1998 года мы стаялі ў чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў, пабудавалі двухпакаёвую кватэру. І толькі пасля таго, як дом здалі, даведаліся, што маглі атрымаць субсідыю. Нам пра гэта ніхто нічога не сказаў... І не можа патлумачыць цяпер.
А.М., *Ляхавіцкі раён.*

Па агульным правіле маламаёмныя працаздольныя грамадзяне, якія знаходзяцца на ўліку асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў, маюць права на атрыманне (па іх выбары) у парадку чарговасці (зыходзячы з часу прыняцця грамадзян на ўлік асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў) альбо аднаразовай бязвыплатнай субсідыі, альбо льготнага крэдыту на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў.

Умовы і парадак выдзялення аднаразовых бязвыплатных субсідый на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў вызначаны Палажэннем, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 30 красавіка 2002 г. № 555.

Па-за чаргой субсідыя можа быць выдзелена некаторым ільготным катэгорыям грамадзян (напрыклад, шматдзетным сем'ям, грамадзянам, якія захварэлі і перанеслі прамянёвую хваробу, грамадзянам, у складзе сем'яў якіх маюцца дзеці-інваліды, а таксама інвалідаў з дзяцінства I і II групы і інш.).

Грамадзянам, якія маюць у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі права на пазачарговае атрыманне жылых памяшканняў сацыяльнага карыстання, субсідыі выдзяляюцца ў парадку чарговасці, вызначаным для адпаведных катэгорый грамадзян, зыходзячы з часу прыняцця іх на ўлік асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў.

Асобныя катэгорыі грамадзян (у прыватнасці, маладыя сем'і, а таксама грамадзяне, якія пражываюць і працуюць у сельскай мясцовасці, і інш.) маюць права на суменсае выкарыстанне льготнага крэдыту і аднаразовай субсідыі (але таксама па чарзе).

Субсідыя павінна быць выкарыстана яе ўладальнікам на працягу тэрміну будаўніцтва жылога памяшкання. Аднак, калі права на яе было...

Спрэчкі, якія ўзнікаюць пры выдзяленні (або не выдзяленні...) субсідыі, разглядаюцца вышэйстаячым мясцовым выканаўчым і распарадчым органам альбо судом у вызначаным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь парадку.
Віктар САВІЦКІ.

ЗА ВЫКАРЫСТАННЕ МЕТАЛІЧНЫХ СЕТАК НА РЭГІСТРАЦЫЙНЫХ ЗНАКАХ АЎТАМАБІЛЯ ВАДЗІЦЕЛЯМ ПАГРАЖАЕ ШТРАФ ДА 70 ТЫС. РУБЛЁЎ

Штраф у памеры да дзвюх базавых велічыняў (70 тыс. рублёў) пагражае тым аўтамабілістам, якія выкарыстоўваюць на рэгістрацыйных знаках машын металічныя сеткі і іншую засцярогу ад камер фота- і відэафіксацыі парушэнняў Правілаў дарожнага руху (ПДР).

Як паведаміла **старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе аддзела ДАІ Ленінскага РУУС Таццяна КРАСІЙ**, апошнім часам у сталіцы сталі часцей заўважаць аўтамабілі з сеткамі на нумарных знаках. Між тым, як абазначана ў дзяржаўным стандарце Рэспублікі Беларусь СТБ 914-99 «Знакі рэгістрацыйныя і знак распазнавальны транспартных сродкаў. Тыпы і асноўныя памеры, тэхнічныя патрабаванні, метады выпрабаванняў», «...не дапускаецца закрываць знак арганічным шклом або іншымі матэрыяламі». Згодна з ПДР, забараняецца ўдзел у дарожным руху транспартных сродкаў, рэгістрацыйныя знакі якіх не адпавядаюць патрабаванням тэхнічных нарматыўных прававых актаў. Вадзіцелю забараняецца ўдзельнічаць у дарожным руху на транспартным сродку з забруджваннямі (наслаеннямі), якія не дазваляюць бачыць інфармацыю на рэгістрацыйным знаку з адлегласці 40 м і менш.

— Вадзіцелям рэкамендуем зняць з нумарных знакаў аўтамабіляў сеткі, плёнкі і іншую засцярогу, здольную пагоршыць чытальнасць інфармацыі, якая вельмі важная пры вышуку парушальнікаў, што зніклі з месца здарэння. Па стандарце для ўмацоўвання рэгістрацыйных знакаў могуць прымяняцца балты або шрубы. Дапускаецца мацаванне знакаў з дапамогай рамак. Усе гэтыя прыстасаванні не павінны загароджваць або скажаць выяву сімвала Рэспублікі Беларусь, лічбы, літары або акантоўку, якія маюцца на знаку, — адзначыла Т. Красій.
Ігар ГОЛАД, «Мінск—Навіны».

КАМІТЭТАМ ДЗЯРЖКАНТРОЛЮ СПЫНЕНА ДЗЕЙНАСЦЬ ЗЛАЧЫННАЙ ГРУПЫ, ЯКАЯ АТРЫМАЛА НЕЗАКОННЫ ДАХОД НА СУМУ БОЛЬШ ЗА 50 МЛРД РУБЛЁЎ

Дэпартаментам фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю (КДК) заведзена крымінальная справа ў дачыненні да арганізатараў і членаў злачыннай групы, якая ажыццяўляла незаконныя фінансавыя аперацыі з выкарыстаннем рэквізітаў, пячатак і разліковых рахункаў падкантрольных ім камерцыйных структур. Арыштаваныя ўжо чатыры актыўныя ўдзельнікі гэтай групы. Яны абвінавачваюцца ў тым, што займаліся незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасцю. Падчас вобыскаў канфіскавана больш за 80 тыс. долараў ЗША, а таксама пячаткі і бланкі, з дапамогай якіх выраблялісе падложныя дакументы. На рахунках структур, падкантрольных гэтым грамадзянам, арыштавана звыш 600 млн рублёў, таксама накладзены арышт на 3 дарагія аўтамабілі.

Як паведамілі ў КДК, злачынная група дзейнічала на працягу некалькіх гадоў. Толькі за 2 апошнія гады даход, атрыманы яе арганізатарамі ад незаконнай дзейнасці, склаў не менш як 50 млрд рублёў. Ужо вядома, што клієнтамі злачыннай групы з'яўляліся больш як 100 суб'ектаў гаспадарання, якім трэба было легалізаваць набытую або рэалізаваную за наяўны разлік прадукцыю. Як правіла, падчас звароту суб'ектаў гаспадарання зламыснікі забяспечвалі іх падложнымі фінансавымі дакументамі, з якіх вынікала, што тавар набыты ў адной з падкантрольных ім ілжэпрадпрымальніцкіх структур. За гэта арганізатары і члены злачыннай групы мелі працэнт ад фінансавых аперацый, праведзеных кліентамі. Яны таксама атрымлівалі даход ад розніцы курсаў замежных валют, устанаўліваючы пры правядзенні фінансавых аперацый больш высокі курс.
Андрэй ПЯТРОЎ, «Мінск—Навіны».

Едучы на заняткі фізкультурай, праз акно трамвая назіраю за навакольлем. Углядаюся ў твары мінакоў, спрабую здагадацца, хто з іх куды накіроўваецца, у якім настроі, пра што думае. Цікава будаваць здагадкі. Сюжэты ў тваёй галаве складаюцца ў цэлыя жыццёвыя гісторыі. Магчыма, неверагодныя, а магчыма, некаторыя з іх і сапраўды маюць месца ў жыцці.

СУСТРЭЧЫ ПРАЗ ТРАМВАЙНУЮ ШЫБУ

СУСТРЭЧЫ, ЯКІЯ БУДЗЯЦЬ УСПАМІНЫ

Мае фантазіі перапыняе адзін твар, убачаны праз транспартную шыбу. Знаёмы твар. Дзе я яго бачыла? Не магу ўзгадаць. Усе думкі цяпер канцэнтруюцца на ўспамінах. Перагортваю адну за другой старонкі памяці. Не, не тое... Ах, вось яно што! Анжэла Канстанцінаўна! Мы сустракаліся з ёй кожнае лета на адным цікавым мерапрыемстве, якое ладзіла іх арганізацыя. А мы, сваёй арганізацыяй, на месцы здымалі дакументальны фільм. Анжэла Канстанцінаўна была сярод тых, хто камандуе, таму непасрэдных спраў мела няшмат. Яна захоплена адцягвала нашу ўвагу ад асноўных падзей сваімі расказамі пра сям'ю, дачку, падарожжы, дэманстравала фотаздымкі, якія «незнарок» прыхапіла з сабой. І заўсёды нешта жавала. Вось і зараз яна хуценька пераходзіць дарогу, бо зялёнае святло ўжо міргае і, напэўна, чакае праца, і зноў на хаду нешта жуе.

Як прыемна ў вялікім горадзе нечакана сустрэць каго-небудзь знаёмага. Няхай вось так, праз трамвайную шыбу, мімаходзь. Такая сустрэча — як напамін, напамін пра канкрэтны момант твайго жыцця, ці нават яго адрэзак. Я забылася, куды еду, якія планы ў мяне на дзень, што трэба паспець зрабіць і каму патэлефанаваць. Забылася нават на Анжэлу Канстанцінаўну. Мяне паглынулі ўспаміны таго лета.

А вы часта сустракаеце знаёмых у вялікім горадзе? Мая інструктар па фітнэсе паехала адпачываць у Крым і там сустрэла аднакласніка. Трэба было ехаць так далёка, каб сустрэцца! Мой стрыечны брат, які жыве ў Італіі, быў адзін дзень у Мінску і сустрэў хлопца, з якім разам паступаў у ВНУ шмат гадоў таму. Яны тады абодва не паступілі. І трэба ж было сустрэцца праз столькі часу праездам у сталіцы!

СУСТРЭЧЫ, ЯКІЯ ЎЗНІМАЮЦЬ НАСТРОЙ

Я спяшаюся на дзелавую сустрэчу, хоць працоўны дзень ужо скончыўся. Стомлена пазіраю ў акно аўтобуса і бачу сваю лепшую сяброўку. Яна бадзёра крочыць з работы і весела размахвае пакункам з тортам. Я імгненна набіраю нумар яе мабільнага, але аўтобус імчыць, і мы не паспяваем абмяняцца позіркамі.

— Ну дык чаго ты нудзішся?! — крычыць яе голасам тэлефонная трубка. — Давай хуценька вырашай справы — і да мяне на торт! Гэта я ў гонар заканчэння працоўнага дня купіла — разам і адзначым!

Цяпер я настроена аптымістычна і ўдзячна такім познім рабочым візітам. Калі б не яны, мы б не сустрэліся!

У наступны дзень аднаго за адным я праводзіла позіркам з акна трамвая сваіх добра- і малазнаёмых. Спачатку — старшыню студсавета, з якім мы не адзін год разам вырашалі студэнцкія праблемы. Узгадалася інтэрнацкае жыццё, самыя гарэзлівыя гады. Далей — адна з найлюбімейшых актрыс ТБД. Заслужаная артыстка ездзіць у грамадскім транспарце... Наўрад ці яна ўзгадае маладую журналістку, закаханую ў яе творчасць, але няхай ведае, што яе любяць. Я памахала праз шкло. Таццяна Рыгораўна Мархель усміхнулася і памахала ў адказ. Гэта сустрэча задала настрой усяму дню.

Я раблю перасадку і падоўгу стаю на гэтым прыпынку. Зноў жа забаўляю сябе здагадкамі пра людзей: куды едуць, чаго чакаюць, каго сустракаюць. На гэты раз фантазіі перапыняе знаёмы голас. Азіраюся. Гартаю старонкі памяці. І... гэта ж ветлівы будаўнік! Калі ў нас у рэдакцыі рабілі капітальны рамонт, ён працаваў там. Ці сыходзіў ён нанач, не ведаю. Калі я ішла на працу, ён ужо займаўся справай, ішла дадому — яшчэ быў там. І вось менавіта гэты будаўнік шторанiцы вітаў кожнага супрацоўніка нашай установы. А ўвечары звычай добра завяршыць гэты дзень. Зараз ветлівы будаўнік не пазнаў мяне. Я не стала нагадваць. Дастаткова ўспамінаў, якія ён мне падарыў.

СУСТРЭЧЫ, ЯКІЯ ЗМЯНЯЮЦЬ

Я не бачыла, як у трамвай увайшла сталая дама. Калі я павярнулася ад вакна, яна сядзела перада мной. Я цікаўна разглядаю абрысы сівой прычоскі і ... гэта ж мая ўніверсітэцкая выкладчыца! Самая строгая і самая патрабавальная. Мы баяліся яе як агню. На першым курсе ў мяне калаціліся рукі на яе парах — такую трымала дысцыпліну! Яна не даравала памылак, не дазваляла губляць гонар у любой сітуацыі і сама ніколі не падала тварам уніз. Яна чаплялася да любых дробязяў і сама была бездакорнай.

Гэта пасля мы даведаліся, што яна ўмее ўсміхацца, жартаваць, вучыць не толькі свайму прадмету, але і жыццю. Мы бачылі, як яна ўмее плакаць і саступаць.

І вось перада мной састарэлая выкладчыца. У такім жа строгім касцюме, з тымі ж вытанчанымі інтэлігентнымі пальцамі. Але з мутнаватым разгубленым позіркам, крыху растрапанай прычоскай. Яна падпірае падбародак рукой і ўглядаецца ўдалячынь. Пра што яна думае, куды едзе, чым жыве цяпер, ці выкладае яшчэ? Я ўдзячная ёй за тую школу, фактычна спартанскую, у якой яна нас загартоўвала, у якой выхавала не адно пакаленне журфакаўцаў. І я не стала кранаць яе за плячо, каб павітацца. Яна выйшла раней за мяне. Дастаткова тых успамінаў, што яна падарыла мне.

СУСТРЭЧЫ, ЯКІЯ ВЯРТАЮЦЬ

Ля самага дома, седзячы на прыпынку, я заўважыла знаёмы сілуэт. Прыгледзелася. Нават памяць не стала трывожыць. Так, яна, гэта дзяўчынка з майго роднага гарадка. Мы вучыліся разам у школе, яна на клас малодшая. Ведаю, што пасля школы паступіла ў медуніверсітэт — як маці, вырашыла стаць доктарам. Мы сустракаліся некалькі разоў, калі былі студэнткамі. Але ў мітуслівым жыцці кантакты губляюцца... Ці зноў знаходзяцца. Вось яна — нечакана, радасна праходзіць міма!.. І нешта спыняе мяне. Я не гукаю дзяўчыну. І яе сілуэт памяншаецца ўдалечыні.

Дык вы часта сустракаеце знаёмых у вялікім горадзе? Калі ў сямнаццаць гадоў я ехала ў сталіцу са свайго невялічкага Краснаполля, я баялася, што мне будзе не хапаць гэтага «ўсе ўсіх ведаюць». Я жыву ў Мінску толькі восьмы год. І ўжо маю столькі знаёмых, што перыядычна магу нечакана перасекчыся з імі ў тым ці іншым месцы. Гэтыя нечаканыя сустрэчы акрыляюць, падбадзёрваюць, радуюць. І я ведаю, чаму не хачу аклікаць, каб і яны заўважылі мяне. Да мяне вяртаецца тое старое вясковае «ўсе ўсіх ведаюць». Я быцам трапляю на радзіму, у невялічкі гарадок з насельніцтвам у пяць тысяч чалавек, дзе ў суседа можна пазычыць солі, у суседкі спытаць новы рэцэпт закаткі, бясплатна ўзяць у краме прадуктаў «да зарплаты». І тая дзяўчына, мая зямлячка, узмацніла гэтае пачуццё роднага. Мне не хацелася спыняць яе і заводзіць размову пра сталічнае жыццё, пра тое, як мы даўно не бачыліся і як усё змянілася. Мінск — гэта вялікая вёска, дзе ўсе ўсіх ведаюць. І дастаткова ўспамінаў, якія яны мне дораць.
Таццяна САЛДАЦЕНКА.

Віншуем аўтарку з самай галоўнай сустрэчай: на днях **Таццяна** і яе каханы **Сяргей** абмяняліся заручальнымі пярсцёнкамі. Зараз у маладых «мядовы» месяц. Шчыра зычым, каб ён не заканчваўся і пачуцці, якія перапаўняюць у пачатку сумеснай гісторыі, новая сям'я пранесла праз усё жыццё!

Звяздоўцы.

УЗНАГАРОДЖАННЕ «ЛЮДЗЯМ ГОДА» ПАВЫСІЛАСЯ

Самым дастойным жыхарам Прыдзвінскага краю, якія атрымаюць ганаровы тытул «Чалавек года Віцебшчыны», у якасці «прэміі» цяпер будуць уручаць грошай у некалькі разоў больш, чым раней.

Па ініцыятыве кіраўніцтва Віцебскага аблвыканкама за апошнія два гады гэты тытул атрымала 200 прадстаўнікоў самых розных сфераў дзейнасці: медыкі, спартсмены, выкладчыкі і іншыя. Калі раней кожны атрымліваў узнагароджанне ў памеры 3 мільёнаў рублёў, цяпер уладальнік звання атрымае па 10 мільёнаў рублёў, а таксама адпаведныя нагрудныя знакі. Іх гіганцкія фота можна ўбачыць на рэкламных шчытах ля дарог у населеных пунктах. Прысуджэнне тытулаў робіцца яшчэ і для таго, каб у іншых быў дадатковы стымул працаваць больш старанна, дасягаць новых вышынь у сваёй прафесійнай дзейнасці.
Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ДРАЎНІНА НЕ ПАВІННА ПРАПАСЦІ

У краіне ўжо нарыхтавана больш за 400 тысяч кубаметраў драўніны з тых 2 мільёнаў «кубоў» ветравальна-бураломнай драўніны, што ўтварыліся ў лясным фондзе Мінлясгаса ў выніку ўраганных вятроў у ліпені—жніўні.

Толькі у двух найбольш пацярпелых лясгасах Мінскай вобласці — Бярэзінскім і Чэрвеньскім — утварылася 300 і 365 тыс. кубаметраў такой пашкоджанай драўніны. Як удакладніліў прэс-службе міністэрства, у цэлым ачышчана ад завалаў больш за 1 600 гектараў. З нарыхтаванай сыравіны ўжо рэалізавана больш за 180 тыс. кубічных метраў дзелавой драўніны. Распрацаваць яшчэ трэба 1,5 мільёна «кубоў». Зараз на ліквідацыі наступствaў ураганаў у лясах працуюць каля 4,8 тыс. чалавек, 800 трактароў, 240 лесавозаў і іншая тэхніка.
Сяргей РАСОЛЬКА.

КІРМАШЫ РАСПАЧАЛІСЯ, КІРМАШЫ — НАПЕРАДЗЕ

Толькі за мінулыя выхадныя больш чым на 100 пляцовак са 140, якія па рашэнні Мінгарвыканкама былі сёлета выдзеленыя для рознічнага гандлю бульбай і плодаагароднінай прадукцыяй у мікрараёнах сталіцы, прыехалі фермерскія і сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, паведаміў намеснік старшыні Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Уладзімір Калтовіч.

Нагадаем, сёлета традыцыйныя восеньскія кірмашы па продажы сельскагаспадарчай прадукцыі насельніцтву распачаліся раней звычайнага. Яшчэ адным адрозненнем ад мінулых сезонаў, як мы ўжо паведамлялі, стала прадастаўленне права гандлю на такіх пляцоўках нароўні з прадпрыемствамі фізічным асобам — пры наяўнасці ў апошніх адпаведных дакументаў на прадукцыю.

Што датычыцца спажывецкай кааперацыі, дык, паводле слоў першага намесніка старшыні праўлення Белкаапсаюза Аляксандра Якоўчыца, «мы традыцыйна з'яўляліся арганізатарамі і ўдзельнікамі кірмашоў. Сёлета плануем правесці 830 кірмашоў, дзе, акрамя прадукцыі сельгасвытворчасці, будзем прапаноўваць і харчовыя тавары, і шырокі асартымент уласнай прадукцыі і грамадскае харчаванне з пасадачнымі месцамі».

Міністр гандлю Валянцін Чэканаў на нядаўняй прэс-канферэнцыі падкрэсліў, што кірмашы па продажы бульбы і плодаагароднінай прадукцыі будуць доўжыцца да канца нарыхтоўчага сезона, што, на яго думку, дазволіць насельніцтву своечасова запасціся на міжсезонны перыяд усімі неабходнымі таварамі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

У ГрДУ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ СТВАРАЕЦЦА ЭКСПАЗІЦЫЯ МАНТЫЙ УНІВЕРСІТЭТАЎ СВЕТУ

Мяркуецца, што ў калекцыю ўвойдуць прафесарскія мантыі з усіх вышэйшых навучальных устаноў, з якімі супрацоўнічае «купалаўскі» ўніверсітэт, а іх ужо больш за восемдзесят.

Першую мантыю ў музей гісторыі ГрДУ перадаў рэктар універсітэта ў Беластоку Ежы Нікітаровіч. Яго падтрымалі калегі з Беларусі, Украіны, ЗША, а неўзабаве ў Гродне чакаюць мантыі з Балгарыі, Кітая і Расіі.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Минский городской центр недвижимости

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ ИНФОРМИРУЕТ:

Время и дата проведения открытого аукциона по продаже единым комплексом зданий, сооружений и иного имущества ОАО «Белстройматериалы», расположенного на просп. Партизанском, д 99а (извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 03.09.2010) **переносятся с 16.00 04 октября 2010 года на 11.00 15 октября 2010.**

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 06.09.2010 по 13.10.2010 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 227 48 36, (017) 296 44 63.

ТАЙНІК ЗНІШЧАНЫ

Арсенал боепрыпасаў часоў Вялікай Айчыннай вайны знайшлі супрацоўнікі ўпраўлення КДБ Рэспублікі Беларусь па Гомельскай вобласці ў лясным масіве ў Калінкавіцкім раёне Гомельскай вобласці. Як паведамілі ў прэс-групе камітэта, 40 выбухованебяспечных прадметаў было схавана ў зямлі. Артылерыйскія снарады калібру 75 мм і 45 мм з узрывацелем, мінамётныя міны калібру 81 мм знішчылі ва ўстаноўленым парадку. Агульная вага боепрыпасаў са сховішча ў трацілавым эквіваленце склала каля 13 кг. Дарэчы, у адпаведнасці з санкцыямі артыкула 295 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, за незаконныя дзеянні ў дачыненні да агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў прадугледжана максімальнае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін да сямі гадоў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ПАЙШОЎ У ГАРАЖ... І НЕ ВЯРНУЎСЯ

40-гадовы беспрацоўны з Баранавічаў пайшоў у гараж па вул. Камсамольскай і не вярнуўся. Яго знайшлі мёртвым. Мужчына стрэліў сабе ў галаву. Самаробнае прыстасаванне для стральбы дробнакалібернымі патронамі і гільзы былі знойдзеныя пры ім.

СВІНЕЦ І НАМ ПАТРЭБЕН

На вуліцы в. Дзівін супрацоўнікі Кобрынскага УКДБ сумесна з аператыўнікамі АБЭЗ і памежнікамі затрымалі «Фіят-Дуката» з 1200 кг лома свінцу. Яго перавозіў грамадзянін Украіны з Валынскай вобласці. У гэты ж дзень быў затрыманы і другі грамадзянін Украіны, у аўтамашыне якога знаходзілася 1700 кг свінцу. Саставілі пратаколы, а метал канфіскавалі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Кіроўцу мікрааўтобуса на пераездзе не хапіла долі секунды

Раніцай 20 верасня на чыгуначным пераездзе ў Гомелі адбылося сутыкненне мікрааўтобуса «Фальксваген Транспарцёр» з манеўровым цеплавозам. Да апошняга быў прычэплены пусты пасажырскі вагон. Як паведамілі ў прэс-службе абласнога ўпраўлення МНС, вядома, што цеплавоз на вялікай хуткасці рухаўся са станцыі Калінкавічы да станцыі Іпуць Гомельскага раёна. «Фальксваген» імкнуўся праскочыць перад цягніком. Машыну зачапіла і працягнула па чыгуначным палатне каля 100 метраў. Аўтамабіль і цеплавоз атрымалі пашкоджанні. Кіроўцу мікрааўтобуса з салона ў непрытомным стане вымалі супрацоўнікі МНС пры дапамозе гідраўлічных аварыйна-выратавальных прылад. Пацярпелага даставілі ў бальніцу хуткай медыцынскай дапамогі абласнога цэнтра з дыягназам «чэрапна-мазгавая траўма, пераломы правай і левай нагі, скальпаваная рана галавы, удар унутраных органаў». Чыгуначнае палатно ад аварыі не пацярпела, і затрымкі руху цягнікоў не адбылося.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

НА АГАРОДЗЕ ЎРАДЖАЙ ШАШАК. ТОЛАВЫХ

Проста на агародзе, які належыць пенсіянерцы, падчас работы на ім у вёсцы Новае Тарчылава Аршанскага раёна было знойдзена ажно дваццаць толавых шашак. Выклікалі сапёраў, якія і знішчылі шашкі часоў Вялікай Айчыннай вайны.

А ў Віцебскім раёне грыбнікі ў лесе ля вёскі Сасноўка таксама выявілі небяспечную знаходку: сапёры дасталі з-пад зямлі 63 мінамётныя міны калібру 50 мілімятраў і 12 узрывальнікаў да іх. Вывезлі ў бяспечнае месца і таксама знішчылі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

АБВАЛІЛІСЯ РЫШТАВАННІ

У в. Прылукі (Брэсцкі раён) будуецца рэзервуар для нафтапрадуктаў. Падчас зварачных работ абваліліся будаўнічыя рыштаванні. 47-гадовы зваршчык, жыхар г. Лагойск, упаў з вышыні і загінуў. Ёсць меркаванне, што былі дапушчаныя парушэнні тэхнікі бяспекі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

альбо На пампушкі да Алены

Сёння, дарагія мае кулінары, будзем здзіўляць нашых дамачадцаў і радаваць свой страўнік незвычайным смакам паўсядзённых страў. Усе прапанаваныя рэцэпты не падаюцца да святочнага стала, аднак маюць сваю «разынку», а самае галоўнае — у іх выкарыстоўваюцца дары адыходнага ўраджаю. Атрымліваем асалоду ад балгарскага перцу, грыбоў і журавінаў.

ГАРАЧАЯ ЗАКУСКА Ў БАГЕЦЕ

Нам спатрэбіцца: *1 багет, 300—400 г вяндліны або сасісак, 150—200 г сыру, 1 балгарскі перац, зяленіва пятрушкі ці кропу, 1—2 зубкі часнаку (па жаданні), 1 яйка, маянэз або смятана, раслінны алей для смажання, соль, молаты перац.*

Багет разрэзаць упоперак на 3—4 часткі, а кожную частку — уздоўж на 2 палавінкі. Акуратна дастаць мякіш з палавінак багету, пакідаючы сценкі таўшчынёй каля 1 см. Прыгатаваць начынку. Балгарскі перац парэзаць невялікімі кубікамі, абсмажыць на раслінным алеі 3—4 хвіліны і астудзіць. Вяндліну (сасіскі) парэзаць саломкай. Сыр нацерці на сярэдняй тарцы. Зяленіва вымыць, абсушыць і пасячы. Злучыць вяндліну, балгарскі перац, сыр, зяленіва і перамяшаць. У начынку можна таксама дадаць дробна парэзаныя марынаваныя агуркі, свежыя памідоры і г.д. Падрыхтаваны багет вылажыць у змазаную маслам форму і напоўніць начынкай. Запякаць 10—15 хвілін у нагрэтай да 180 °С духоўцы. Падаваць можна і ў гарачым, і ў халодным выглядзе.

САЛАТА З АГАРОДНІНЫ З СЕЛЯДЦОМ

Вазьміце: *1 буйную бульбіну, 1 моркву, 2 яйкі, 100—150 г селядца, 1 невялікі балгарскі перац, 1 агурок, 100 г зялёнага гароху, зяленіва кропу або пятрушкі, 1 цыбуліну, маянэз, соль.*

Моркву і бульбу вымыць, адварыць у мундзірах, астудзіць і пачысціць. Яйкі зварыць укрутую, астудзіць і пачысціць. Перац вымыць, выдаліць насенне. З агурка зрэзаць скурку. Бульбу, моркву, яйкі, перац, агурок і селядзец парэзаць невялікімі кубікамі. Зяленіва дробна пасячы. Цыбуліну парэзаць на чацвярцінкі кольцаў. З зялёнага гароху зліць вадкасць. У вялікім салатніку змяшаць усе інгрэдыенты. Заправіць салату маянэзам, крыху пасаліць і добра перамяшаць.

КУНДЗЮМЫ

Кундзюмы — гэта старажытная руская страва, нешта накшталт пельменяў з грыбной начынкай. Цеста для такіх незвычайных пельменяў уяўляе сабой спалучэнне заварнога і выцяжнога цеста і гатуецца на раслінным алеі.

Для цеста нам спатрэбіцца: *2 шклянкі мукі, 75 мл вады (кіпеню), 4 сталовыя лыжкі расліннага алею. Для начынкі: 200 г замарожаных белых або іншых лясных грыбоў (можна ўзяць 100 г сушаных), палову склянкі грэцкіх крупаў або рысу, 1—2 цыбуліны, раслінны алей для смажання, соль, молаты перац. Для грыбнога адвару: 0,5 літра вады, 1 лаўровы ліст, 5—6 гарошын духмянага перцу, 2—3 галінкі зяленіва пятрушкі (не абавязкова), 1 зубок часнаку, соль, насенне кропу або кмену.*

З такой колькасці прадуктаў выходзіць прыкладна 70 штук, але застаецца крыху начынкі.

У міску наліць кіпень, дадаць алей, размяшаць лыжкай, усыпаць муку, хутка перамяшаць цеста лыжкай і замясіць рукамі. Цеста добра вымешаць, палажыць на драўляную дошку і накрыць перавернутай гарачай міскай або каструляй. Пакінуць на 30 хвілін. Размарожаныя грыбы апаласнуць вадой і даць сцячы вадкасці. У невялікую каструлю наліць ваду і давесці да кіпення.

Палажыць у ваду лаўровы ліст, расціснуты зубок часнаку, гарошыны перцу і галінкі зяленіва.

Змясіць грыбы, давесці ваду да кіпення, паменшыць агонь і варыць пры слабым кіпенні пад накрыўкай 10 хвілін. За 2—3 хвіліны да заканчэння варкі крыху пасаліць. Грыбы дастаць з адвару (адвар не выліваць) і астудзіць. З адвару выдаліць прыправы і працадзіць яго. Грыбы, якія астылі, даволі дробна пасячы. Прыгатаваць начынку. Для гэтага грэцкія крупы прамыць і заліць 1 шклянкай вады. Паставіць каструлю з грэцкімі крупамі на агонь, давесці да кіпення, зменшыць агонь, накрыць накрыўкай і варыць на слабым агні, пакуль уся вадкасць не выпарыцца. Кашу злёгку пасаліць, перамяшаць, зноў накрыць накрыўкай, захутаць тоўстым рушніком і пакінуць на 15—20 хвілін. Цыбулю ачысціць і дробна парэзаць. На разагрэтую з раслінным алеем патэльню вылажыць цыбулю, крыху пасаліць, папярчыць і абсмажыць да мяккасці. Да цыбулі дадаць дробна нарэзаныя грыбы і абсмажваць 3—5 хвілін, памешваючы. Дадаць грэцкую кашу і перамяшаць. На смак дадаць у начынку крыху солі (калі трэба), молатага перцу, яшчэ раз добра перамяшаць і абсмажыць усё разам 1—2 хвіліны.

Працоўны стол злёгку змазаць раслінным алеем і раскатаць на ім цеста ў тонкі пласт (таўшчыня 3 мм). Разрэзаць цеста на квадраты 5х5 (калі памер падасца малым, можаце зрабіць квадраты крыху большага памеру, але для ежы прапанаваны памер аптымальны). На сярэдзіну квадрата пакласці крыху начынкі, квадрат скласці па дыяганалі і зашчыпаць краі ў выглядзе трохвугольніка. Кундзюмы раскласці на змазанай алеем бляхе і выпякаць у духоўцы 15—20 хвілін пры тэмпературы 160°С. (Іх можна проста абсмажыць у невялікай колькасці алею.) Пакуль кундзюмы падсушваюцца ў духоўцы, грыбны адвар трэба давесці да кіпення. Спечаныя кундзюмы выкласці ў шырокую і дастаткова глыбокую форму, заліць гарачым грыбным адварам, крыху пасыпаць насеннем кмену ці кропу і молатым перцам. Форму накрыць накрыўкай або зацягнуць фольгай, вярнуць у духоўку і гатаваць яшчэ 20 хвілін пры той жа тэмпературы. Гатовыя кундзюмы дастаць з духоўкі, раскласці па талерках і пасыпаць пасечаным зяленівам (а таксама па жаданні — пасечаным часнаком або смажанай цыбуляй).

ПЯЧОНКА, ТУШАНАЯ Ў ГАРШЧОЧКУ З ЖУРАВІНАМІ

Вазьміце: *500 г ялавічнай пячонкі, 400—500 г цыбулі, 1—1,5 кг бульбы, 100—150 г журавінаў, 1—3 чайныя лыжкі мёду, 1,5 чайнай лыжкі солі, перац, спецыі.*

Цыбулю парэзаць паў- або чвэрцькольцамі. Тушыць (на раслінным алеі) на агні крыху ніжэйшым за сярэдні, пакуль пад накрыўкай гатуюцца астатнія прадукты. Бульбу пачысціць і нарэзаць кубікамі. Палажыць у міску і заліць кіпенем. Пячонку парэзаць кубікамі. З журавінаў выціснуць сок або пракруціць іх у блэндары з 0,5 шклянкі вады. Дадаць мёду столькі, каб сок атрымаўся прыемным на смак. З бульбы зліць ваду ў асобны посуд. У вялікі казан (або ў парцыённыя гаршчочкі) палажыць бульбу, пячонку, цыбулю. Пасыпаць соллю, перцам і спецыямі. Уліць журавінавы сіроп. Даліць бульбяной вады столькі, каб прадукты былі закрытыя амаль цалкам. Добра перамяшаць. Казан закрыць накрыўкай або фольгай. Паставіць у разагрэтую да 180 °С духоўку. Агонь дадаць да 250 °С. Тушыць да гатоўнасці — прыкладна 1 гадзіну. Хвілін за дзесяць да заканчэння гатавання ў гаршчок можна пакласці лаўровы ліст.

ЯДОМЫ АНЕКДОТ

Закаханая парачка зайшла ў рэстаран павячэраць. Яны літаральна паядаюць адно аднаго вачыма:

— Ты такая салодкая, я б з'еў цябе ўсю...

— І я таксама...

Афіцыянт, які падышоў, кашлянуў і запытаў:

— А запіваць чым-небудзь будзеце?

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ
по продаже права заключения договора аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности

№ лота	Наименование объекта аренды, его характеристика (год постройки, общая площадь, коммунальные услуги при налии)	Адрес объекта аренды, контактный телефон для осмотра объекта	Арендуемая площадь, кв.м	Начальная цена права заключения договора аренды с НДС (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)
1	390 – «Дом военной одежды», 1987 г., 5078 м², э/энергия, центр. отопление, в/снабжение, 2 эт., комн. 212	г. Минск, ул. Калинина, 30а, тел. 280 25 28, 287 37 62	13,8 кв.м	144900	10000
2	390 – «Дом военной одежды», 1987 г., 5078 м², э/энергия, центр. отопление, в/снабжение, 4 эт., комн. 403	г. Минск, ул. Калинина, 30а, тел. 280 25 28, 287 37 64	189,73 кв.м	1992165	150000
3	6 – административное здание, 1969 г., 445 кв.м, э/энергия, центр. отопление, в/снабжение, 2 эт.	г. Минск, ул. Уручская, 27, тел. 280 25 28, 266 59 53	10,2 кв.м	107100	5000
4	28 – магазин, 1985 г., 336,1 кв.м, э/энергия, отопление	г. Брест, ул. л-та Рябцева, 48, тел. 8 0162 29 70 15	21,7 кв.м	227850	10000
5	000061 – административное здание, 1988 г., 398 кв.м, отопление, водоснабжение, э/энергия	г. Витебск, ул. Мичурина, 5в, тел. 8 0212 37 36 84	9,7 кв.м	101850	5000

Организатор аукциона – **РУП «Торгово-производственное управление при Министерстве обороны»**, адрес: 220012, г. Минск, ул. Калинина, 30а. Аукцион состоится **21 октября 2010 года в 11.00** по адресу: **г. Минск, ул. Калинина, 30а, 5 (пятый) этаж.** К участию в аукционе допускаются покупатели, оплатившие задаток. Физические лица обязаны предоставить паспорт и заполнить необходимые документы в соответствии с законодательством Республики Беларусь, иметь в банке открытый счет. Юридические лица представляют необходимый пакет документов, установленный законодательством Республики Беларусь. Порядок и сроки осмотра объекта согласовываются с организаторами аукциона. Заявления на участие в аукционе принимаются со дня опубликовая и **до 17.00 14 октября 2010 г.** включительно по адресу: г. Минск, ул. Калинина, 30а, 5 (пятый) этаж, комн. 525. Время работы: понед.–пятн. 9.00–13.00, 14.00–18.00. Справки по тел. (017) 280 25 28. Участник аукциона, выигравший аукцион, после окончания аукциона должен подписать протокол о результатах аукциона. Право на заключение договора аренды возникает у победителя аукциона с момента перечисления им организатору аукциона определенной в ходе аукциона цены. Срок заключения договора аренды – 3 года. Задаток перечисляется по безналичному расчету в белорусских рублях на расчетный счет РУП «Торгово-производственное управление при Министерстве обороны» 3811224139004 в специализированном управлении Национального банка Республики Беларусь БИК 153006024, ул. Калиновского, 72а, 220114, г. Минск, УНП 190562963. Победитель аукциона заключает договор на аренду зданий, сооружений и помещений в течение 5 (пяти) рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона. В случае уклонения или отказа от заключения договора аренды или уклонения или отказа от оплаты стоимости приобретенного права на заключение договора аренды задаток победителю аукциона не возвращается. Оплата стоимости приобретенного права на заключение договора аренды осуществляется по безналичному расчету в белорусских рублях в течение 3 (трех) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона с победителем аукциона.

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРИСПОЛКОМ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В г. МОГИЛЕВЕ
Аукцион состоится 4 октября 2010 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

№№ лота	Адрес земельного участка	Площадь, га	Срок аренды	Целевое назначение	Кадастровый номер	Стоимость землеустроительного дела (руб.)	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
№ 1	Улица Первомайская (р-н жилого дома № 72)	0,0828	50 лет	Строительство и обслуживание административно-торгового здания с гостиничными номерами и кафе	740100000003005439	562 892	94 927 000	8 543 000
№ 2	Район пересечения Минского шоссе и улицы Пелагеевской (огр-р. Дубровенка)	0,2500	50 лет	Строительство и обслуживание гостиницы и кафе	740100000001005247	583 397	122 576 000	11 032 000
№ 3	Улица Ямницкая (огр-охр. зона ЛЭП)	0,0800	50 лет	Строительство и обслуживание складских помещений	740100000003005397	1 478 015	21 922 000	1 973 000
№ 5	Улица Крупской (р-н жилых домов №№ 200, 204)	0,0047	1 год	Установка и обслуживание торгового павильона (№ 1)	740100000002005460	1 461 025	296 000	27 000
№ 6	Район пересечения улиц Тенистой и Кленовой	0,0091	2 года	Установка и обслуживание павильона по продаже продовольственных товаров	740100000007004588	522 632	494 000	44 000
№ 7	Микрорайон жилой застройки «Спутник» (огр–газопровод, ЛЭП)	0,2208	50 лет	Строительство и обслуживание комплексного приемного пункта на 35 рабочих мест с приемным пунктом прачечной № 65 по генплану	740100000001005669	2 454 658	148 516 000	13 366 000

Принимать участие в аукционе могут юридические лица, индивидуальные предприниматели и граждане.

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон желающие принять участие в аукционе представляют:

Заверенную копию платежного поручения **о внесении задатка** на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета № 3642017441709 в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 (разовый платеж).

Юридические лица: доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица; документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

Индивидуальные предприниматели: копию свидетельства о государственной регистрации; копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность.

Граждане – копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность.

Иностранные юридические лица: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения, также документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе), либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованными в установленном порядке переводами на белорусский (русский) язык.

Представители иностранного юридического лица или гражданина: легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении **нескольких предметов** аукциона, вносят **задаток** в размере, установленном для предмета аукциона **с наибольшей начальной ценой**.

1) Условия инженерного развития инфраструктуры – в соответствии с проектно-сметной документацией.

2) Условия проведения аукциона – наличие не менее двух участников.

3) Условие предоставления земельных участков в аренду: согласование типа киоска, павильона с управлением архитектуры и градостроительства Могилевского горисполкома.

4) Порядок осмотра на местности земельных участков: выезд по желанию, предварительное ознакомление с земельно-кадастровой документацией всем желающим.

5) В течение **10 рабочих дней** со дня принятия решения о предоставлении в аренду земельных участков победителям аукциона **оплатить стоимость предмета аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона**, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решениях об изъятии земельных участков для проведения аукциона. Ориентировочная сумма затрат на организацию и проведение аукциона (на всех победителей) составляет 5 миллионов рублей.

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: **г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206** в рабочие дни с 8.00 до 17.00. **Последний день приема заявлений – 28.09.2010 года до 17.00**.

Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63.

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2010 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 4 кастрычніка** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць міксер, кухонную ЭЛ-машыну, тэлевізар або печ ЗВЧ. Розыгрыш прызоў адбудзецца **7 кастрычніка 2010 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **па 16 кастрычніка 2010 г.**

Дастаўку тэлевізараў і печы ЗВЧ ажыццяўляе рэдакцыя. Астатнія прызы можна атрымаць у рэдакцыі **па 31 снежня 2010 г.** пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2010 года і пашпарта. **Пасля 31 снежня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Правілы гульні чытайце ў газеце «Звязда» за 01.09.10 г.

Тэрмін правядзення гульні — з 1.09.10 па 31.12.10.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1754 ад 27.08.10, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

6 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2010 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска афармлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)

_____ **на IV кв. або 2-е паўг. 2010 года**

Жатні адрас і тэлефон _____ _____
(індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету **ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі:
«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»
на 2010 год па месяцах

(індэкс выдання) | Колькасць камплектаў

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму _____
Куды _____ (прозвішча, ініцыялы)
_____ (адрас)
(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

ПВ | месяца | літар

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету **ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі:
(індэкс выдання)
«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

Кошт: падпіскі _____ руб. | пераадрасоўкі _____ руб. | Колькасць камплектаў

на 2010 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму _____
Куды _____ (прозвішча, ініцыялы)
_____ (адрас)
(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

ЗВЯЗДА

КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ
Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі:
220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.

Пашпарт, серыя_____ №_____ Выдадзены _____

Подпіс _____ Дата _____

Кірмаш штотыднёвы рэкламны выпуск № 27 (648)
адрэс рэкламы 287 17 79 Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210700016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ПРАДАЕЦЦА

❒ Кватэра 2-пакаёвая, 3/5, усе выгоды, побач парк, возера, 30 км ад Мінска, Станькава, Дзяржынскі р-н.
Тэл. 8 029 854 00 99

❒ А/м «Форд Арыён» 1991 г.в., 1.4 бензін.
Тэл. 8 029 871 60 99

❒ Дыван, памер 188х143 см. 11 тыс. руб.
Тэл. 8 033 635 37 97

❒ Племянныя трусы, парода «бельгійскі велікан» і «каліфарнійская».
Тэл. 8 029 357 64 51

❒ Каляска інвалідная з электрапрывадам.
Тэл. 8 044 754 06 65

❒ Домік з г/пабудовамі ў цэнтры, г. Клімавічы, сад; 0,25 га зямлі, 8 тыс. у.а., торг.
Тэл. 8 022 44 51936

❒ Трактар Т-16 МГ, 1991 г.в., у добрым стане, з/часткі да трактара.
Тэл. 8 0179 255724, 8 029 6485113

❒ Прычэп аднавосны, гума пяродняя ад МТЗ + запчасткі да МТЗ.
Тэл. 8 029 754 52 55.

❒ А/м «Пежо-309», 1,3Б карбюратар, чорны перламутр, 1988 г.в., у добрым стане, 1300 у.а., торг. Дзятлаўскі р-н Гродзенскай вобл.
Тэл. 8 033 621 20 75

❒ Дом у в. Альшэўцы Вілейскага р-на (танна), побач возера.
Тэл. 8 01774 71 850.

КУПЛЮ

❒ Трактар МТЗ-82, можна з пагрузчыкам ці экскаватарам.
Тэл. 8 044 473 68 90.

УПРАВЛЯЮЩИЙ В ПРОИЗВОДСТВЕ ПО ДЕЛУ О БАНКРОТСТВЕ
извещает о проведении 5 октября 2010 года повторных торгов по продаже имущества принадлежащего республиканскому дочернему унитарному предприятию «Мозырский оптово-розничный Торговый комплекс» (РДУП «Мозырский ОРТК»), расположенного по адресу: Гомельская область, г. Мозырь, ул. Иваненко, 13

п/п	Объект продажи	Характеристика объекта	Начальная цена продажи, (в т. ч. НДС 20 %) руб.	Задаток
		ЛОТ № 1		
2	**Здания двух складов, оборудование**	**Склад № 1** – одноэтажное здание, общая площадь 243,20 м², стены кирпичные, асбестоцементные листы, перегородки кирпичные, кровля шиферная, полы цементные, электроосвещение. **Склад № 2 (основное)** – одноэтажное здание, общая площадь 670,14 м², стены кирпичные, металлические листы, перегородки кирпичные, кровля шиферная, полы цементные, электроосвещение. **Пристройка (склад № 2) –** одноэтажное здание, общая площадь 316,60 м², стены кирпичные, асбестоцементные листы, перегородки кирпичные, кровля шиферная, полы цементные, электроосвещение. **Уборная –** общая площадь 5,27 м²; **покрытие асфальтовое** 1844,63 м²; **ограждение кирпичное** протяженностью – 40,6 м.п; **ворота металлические**	**79 284 000**	**8 000 000**

Торги проводятся в форме открытого аукциона без условий.

Аукцион состоится: 5 октября 2010 года по адресу: Гомельская область, г. Мозырь, ул. Иваненко, 13. Начало в 12.00.

Объекты недвижимости находятся на земельном участке имеющие ограничение в использовании согласно Положения о порядке установления размеров и границ водоохранных зон и прибрежных полос водных объектов и режиме ведения в них хозяйственной деятельности, утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 21 марта 2006 г. № 377

С перечнем и состоянием имущества можно ознакомиться по месту его нахождения.

Порядок подачи документов определен условиями проведения аукциона.

Для участия в аукционе участник перечисляет платежными поручениями задаток на **р/с 3012001320013, отделение ОАО «БПС-Банк» в г. Мозыре, МФО 151501354. Получатель платежа – РДУП «Мозырский оптово-розничный торговый комплекс». УНП 400083650.**

Документы на участие в аукционе принимаются с даты опубликования информационного извещения по адресу: Гомельская область, г. Мозырь, ул. Иваненко, 13 с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 16.00 по рабочим дням до 4 октября 2010 года включительно.

При подаче заявления представитель юридического лица должен иметь паспорт, доверенность на участие в аукционе и на подписание документов, нотариально заверенные в установленном порядке копии учредительных документов (устав, свидетельство о государственной регистрации), письменное решение соответствующего органа управления, разрешающее приобретение имущества (если это необходимо в соответствии с учредительными документами участника торгов); физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Шаг аукциона – 5 %.

Аукцион проводится в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь № 232 от 5 мая 2009 года «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)».

Победитель торгов обязан после подписания протокола о проведении аукциона: в течение 10 рабочих дней подписать договор купли-продажи, возместить расходы, связанные с проведением торгов, и расходы по изготовлению землеустроительных дел по выделению земельного участка.

Контактные телефоны организатора аукциона: (029) 657 27 13, (029) 531 96 14.

Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск № 23 (109)

Занатоўкі мастака

ЭРОТЫКА І НАВУКА

Некаторым жанчынам перад тым, як пакласці іх у свой ложак, варта сказаць: «Якая ты ў мяне разумная!» Можна яшчэ дадаць некалькі слоў пра яе таленты. Аб прыгажосці перад сэксам лепей не гаварыць, бо жанчына можа і працверазець!

НОВЫ ГРЭХ І ГРЭХ СТАРЫ

Новы грэх зусім просты, а таму распаўсюджваецца ён са страшэннай сілаю. Ён распаўзаецца па свеце разам з сотавікамі. Новы грэх — несанкцыяванае зазіранне ў мабільны тэлефон любімага чалавека. Ну кахаеш ты некага, ну кахай такога, як ёсць; любі ты яго з той мадэллю сотавіка, якую ён мае. Не! Трэба схапіць мабільнік, трэба выказацца пра мадэль, трэба ў тэлефон залезці і пабачыць там малапрыемныя для цябе рэчы кшталту імені былой каханкі. Тое, што імя старой каханкі засталося ў сотавіку, таксама недагляд і грэх, але грэх стары.

АМПІР І ЎДАКЛАДНЕННІ

У дзённікавых запісах дваццатых гадоў мінулага стагоддзя чытаю: «Дом-палац стылю аляксандраўскага ампіра, агромністая каменная пабудова з калонамі, стаіць каля вялікага цудоўнага штучнага возера, акружанага паркамі...» Аляксандраўскі ампір? Што за ўдакладненне ў гэтым «аляксандраўскі»? Для мяне — пусты гук, грувасткае і малапатрэбнае ўдакладненне да класіцызму. Дастаткова было напісаць «дом-палац у стылі ампір» ці «палац у стылі класіцызм», але напісана пра «аляксандраўскі» так, як цяпер пішуць пра «сталінскі» ампір. Мне моцна не падабаецца, калі да назвы архітэктурнага стыля абывацелі лепяць падобныя ўдакладненні. І мяне цешыць той факт, што праз пэўны час налепкі адпадаюць.

НЕ МАСТАКІ, БО...

Шмат каго я не лічу за мастака таму, што ён каляндарныя святы ды суботы з нядзелямі залічвае сабе ў выходныя дні.

АКУЛЯРЫ І АЭРАПОРТ

Кожны раз я спадзяюся, што пачытаю ў самалёце добрую кнігу. Бяру з сабою акуляры. Кніжак у партфелі дзве альбо тры. Надзяваю акуляры, разгортваю кнігу і пачынаю засынаць. Ноч перад вылетам зазвычай бяссонная. Думаеш... Ці ўсё ўзяў? Ці не забыўся чаго важнага? Думкі круцяцца і таўкуцца на адным месцы, заснуць не даюць. А ў самалёце я раблюся фаталістам. Усё, што не ўзялося ў дарогу, яно і малапатрэбнае. Пачынаю засынаць, а спаць у акулярах не люблю. Здымаю, акуратненька кладу іх у кішэню папярэдняга крэсла і сплю сабе соладка. Бачу недагледжаныя ўначы сны. Так незаўважна і лёгка далятаю да Барселоны. Сядаю ў таксоўку і еду ў гарадок Січаз, еду адпачываць. А там у прахалодным нумары гатэля разумею, што акуляры мае палянцелі ў сіняй кішэні самалётнага крэсла ў наш родны Мінск. Вось жа паспаў салодка! Лятаць-залятаць-пралятаць-планіраваць! Няма акуляраў! Даводзіцца ісці ў оптыку, як той бы сказаў, акулярню, і замаўляць новыя «вочы». Замовіў, а сам спадзяюся на добрасумленнасць людзей, якія знойдуць мае акуляры і здадуць іх у бюро знаходак, што месціцца ў камеры захоўвання нашага вялікага мінскага аэрапорта. З такімі спадзевамі я тры тыдні пражыў у Січазе! Прылятаю ў Мінск, падыходжу да мытніка і распавядаю гісторыю пра забытыя акуляры. Мытнік накіроўвае мяне да ахоўнікаў аэрапорта. Ветліва накіроўвае. Ахоўнікі аэрапорта таксама вельмі ветліва распавядаюць пра камеру захоўвання, дзе вельмі ласкавая жанчына прынесла мне скрынку з пазабыванымі акулярамі і сотавымі тэлефонамі, як той бы сказаў, дальнаразмоўнікамі. Маіх тамака не было, а чужыя я не стаў браць. Мяне парадавала тое, што столькі знаходак людзі вяртаюць. Знайшоў і не вярнуў, такое больш зразумела, але ж спадзяешся на адваротнае, на неверагоднае — нехта чужы знайшоў і вярнуў табе. «Можа нехта парадаваўся знаходцы! Знайшоў мае акуляры і парадаваўся! Давайце і мы парадуемся за людзей, якім стала добра ад таго, што знайшлі мае акуляры! А я сабе ўжо ўсё адно новыя «вочы» ў Барселоне зрабіў!» — сказаў я ласкавай захавальніцы чужых скарбаў. «І сапраўды, давайце парадуемся за іншых, і нам стане крыху лягчэй...»

ПАРТФЕЛЬ І ЭКС-МІНІСТР

Поспех у працы звязаны з правільным збіраннем партфеля. Калі ты звечара добра спакуеш свой партфель, дык моцна павялічыцца верагоднасць займець поспех у наступны працоўны дзень. Надоечы бачыў я адчынены партфель былога міністра. Міжволі заўважыў: партфель сабраны няправільна. Пабіты яблык і стары цэлафанавы пакет не павінны знаходзіцца ў партфелі міністра, нават у партфелі экс-міністра іх не павінна быць. Нядзіўна, што з такім кепска сабраным партфелем чалавек згубіў пасаду. Можа, раней ён добра збіраў партфель? Не давялося бачыць. Але цяперака экс-міністр збірае партфель пагана. Я дык сачу за парадкам у партфелі. Міністрам я рабіцца не збіраюся, але пабітую садавіну і пакамечаныя пакеты ты ў маім парфелі не ўбачыш.

Адам ГЛОБУС.

Родны край вачамі братоў

Члены Беларускага Саюза мастакоў Іван і Юрый Козелы падрыхтавалі для сваіх землякоў выставу жывапісу «Родны край». У экспазіцыі, якая прадстаўлена ў Доме-музеі Адама Міцкевіча ў Навагрудку, 32 лепшыя працы мастакоў — лірычныя і эпічныя пейзажы, нацюрморты.

Творчыя біяграфіі братоў, пастаянных удзельнікаў рэспубліканскіх і міжнародных выстаў, пленэраў, вельмі падобныя — вучоба ў Беларускай акадэміі мастацтваў, стажыроўка ў творчых майстэрнях Міністэрства культуры Беларусі ў М. Савіцкага. У кожнага — свой почырк, але што аб'ядноўвае — гэта трапяткія адносіны да вясковых матываў, любоў да архітэктурных помнікаў, сведка багатай гісторыі Беларусі. Мастакі працуюць у рэалістычным накірунку, разумеючы рэалізм не як імгненнае зрысоўванне, а як метад, які дазваляе разважаць аб сваім краі. Для Івана гэта — «Край Адама Міцкевіча», «Жыровіцкая святыня», «Зіма на Дзятлаўшчыне», «Дом-музей Адама Міцкевіча ў Навагрудку»... Для Юрыя — «Восень у вёсцы», «Лён», «Край азёраў», «Касцёл у Дзятлаве», «Векавы вяз»...

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Куфар для тэатраў

ПРАЦЯГВАЦЬ добрыя традыцыі, шукаць новае і эксперыментаваць збіраюцца ўдзельнікі VII Міжнароднага фестывалю студэнцкіх тэатраў «Тэатральны куфар-2010», які пройдзе ў Мінску 27 верасня — 2 кастрычніка.

Сёлета фестываль абяцае сабраць каля 200 удзельнікаў з Беларусі, Расіі, Украіны, Вялікабрытаніі, Бельгіі, Латвіі, Сербіі, Ірана, Польшчы, Літвы, Эстоніі, Босніі і Герцагавіны, Грэцыі, Італіі, Швейцарыі, Партугаліі.

Конкурсную праграму традыцыйна будзе ацэньваць незалежнае журы, у склад якога ўвойдуць вядомыя тэатральныя дзеячы з Беларусі, Іарданіі, Карэі, ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі, Ірана і Іспаніі. Гранпры фестывалю — «Прыз глядацкіх сімпатый» — атрымае найлепшы спектакль па выніках рэйтынгавага галасавання гледачоў. Акрамя асноўнай конкурснай праграмы, у межах «Тэатральнага куфара» будуць рэалізаваныя праекты «МанаК» і «Koufar-to-Stage». Першы прэзентуе спектакль з Босніі і Герцагавіны «Арто, які гуляе», акрэслены стваральнікамі як «мона-харэа-драма»; другі пазнаёміць з прэм'ерай латвійскага спектакля «Жанчыны Бергмана» Валкскага гарадскога тэатра. «Жанчыны Бергмана» — вынік творчага супрацоўніцтва беларускага драматурга Мікалая Рудкоўскага і латвійскага рэжысёра Айварса Ікшэліса.

Англійскі рэжысёр Эдвард Льюіс, кіраўнік праекта «Koufar-in-Motion», цягам фестывальнага тыдня здзейсніць нейкую неардынарную сцэнічную пастаноўку і прэзентуе яе гледачам на цырымоніі закрыцця «Тэатральнага куфара - 2010» у суботу 2 кастрычніка. Эдвард Льюіс, дарэчы, з'яўляецца вучнем бразільскага рэжысёра і адначасова славутага выкладчыка і Аўгуста Бааля. Яго пастаноўкі працятыя ідэяй аб тым, што пры дапамозе тэатра кожнаму чалавеку, які патрапіў у складаныя становішча сацыяльнай несправядлівасці або душэўных перажыванняў, можна падказаць найбольш прымальнае рашэнне, якое прыдатнае для рэальнага жыцця. У Мінску Э. Льюіс будзе працаваць з акцёрамі паводле методыкі свайго выбітнага педагога.

Цікавым наватарствам фестывалю стане абмеркаванне мерапрыемства за «круглым сталом», у якім возьмуць удзел маладыя крытыкі вядучых тэатральных ВНУ Мінска, Масквы, Санкт-Пецярбурга і ўдзельнікі «Тэатральнага куфара-2010».

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

ГАСПАДАР СВАІХ МАРАЎ, альбо Як Несцерка ў Еўропу пайшоў

ПІСЬМЕННІК ГЕОРГІЙ МАРЧУК З ЦІКАВАСЦЮ ЧАКАЕ КАСТРЫЧНІКА, КАЛІ АБВЕСЦЯЦЬ ЛАЎРЭАТА НОБЕЛЕЎСКАЙ ПРЭМІІ ПА ЛІТАРАТУРЫ: А РАПТАМ...

Ларыса ЦІМОШЫК

ЁН лічыць, што прыйшоў час ужо і айчынным служыцелям слова заяўляць пра сябе ў свеце і актыўна прасоўваць сваю творчасць, і тады нават немагчымае можа аказацца магчымым. Прыклад: аднойчы родная краіна даведалася, што ў нас ёсць такі пісьменнік, які прэтэндуе на Нобелеўскую прэмію. Вось дык сапраўды сенсацыя: хто ж мог падумаць пра такое. Прыроду гэтай сенсацыі захацелася спасцігнуць. Аднак сам яе аўтар пачуваўся абсалютна спакойна, нібыта гэта не казка ўварвалася раптам у яго жыццё, а ён сам навучыўся казку рабіць быллю. Сам факт атрымаў розгалас, і цяпер хочацца даведацца: якім творам асабліва ганарыцца сакратар Саюза пісьменнікаў Беларусі Георгій Марчук, і што абавязкова трэба прачытаць усім нам, каб адчуць гонар за нашу непаўторную сваімі талентамі краіну?

Восем раманаў, каля 50 п'ес, 100 навел, 40 казак, столькі ж афарызмаў — усё, што нажыта няпростай пісьменніцкай працай за 40 гадоў творчасці Георгіем Марчуком... Як удалося столькі зрабіць?



— Дзякуючы Госпаду Богу, дзякуючы таму, што ўдала ажаніўся і напаткаў добрых сяброў, дзякуючы таму, што рос сіратою і з дзяцінства люблю працаваць, мне ўдалося стварыць такі творчы багаж, — гаворыць **Георгій Васільевіч**. — Я працаваў у імя літаратуры, дзеля літаратуры і ад гэтага атрымаў асалоду. Няма такога пісьменніка, які не марыць атрымаць прэміі ў сваёй дзяржаве ці ў Еўропе, у свеце. Вядома, адна з самых прэстыжных — Нобелеўская. Таму я вывучаў, хто атрымлівае гэтую прэмію, якім чынам вылучаюць на яе атрыманне. Зразумеў, што ў большасці выпадкаў яна прысуджаецца за мастацкасць, за сур'ёзныя творы, за працу пісьменніка.

— Хто аказаўся пад уражаннем вашай творчасці настолькі, што ініцыяваў ваша вылучэнне ў якасці прэтэндэнта на Нобелеўскую прэмію?

— Шчыра кажучы, ініцыятыва сыходзіла ад мяне самога. Я падумаў: каб эксперты хоць бы пазнаёміліся з творчасцю. На жаль, перакладу беларускіх твораў у Еўропе амаль няма. Таму нашу літаратуру не вельмі добра ведаюць. Мне захацелася, каб народ даведаўся, што я ёсць у беларускай літаратуры, пра што я пішу. Паход за гэтай прэміяй я распачаў мэтанакіравана з 1999 года — з кніжкай казак і афарызмаў. Пачаліся пераклады па маёй уласнай ініцыятыве — у Літве, ва Украіне, Казахстане, Румыніі, Польшчы, Таджыкістане. У Македоніі мая кніжка казак так спадабалася, што яе ўключылі ў школьныя праграмы. Мой сябра Іван Паўловіч, старшыня Саюза пісьменнікаў Македоніі, падтрымаў рэкамендацыю.

— Так проста?!.

— Не так і проста — галоўнае, каб творы былі перакладзеныя і вядомыя не толькі ў роднай краіне. На жаль, у часы Савецкага Саюза была жалезная заслона, і для літаратуры існавалі пэўныя межы. Тады не разумелі, хто і якім чынам вылучае на гэтую прэмію. У асноўным з былога Савецкага Саюза яе прысуджалі дысідэнтам — паэту Бродскаму, празаіку Салжаніцыну. Акрамя генія Шолахава, які 30 гадоў чакаў свайго часу. І тут у мяне ўзнікае пытанне: няўжо вялікі Горкі, Бялоў, Твардоўскі, нашы калегі з іншых рэспублік — Айтматаў, Гамзатаў, Куліеў — не заслугоўвалі сваёй творчасцю хоць бы быць прадстаўленымі на яе атрыманне?..

З набыццём незалежнасці кожная краіна акрыяла і літаратура ўзнялася на новую вышыню. Мы агледзеліся і зразумелі, што XX стагоддзе залатымі літарамі ўпісана ў гісторыю беларускай літаратуры. Прыйшлі цудоўныя мастакі ў розных жанрах, была нават спроба асвоіць эпічны раман. Давайце прыгадаем — «Векапомныя дні», «Людзі на балоце» Мележа, «Каласы пад сярпом тваім» Караткевіча, тры раманы Адамчыка, Чыгрынаў. Мой раман «Крык на хутары» належыць да жанру эпапеі, апошнім часам да яго далучыліся Леанід Левановіч са сваімі раманамі, Гніламёдаў з раманам «Расія». Прыгадаем, якія цудоўныя творы нарадзіліся ў беларускіх празаікаў і паэтаў — у Пташнікава, Казько, Разанава, Башлакова, Пашкова, Зуёнка, Савіцкага, Пазнякова. Гістарычная проза дзякуючы Караткевічу набыла новы рух і новы ход. Потым яго традыцыі падтрымалі Масляніцына і Багадзяж, Вітаўт Чаропка, Канстанцін Тарасаў, Наталля Голубева, Мікалай Ільінскі, які стварыў раман «Апошняя ладдзя вікінгаў». Мы зразумелі, што ў Беларусі працуе цудоўная плеяда выдатных паэтаў — Бравікова, Паліканіна, Скарынкін, Гусачэнка, Аўруцін, Сакалоўскі, Шабовіч, Башлакоў. У жанры фантастыкі і дэтэктываў плённа стваралі Мікалай Чаргінец, Сяргей Трахімёнак, Віктар Праўдзін, Груздоў. Цікавыя творы ў Жыгунова з Глыбокага, Грышкаўца з Пінска, Пракаповіча і Касько з Брэста. Недаацэненая цудоўная паэтка з Гродна Люда Кебіч, малады празаік Гаўрыловіч з Жыткавічаў, Камейша, Давідовіч. Цікавыя празаікі Алесь Жук, Генрых Далідовіч. У драматургіі на слыху імёны Дударава, Паповай, Дзялендзіка, Петрашкевіча. Алесь Разанаў — адзін з тых, хто зараз актыўна прасоўваецца за мяжою. Некаторыя творы гэтых аўтараў маюць права выстаўляцца на еўрапейскія прэміі, у тым ліку і на Нобелеўскую.

Доўга мусіравалася пытанне аб вылучэнні на Нобелеўскую прэмію Быкава. Але справа ў тым, што ні наш Саюз пісьменнікаў, ні Саюз пісьменнікаў Савецкага Саюза не вылучалі кандыдатаў. Бывае так, што на слыху імя пісьменніка, і Нобелеўскі камітэт сам вызначае прэтэндэнтаў. Але да пісьменнікаў з былога СССР было халоднае стаўленне Нобелеўскага камітэта, і толькі 5-6 гадоў таму трошкі пацяплела.

— Калі з'явіліся Пэн-цэнтры, якія маюць права вылучаць кандыдатаў?

— З таго часу... Яны трошкі больш сочаць, падаюць інфармацыю ў свой Лонданскі цэнтр. Але я заўсёды баяўся Пэн-цэнтраў, бо мне здаецца, што там ёсць нейкая кланавасць, часам дзіўны адбор. Чым яны кіруюцца? Чаму яны адных адкідаюць, а бяруць толькі невялічкую групку і вакол іх танцуюць на працягу дзесяцігоддзяў? Наогул, кожны пісьменнік асоба незалежная. І ад палітыкі, і ад ідэалогіі. У яго свая ідэалогія — сумленне, любоў да радзімы, гуманізму, непрыняцце зла, разбурэння. Таму на яго творчасць не мае права ніхто ўплываць.

— Прадстаўнікі беларускай літаратуры ўжо фігуравалі ў ліку прэтэндэнтаў на Нобелеўскую прэмію...

— З беларускіх пісьменнікаў раней быў заяўлены Рыгор Барадулін. Я быў прадстаўлены ў 2009 годзе. Звычайна, калі прадстаўляецца пісьменнік, то ён яшчэ затрымліваецца на пэўны час як кандыдат, яшчэ сочаць за яго творчасцю. Таму ілюзорныя надзеі на прэмію захоўваюцца ў нас абодвух.

— Вас вылучылі за казкі, не крыўдна, што не за раманы?

— Там важна тое, што найбольш папулярна і з якой часткай тваёй творчасці знаёмыя ў іншых краінах. Вядома, мне хацелася б перакласці і некаторыя навелы, раманы, п'есы. Справа ў тым, што ў рэзюме пісьменніка ўсё гэта ўказваецца — этапы творчасці, якімі прэміямі адзначаны на радзіме, ці наадварот, калі гнаны са сваёй краіны, то за што.

— Якую сваю кнігу вы лічыце найбольш паспяховай?

— З прозы я адзначыў бы раман «Кветкі правінцыі», паводле якога мы зрабілі з Дзмітрыем Зайцавым фільм. У драматургіі — гэта першыя спробы, калі ўбачыў сваіх герояў на сцэне. З апошняй — нарэшце выданне і прызнанне маіх казак.

— Вы ўзялі героем вашых казак Несцерку. Чым ён вам даспадобы?

— Тым, што ён народны, ён брэнд. Хітраваты, ленаваты, кемлівы. У розных народаў ёсць падобныя героі. Я падумаў: ну чаго пра яго толькі некалькі баек у фальклоры засталося? Безумоўна, без таго, што зроблена Інстытутам этнаграфіі і фальклору (яны выдалі вялікую кнігу), мне было б цяжка. Гэта была вялікая частка біяграфіі народнага героя. Я вырашыў пашырыць яго вобраз, зрабіць трошкі маладзейшым, калі ён вучыцца жыццёвай мудрасці, калі для яго важная абарона зняважанага чалавека — гэтую лінію я хацеў падкрэсліць. Два сюжэты мне падказаў мой дзед.

— Хто для вас увасабляе беларускі характар?

— Што ні чалавек — тое характар. Усе непадобныя і падобныя ў той жа час: аднолькава плачуць, аднолькава гневаюцца, смяюцца, радуюцца. Для мяне ўсе родныя — увасабленне беларускасці. Горад мой Давыд-Гарадок — сканцэнтраваная беларускасць. Усе тыпы ўнікальныя, я стараўся вывесці іх у «Кветках правінцыі». Калі браць бліжэй да дзяцінства, то гэта маці, бабуля, дзед. Гэта суседзі. У мяне былі цікавыя дзядзькі, ветэраны вайны. Адзін паслухмяны, ціхі, можа, трошкі занядбаны. Другі — актыўны, спрэчнік, вальналюбца, любіў выпіць, часта мяняў працу, расказваў розныя небыліцы. Недзе на гэтым стыку я ўбачыў характар беларуса. Палешука. Але людзі з Віцебска мне кажуць, што сваіх паіншаму бачыць. А з Гродзеншчыны бачаць сваіх больш шляхетнымі, якія да касцёла ходзяць спраўна, больш увагі надаюць вопратцы, модзе.

— Сучасная беларуская літаратура адлюстроўвае багацце беларускіх характараў?

— Яна адлюстроўвае ўяўленне пісьменніка пра беларускі характар. Гэта постмадэрнісцкая літаратура, якая ў цэнтр увагі ставіць саму асобу пісьменніка. Яна часам больш прыдумляе людзей. Ад гэтага я бачу штучнасць, якая не кранае. Калі сам пісьменнік не перажыў, не перадаў эмоцыі свае, то і чытач не будзе іх успрымаць. Альбо час раманаў знік. Час паэм знік... Аднак будзем аптымістамі: мы не згубілі этнас, сілу духу, не развучыліся бараніць сваю Айчыну. Жаданне жыць ёсць. Пісьменнікі закліканыя будзіць душы і цягнуць іх да светлага. Я прызнаюся, што ў захапленні ад беларускай паэзіі, менш ад прозы. Не хапае хіба што еўрапейскай «раскруткі».

Не выключана, што ў перспектыве з'явіцца ў Беларусі некалькі прэтэндэнтаў на Нобелеўскую прэмію. Нашы пісьменнікі гатовыя да гэтага. Я зайздрошчу палякам — 4 нобелеўскія лаўрэаты! Гэта вялікая падтрымка літаратуры. Мы раней наогул не ведалі, якім чынам ідзе вылучэнне. Цяпер ведаем, і можа, з цягам часу будуць новыя прэтэндэнты. Час ад часу сама Беларусь будзе прадстаўляць сваіх кандыдатаў. Гэта важна, бо апроч таго, што пісьменнік набывае вагу ва ўласнай літаратуры, ідзе яго папулярызацыя ў Еўропе — каб яго творы былі перакладзеныя хоць бы ў трохпяці краінах. Таму задача нашага Саюза і саміх пісьменнікаў — знаходзіць перакладчыкаў, праводзіць семінары перакладчыкаў, усё лепшае, што ёсць у нашай літаратуры, прапаноўваць.

— Здаецца, што літаратура краіны ствараецца і больш патрэбна нашаму народу. Калі Быкаў не атрымаў Нобелеўскую прэмію, то гэта не азначае, што ў яго творах няма беларускага болю. Не думаў пра прэмію Караткевіч, калі пісаў свае творы....

— Безумоўна, гэта не самамэта. Я пасля 30 гадоў працы падумаў: а чаму ім можна вылучацца, а нам нельга? Але спачатку трэба натхнёна, сур'ёзна працаваць, вырашыўшы, дзеля чаго прыйшоў у свет. А ці маеш сілу сказаць людзям, як змагацца са злом ці песімізмам у душы? Павінна быць самаацэнка ўласных твораў. Не фанабэрыя, а самаацэнка.

— Але большасць грамадзян краіны заканчваюць стасункі з беларускай літаратурай, скончыўшы школу. Як ім сказаць нешта?

— Ёсць невялікая колькасць прыхільнікаў, якія сочаць. Тут у нас вялікі недагляд: мы згубілі былую інтэлігенцыю. Яна павінна адсочваць працэс, бывае, што час ад часу і напісаць парады пісьменніку. За ёю пойдуць. Калі настаўніца ці бібліятэкарка будзе папулярызаваць, якое чытва браць, калі музеі будуць папулярызаваць сваіх, будзе зрух. Бывае, што прыязджаеш на радзіму і пытаешся: «А колькі ў нас членаў Саюза пісьменнікаў у раёне жыве?» Дык начальнікі не могуць адказаць. Павінны чыноўнікі цікавіцца і чытаць кнігі, ведаць, якія творчыя людзі жывуць у іх раёне. Мы сёння гаворым: «Я ганаруся Беларуссю». Але гэта агульныя словы. Калі ганарацца, то канкрэтнымі справамі і асобамі — алімпійскім чэмпіёнам, мастаком, пісьменнікам, настаўнікам... Мы нібыта па савецкай звычцы існуём пад бюракратычнай машынай: а што скажуць у вобласці, у сталіцы, у Маскве?.. Потым — што скажа Захад? А можа, не так жывём, а можа, не тая эканоміка? Я хачу па-беларуску жыць, хадзіць, апранацца. Я сумую па тым, што не нашу родную кашулю. Прыязджаю і чую ўсё менш і менш беларускай мовы ў родным Давыд-Гарадку. Але я радуюся, што ёсць яшчэ фальклорныя ансамблі, дамы культуры, нараджаюцца цікавыя асобы. Не хапае ініцыятывы і актыўнасці бібліятэкам, музейным работнікам, каб аб'ядноўваць творчыя сілы. Трэба больш самастойнасці, каб пачуваць сябе гаспадаром. А калі ты гаспадар, то цябе будзе цікавіць усё.

— А самі літаратары што павінны рабіць дзеля гэтага?

— Падымаць творчасць на новы ўзровень. Няхай гэта не будзе кожны год па кніжцы, няхай будзе адзін твор, але такі, як «Людзі на балоце». Мне, напрыклад, за свой раман «Крык на хутары» не сорамна.

Сціплая абаяльнасць

Выстава месяца

За беларускую рэчаіснасць на карцінах гатовыя плаціць кліенты замежных аўкцыёнаў і галерэй

Не люблю падглядаць, але злавіла сябе на думцы, што раблю гэта... Жанчына пышных формаў у негліжэ ля архаічнай шафы глядзіцца ў люстра — прыкідвае, як будзе сядзець на ёй чырвоная сукенка. Пасмы валасоў навісаюць на спіну, тлушчык з таліі амаль пераваліўся на сцёгны, затое тоненькія абцасы даюць намёк на магчымы гламур. «Прыгажосць — страшэнная сіла», — нібыта жанчына сябе так запэўнівае. А нібыта і мастак Валянцін Губараў — тых, хто аглядае гэтую карціну. Гэта ж трэба: быццам з рэальнага жыцця эпізод, а патрапіў на выставу ў Музей сучаснага мастацтва.

Не магла прапусціць, бо вельмі хацелася зразумець, чаму, напрыклад, за творы мастака Валянціна Губарава з Мінска гатовыя выкладваць грошы кліенты аднаго з аўтарытэтных аўкцыённых дамоў Christie ў Лонданеды іншых. Чаму на яго творы «запалі» ў французскай галерэі Les Tournesols, прапанаваўшы мастаку эксклюзіўны кантракт? Чым прывабліваюць гэтыя карціны немцаў, швейцарцаў, аўстрыйцаў, амерыканцаў?.. Вось гэтыя, напрыклад: «Зімовы вечар у Смаргоні» ці «Верасень у Аляхновічах»... Сапраўды, цікава: ну няўжо яны могуць адчуць і зразумець абсалютна НАШ свет яго твораў, якія нібыта выхопліваюць эпізоды з жыцця глыбінкі, якой-небудзь вясковай хаткі ці сям'і, ці нават аднаго чалавека, існаванне якога пазбаўлена ўсялякага «буржуйскага» бляску?

Аднак за мяжой карціны Губарава бачаць часцей, чым у Мінску. Таму выстава «Звычайна так», якая будзе доўжыцца да 3 кастрычніка, — цудоўная магчымасць адчуць сябе адначасова і еўрапейцам (мы можам паглядзець творы гэтага мастака!), і беларусам (мы можам паглядзець на сябе збоку вачыма творцы).

Гэты погляд можа паказацца камусьці наіўна-замілаваным, а камусьці іранічным да здзеклівасці. Бо якія ж яшчэ мастакі ў свае героі бяруць звычайных людзей у абсалютна звычайных абставінах прадказальнага жыцця, дзе за каханнем бывае вяселле, за вяселлем адведкі і гэтак далей. І ўсё да дробязяў проста, але выпісана любоўна і дакладна. Амаль наіўна. Каб усё-такі не іронія. Ну вось хоць бы такі пастаральны сюжэт: вясковая хатка ў маляўнічым месцы, гаспадарка побач, жанчына ў целагрэйцы трымае курыцу ў руцэ — славіла, каб пасадзіць на месца ў хляве ці... можа, засекчы на вячэру?

Можна наглядзецца на творы Губарава і канстатаваць: яго цікавіць побыт. Так, побыт, якога не пазбаўлены ніякі чалавек і ні ў якой краіне. Можа, таму яго сюжэты інтэрнацыянальна-прыцягальныя. Як сабе хочаце, а мне цікавыя на карцінах героі, якія патрапілі ў іх з вуліцы, а не з вокладкі моднага часопіса — ну зусім не мадэльнага выгляду, такія знаёмыя ў сваіх прыхільнасцях і слабінах, а часам дзівакаватыя да жудасці ў сваіх выхадках. Як мужык, які стаіць на балконе і з чайніка паліває ўніз. Вы думаеце, кветкі? Не, па версіі аўтара, для некага ў гэты момант «дождж пайшоў», але мы не бачым, гэта за «кадрам», таму мужчынка здаецца, на першы погляд, адэкватным і руплівым гаспадаром. Чым жа ён мяне цікавіць, падумалі? А тым, што я такіх сустракала. Толькі не ўяўляла, што яго вобраз можа быць назаўсёды «ўвекавечаны» ў мастацкім творы. Вось дзе геніяльнае ў звычайным: малюючы дробязі, дэталі, асобных людзей, звычайныя сюжэты, мастак адлюстроўвае грамадства, у якім жыў раней і жыве зараз.

Іранічны погляд на саміх сябе даецца часам балюча. Бо паглядзеўшы, думаеш, што і як мяняць у сабе. А тут ужо пачынаецца схільнасць да самакапання і філасофіі. «Філасофію беларускага жыцця» Валянцін Губараў таксама ўмясціў у вобраз: група магутных і рашучых мужчын хоча зрушыць з месца вялікі валун. Яны яго акружылі і штурхаюць... з розных бакоў. «Сумесныя намаганні не заўсёды прыводзяць да патрэбнага выніку» — назва патрапіла ў яблычак.

І ўсё ж Губараў — жыццесцвярджальны і аптымістычны мастак. Яго карціны змяшчаюць радасць жыцця — вось чым яны вабяць. Беларускага ці не беларускага — не вельмі важна для гледачоў. Для аўтара, напэўна, усё-такі важна, бо за столькі гадоў маючы перспектывы ў іншых краінах, ён працягвае жыць у Беларусі: тут багата сюжэтаў, людзей, якіх ён адчувае і разумее, а таму можа намаляваць і з гумарам, і сур'ёзна. Яго карціны робяць жыццё радасным і тады, калі прыгожа паказваюць тое, чаго не можа быць нідзе, акрамя мастацтва: лабрадор Далі ў лодачцы плыве па рацэ, разам з ім у кампаніі вудзіць рыбу мышка, у той час як кот на паветраным шары аглядае абшары, і далёка-далёка застаецца горад. Вось такую б карціну ды ў такую ж хатку, як на карцінах. Якраз...

Ларыса ЦІМОШЫК.

Жыццёвінкі

ЯЕ кветкі

НІХТО сёння не помніць, куды наша маці ў той год падзела тыя цёмна-фіялетавыя гладыёлусы.

Толькі ўсе мы, яе дзеці, добра ведалі: да канца жыцця яна больш ніколі не вырошчвала іх... Усе кветкі вырошчвала і даглядала, а цёмна-фіялетавыя гладыёлусы — не...

Прыстойны кветнік быў у нас. Там раслі вярбіны, рамонкі, ружы, піёны, цыніі... І ўсё ж пераважалі гладыёлусы — усіх колераў: ад белага да ружовага, а ў той год — і да цёмна-фіялетавага, амаль чорнага колеру. Гэтыя гладыёлусы, а пра іх мама марыла даўно, яна выпісала па пошце, і цыбуліны, што прыйшлі аднекуль здалёк, прыжыліся, упрыгожылі неўзабаве кветнік. На гладыёлусы заглядаліся суседзі, прасілі, каб не пашкадавала, калі ёсць такая магчымасць, і для іх цыбулінку-другую.

Але, мусіць, так нікому яна і не адабяцала.

Прапалі гладыёлусы. Аднойчы і назаўсёды.

Пасля таго, што адбылося...

...Хату ў Іскані на Быхаўшчыне нашы бацькі будавалі ў канцы пяцідзясятых. Гэта я добра помню. Зруб прывезлі з Ніканавіч, купілі яго там за дзесяць тысяч рублёў. Вялікія грошы былі па тым часе. Каб сабраць такую суму, дзед Якаў, мамін бацька, прадаў нават сваю карову, а грошы, загорнутыя ў старэнькую бабуліну хустку, прынёс да нас з суседняй Гуты і паклаў на стол: жывіце, а Бог дасць, на кароўку як-небудзь яшчэ разжывёмся. Бог тады даў старым і кароўку, а пазней набылі яшчэ кабылку... Бог даў і ўнукаў.

Мы выраслі, разляцеліся па белым свеце хто куды. Так сталася, што бліжэй да бацькоў жыў я, таму і часцей наведваўся да іх. Сёння мама з татам спяць вечным сном на мясцовых могілках, а хата, на якую дзед Якаў не пашкадаваў сваю карміцельку, сіратліва стаіць пад белым небам, нікому непатрэбная. Далекавата ад Гомеля, больш за сотню кіламетраў, аўтобус ходзіць рэдка, таму багата не наездзіш. А вось у сны і думы часта прыходзіць, вельмі часта.

Кветніка, што быў пасярод двара, а не перад вокнамі, як у іншых, не стала адначасова з мамай. Бацьку забрала да сябе сястра ў Ліду, ён з вайны быў без рукі, таму няпроста жыць у вёсцы. Ну, а хата засталася адна. Пазней да яе пачалі паступова падбірацца людзі: што вабіла іх вока, тое і цягнулі. Разбурылі печ, павыцягвалі з грубкі жалеззе. Нават комін разбурылі.

Вядома ж, браць чужое мае бацькі землякоў не вучылі.

Нічога не паробіш — свет перакуліўся...

Аднойчы і я правініўся перад мамай. Меўся грэх. Наш агарод упіраўся ў школьны парканчык, і калі неяк узімку яна папрасіла мяне паднесці стосік сшыткаў, я і рушыў напрамкі. А разгулялася завіруха, шалеў вецер, ён шпурляў у мой твар, здавалася, жменямі пякучую крупку. І тут здарылася непапраўнае: калі я быў ужо каля пуні, вецер усё ж выхапіў з маіх рук стосік сшыткаў і пачаў апантана гартаць іх, я кінуўся падбіраць сшыткі, але дзе там!.. Каляровыя прамаканкі разляталіся асобна, нібы феерверк у гонар маёй бездапаможнасці.

З апушчанай галавой я сядзеў на табурэце перад мамай, шмыгаў носам, а яна плакала: нёс я сшыткі з сачыненнем па роднай мове ў шостым — чамусьці запомнілася мне надоўга гэта — класе. Перапісвалі сачыненне вучні ці не, не магу сказаць, не ведаю, але я тады цвёрда вырашыў стаць настаўнікам і насіць стосікі сшыткаў так, каб іх болей ніколі не вырваў вецер з маіх рук...

Я скажу пра гэтую мару маці, але значна пазней...

Калі я ўспамінаю сваю хату, то бачу швейную машынку «Зінгер», на якой мама шыла сукенкі і спадніцы вясковым кабетам. Ухітралася ж неяк паміж урокамі, складаннем планаў і праверкай сшыткаў і хатняй гаспадаркай рабіць і гэта.

Бачу я і прыгожую вышыванку, што вісела на сцяне ў мамінай спальні. Да вышыванкі былі прымацаваны інстытуцкі «ромбік» і значок «Выдатнік народнай асветы». Яна была добрай настаўніцай, для многіх вучняў любімай.

У той, апошні, год сваёй працы, маці споўнілася пяцьдзясят год, была яна завучам. Сем гадоў назад нарадзіла двойню, двух сыноў, а я скончыў дзясяты клас, збіраўся ў адзінаццаты. Такім чынам, у сям'і нас стала пяцёра дзяцей. Маці далі медаль, і яна прымацавала яго ўсё на той жа вышыванцы.

Лета выдалася спякотнае, жухла трава, таму на школьным агародзе падоўгу корпаліся дзеці з вучнёўскай паляводчай брыгады: палівалі агуркі, памідоры, капусту... і кветкі. Мама і ў школе зрабіла вялікі і прыгожы кветнік. Збіралася пасадзіць там і чорна-фіялетавыя г

СКАНВОРД + СУДОКУ

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.



		5	4				2	
3				9		5	7	
4		7	5	2				6
5			3					
	9			6			4	
		6			7			
	5	8	7		4	9		
	4				9		1	8
		9	8				5	

СУДОКУ. У квадраце 9×9 клетак размясціце лічбы ад 1 да 9 уключна такім чынам, каб у кожным радку, кожным слупку, у блоках 3×3 клетак, абмежаваных тлустай лініяй, кожная лічба сустракалася толькі адзін раз, без паўтораў.

777

РЫБАМ — РАБІНУ, ШАЛЯМ — КАПУСТУ

Яшчэ старажытныя астролагі заўважылі, што прадстаўнікі розных знакаў задыяка аддаюць перавагу розным групам прадуктаў. Сучасныя астролагі пайшлі далей: яны сцвярджаюць, што прадстаўнікі розных задыякальных знакаў адчуваюць неаднолькавую патрэбу ў розных мікраэлементах і вітамінах, за кожны з якіх адказвае свая планета.

Сонца — вітамін А (рэцінол, карацін)

Асабліва неабходны ён **Шалям** і **Вадалеям**.

Недахоп гэтага вітаміну вядзе да сухасці і лушчэння скуры, парушэння зроку. Гэты вітамін паляпшае стан шчытападобнай залозы. Крыніцай вітаміну А з'яўляецца печань, масла, яйкі, рыбін тлушч. У раслінах утрымліваецца карацін аранжавага колеру, які ў арганізме ператвараецца ў вітамін А. Яго багата ў моркве, памідорах, абляпісе, гарбузе, апельсінах.

Месяц — вітаміны групы В

Асабліва неабходны **Казярогам** і **Скарпіёнам**.

У гэтай групе каля 30 відаў вітамінаў. Яны адказваюць за работу нервовай сістэмы і ўплываюць на абмен рэчываў, адказваюць за работу сасудаў.

Вітамін B_1 — утрымліваецца ў печані, арэхах, вотруб'і, крупах і бабах.

Вітамін B_2 — у тварагу, малацэ, мясе, печані.

Вітамін B_3 — у малацэ, хлебе грубага памолу, грэцкіх крупах, грыбах, яйках.

Вітамін B_4 — у кіслай капусце, яйках.

Вітамін B_5 — у квяцістай капусце, грыбах, яйках, рыбе.

Вітамін B_6 — у шпінаце, моркве, бульбе, капусце, памідорах, мясе, яйках.

Вітамін B_8 — у капусце і зялёным гарошаку.

Вітамін B_{12} — у рыбе, мясе, цвёрдым сыры, іншых малочных вырабах.

Меркурый — вітамін С

Больш за ўсё ў ім адчуваюць патрэбу **Стральцы** і **Рыбы**. Прычым у жанчын патрэба ў вітаміне С вышэй, чым у мужчын, лічаць астролагі.

Гэты вітамін не назапашваецца і не сінтэзуецца ў арганізме. Ён папярэджвае захворванні дыхальнай сістэмы, тармозіць развіццё ракавых утварэнняў, узмацняе імунітэт. Пры яго адсутнасці развіваецца цынга.

Вітаміну С шмат у чорных парэчках, капусце, цытрусавых, шыпшыне, крапіве, абляпісе, рабіне.

Сатурн — вітамін Д

Ён вельмі неабходны **Ракам, Львам і Авенам**.

Вітамін Д утвараецца пад уздзеяннем сонечных промняў на скуру, спрыяе засваенню кальцыю. Пры недахопе гэтага вітаміну развіваецца рахіт, аблысенне.

Утрымліваецца ў рыбіным тлушчы, масле, тунцы, малацэ, жаўтку.

Венера — вітамін Е

Рэкамендаваны **Дзевам** і **Скарпіёнам**.

Гэты вітамін з'яўляецца антыаксідантам, падаўжае маладосць, паляпшае загойванне ран, работу мозгу і нервовай сістэмы. Значна павышае здольнасць да дзетанараджэння і станоўча ўплывае на захаванасць плода падчас цяжарнасці. Пры яго значным дэфіцыце ёсць рызыка развіцця бясплоддзя.

Утрымліваецца ў соі, крупах, алеях, шпінаце.

Марс — вітамін К

Астролагі асабліва раяць яго **Шалям, Ракам і Цяльцам**.

Гэты вітамін адказвае за работу крывяноснай сістэмы і кроваўтварэнне. Утрымліваецца ў зялёных раслінах, капусце, рыбіным тлушчы, яечным жаўтку, моркве.

Юпітар — вітамін Р

Неабходны **Блізнятам, Казярогам** і **Дзевам**.

Аднаўляе работу печані пасля атручванняў, а таксама пры дыябеце і прамянёвай хваробе. Спрыяе ўмацаванню сценак крывяносных сасудаў. У вялікай колькасці ўтрымліваецца ў лімоне, чаі, апельсінах, шыпшыне, капусце, цыбулі, грэчцы, маліне, брусніцах.

Астролагі нагадваюць, што восень — самы час для прыняцца вітамінаў. І калі пры гэтым зрабіць акцэнт на тыя з іх, якія рэкамендуюцца менавіта вашаму знаку задыяка, то пра авітаміноз можна забыцца.

Падрыхтавала Інга МІНДАЛЁВА.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.53	19.11	12.18
Віцебск —	6.42	19.01	12.19
Магілёў —	6.43	19.01	12.18
Гомель —	6.40	18.58	12.18
Гродна —	7.08	19.27	12.19
Брэст —	7.09	19.27	12.18

Месяц

Поўня 23 верасня.
Месяц у сузор'і Авен.

Імяніны

Пр. *МАЛАЯ ПРАЧЫСТАЯ (Нараджэнне Маці Божай).*

К. *Аляксандра, Ваўжынца, Іпаліта, Мацея.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Дзве даты

21 верасня

1923 год — нарадзіўся Мікалай Аляксандравіч Барысевіч, вядомы беларускі фізік, акадэмік НАН Беларусі (1969), АН СССР (1981), РАН (1991), заслужаны дзеяч навукі Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы. Замежны член Славенскай акадэміі навук і мастацтваў і Чэхаславацкай АН, сапраўдны член Еўрапейскай акадэміі навук, мастацтваў і славеснасці, ганаровы доктар прыродазнаўчых навук Йенскага універсітэта імя Ф. Шылера. Лаўрэат Ленінскай прэміі (1980), Дзяржаўнай прэміі СССР (1973), Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1998). Аўтар больш 270 навуковых прац, у тым ліку 3 манаграфій.

862 год — наўгародцамі на княжанне запрошаны тры браты-варагі — Рурык, Сінеус і Трувор. Да Кастрычніцкай рэвалюцыі гэтая дата афіцыйна лічылася Днём заснавання рускай дзяржавы.

Цытата дня:

«Калі б мы жылі вечна, у нас на ўсё б знайшоўся час, але наўрад ці знайшлося жаданне».

Уладзіслаў Гжэшчык (нар. 1935), польскі сатырык.

Хочаце — верце...

БРЫТАНСКІЯ НАВУКОЎЦЫ — ЗАГАДКАВАЯ КАСТА?

Кожны, хто ўважліва слухае, глядзіць і чытае навіны, ведае, што сёння ў авангардзе развіцця чалавецтва стаяць менавіта «брытанскія навукоўцы». Менавіта яны — шматлікая і загадкавая каста людзей, якія, мяркуючы па пошукавіках, увесь час займаюцца нейкімі дзіўнымі глупствамі. Гэты медыйны феномен — следства пастаянных публікацый у рускамоўных СМІ, якія пачынаюцца са слоў «Брытанскія навукоўцы зрабілі/вызначылі/выявілі/высветлілі» штосьці. Гэта самае «штосьці» звычайна кур'ёзнае, недарэчнае, дурное ніколі не прыйдзе звычайнаму чалавеку ў галаву. Так што, сёння любому грамадзяніну вядома, што навука развіваецца выключна дзякуючы ім, брытанскім навукоўцам.

Чаму менавіта брытанскія навукоўцы праводзяць усе гэтыя недарэчныя даследаванні, і як яны гэта робяць? У брытанскай навукі ў свеце быў традыцыйна высокі аўтарытэт, асабліва ў першай палове XX стагоддзя. На жаль, у канцы 80-х гадоў урад Вялікабрытаніі вырашыў папулярызаваць вышэйшую адукацыю і пачаў раздаваць статусы ўніверсітэтаў ледзь не ўсім ахвотным навучальным установам. Што да таго, «як яны гэта робяць», дык, хутчэй за ўсё, метад даследаванняў адзін — падлік карэляцый адвольных супадзенняў. А чаму б не лічыць, раз гранты на даследаванні выдаюць спраўна, навукоўцам перыядычна абломваюцца разнастайныя ўзнагароды, ды і ў СМІ пра іх па ўсім свеце з задавальненнем пішуць? У спонсараў такіх даследаванняў свая выгада: недарагая рэклама брэнда, які ўдзельнічае ў навуковых экспериментах. Дастаткова ўспомніць, скажам, шнобелеўскіх лаўрэатаў і іх артыкул «Роля гукавых арыенціраў у мадуляцыі ўспрыманай хрусткасці і чэрствасці бульбяных чыпсаў», тады было вызначана, што добрыя чыпсы павінны ламацца на зубах з гучнасцю ў дыяпазоне частаты ад 2 да 20 кілагерц. Словам, брытанскія навукоўцы ўмеюць ператвараць навуку ў трэш. Лагічным следствам усяго гэтага калянавуковага вэрхалу стала тое, што словазлучэнне «брытанскія навукоўцы» стала сінонімам маразматычнага высмоктвання з пальца нікому непатрэбнай лухты, і ў сур'ёзных навуковых навінах яно сёння практычна не выкарыстоўваецца, аўтары абыходзяцца канструкцыямі тыпу «група навукоўцаў Манчэстэрскага ўніверсітэта». У інтэрнэце «брытанскіх навукоўцаў» узгадваюць для розных дэзынфармацый і першакрасавіцкіх розыгрышаў. Мы ж прапануем вам, дарагія чытачы, азнаёміцца з некаторымі «дасягненнямі» і «даследаваннямі» гэтых самых брытанскіх навукоўцаў.

Брытанскія навукоўцы прыйшлі да высновы, што людзі пачынаюць хлусіць з шасцімесячнага ўзросту. Раней псіхолагі лічылі, што дзеці здольныя хлусіць з чатырох гадоў. Але як зараз высветлілі навукоўцы, і паўгадовыя дзеці здольныя фальшыва смяяцца ці крычаць. Гэта служыць у іх для прыцягнення ўвагі, нават калі дзеці ў гэты момант ні ў чым не маюць патрэбу. Сталеючы, дзеці вучацца замоўчваць штосьці, а аднагадовыя з дапамогай хлусні адцягваюць увагу. З двух жа гадоў дзеці хлусяць адкрыта: любімая фраза — «Гэта не я». Здольнасць казаць няпраўду — прыроджаная якасць, зрэшты, калі бацькі не будуць увесь час патураць дзіцяці, гэтая якасць паменшыцца, лічаць псіхолагі.

Брытанскія навукоўцы аспрэчылі даўні стэрэатып, што мышы любяць сыр. «Мышы могуць цудоўна развівацца і без сыра», — сказаў Дэвід Холмес, які разам з калегамі з Манчэстэр Метраполітэн універсітэта вывучаў смакавыя прыхільнасці грызуноў і іншых жывёл.



Брытанскім генетыкам удалося знайсці першага на Зямлі белага нашчадка Чынгісхана — ім апынуўся выкладчык бухгалтарскага ўліку з ЗША. У цэлым у Азіі налічваецца каля 16 млн чалавек, якія, паводле аналізу ДНК, з'яўляюцца нашчадкамі Чынгісхана. Як яго гены трапілі ў генеалагічную структуру продкаў Робінсана, род якіх бярэ пачатак у Шатландыі, застаецца загадкай.

Паводле даследаванняў брытанскіх навукоўцаў, ва ўсім свеце прыгожых жанчын становіцца ўсё больш, а вось прывабных мужчын усё менш. Прычына ў тым, што фізіялагічныя прыкметы, якія робяць чалавека прыгожым, перадаюцца галоўным чынам у спадчыну прадстаўніцам прыгожага полу. Такім чынам, у фізічна прывабных бацькоў часцей нараджаецца дачка, чым сын. А вось калі бацькі вызначаюцца такімі якасцямі, як сіла і схільнасць да агрэсіі, то ў яе на свет часцей за ўсё з'яўляецца сын.

Як вызначылі брытанскія навукоўцы, сон мужчыны і жанчыны ў адным ложку — гэта працэс, багаты на вельмі сумныя наступствы. Прычына таму — парушэнні сну, якія выкліканы знаходжаннем у ложку кагосьці яшчэ. Прычым не мае значэння, ці займаецца пры гэтым мужчына сэксам са сваёй партнёркай, ці не. Нават у сне мужчына працягвае ўсведамляць, што ён не адзін у ложку, а гэта прыводзіць да пастаяннага росту ўзроўню гармонаў стрэсу. Мараль простая. Прааналізаваўшы вынікі сваіх пошукаў, навукоўцы вырашылі настойліва рэкамендаваць мужчынам пазбягаць сумеснага начнога знаходжання з жанчынамі ў тых выпадках, калі на наступны дзень ім трэба быць на адказных мерапрыемствах на працы ці будуць складаныя і насычаныя дні, што патрабуюць максімальнай сабранасці, якую можа забяспечыць толькі здаровы сон.



Людзі, якія жывуць у раёнах, дзе дамы ўсыпаныя графіці, а тратуары ўсеяныя смеццем і бітым шклом, больш схільныя да атлусцення, чым тыя, хто жыве ў зялёных і чыстых раёнах, сцвярджаюць брытанскія навукоўцы. У даследаванні, праведзеным Медыцынскай даследчай радай, была прасочана ўзаемасувязь паміж атлусценнем і атмасферай у месцы пражывання чалавека. Навукоўцы сцвярджаюць, што такія «нецывілізаваныя праявы», як графіці на сценах і платах, смецце, сабачыя экскрэменты і скарыстаныя іголкі ад шпрыцаў на тратуарах, сігналізуюць пра дрэнны стан здароўя жыхароў такіх раёнаў у цэлым.

Людзі, якія не раз атрымлівалі ад жыцця жорсткія ўрокі, больш легкаверныя, чым тыя, хто вырас у абароненых, цяплічных умовах. Такую заканамернасць выявілі навукоўцы Лестэрскага ўніверсітэта Вялікабрытаніі. Шасцімесячнае даследаванне, якое правялі ва ўніверсітэцкай Школе псіхалогіі Кім Дрэйк, Рэй Бул і Джуліян Бун, паказала, што неспрыяльныя падзеі, перажытыя ў дзяцінстве і юнацтве, пасля прыводзілі да таго, што тых жа людзей у сталым узросце прасцей было ўвесці ў зман. Прааналізаваўшы 60 такіх асобаў, псіхолагі прыйшлі да высновы, што яны, напрыклад, больш уразлівыя да ўплыву СМІ ці рэкламных кампаній або хутчэй здольныя паддацца ціску на допыце ў паліцэйскім участку і стаць ілжывыя абвінавачанымі.

Брытанскія навукоўцы з універсітэта Лідса правялі шырокамаштабнае даследаванне, у выніку якога была выведзена формула дасканалага падсмажанага сэндвіча з беконам. Узначаліў работы доктар Грэм

Клэйтан. Найважнейшымі фактарамі, якія вызначаюць якасць гэтага кулінарнага вырабу, паводле атрыманых звестак, з'яўляюцца выражанасць хрусцення і трывальныя характарыстыкі хлеба.

Брытанскія псіхолагі склалі топ-ліст благіх звычак. Высветлілася, што найвялікшае раздражненне ў англічан выклікае калупанне ў носе, храп і гучнае пусканне газаў. Жанчыны апынуліся больш нецярплівымі, чым мужчыны. Усім вядома, што чужыя благія звычкі зводзяць нас з глузду і здольныя настроіць нават супраць вельмі мілага на першы погляд чалавека. Як паведамляе сайт Dailyrecord, псіхолагі фармацэўтычнай фірмы Lichtwer Pharma вырашылі разабрацца з благімі звычкамі, апытаўшы 800 брытанцаў. Больш за палову рэспандэнтаў (59 %) заявілі, што іх больш за ўсё астатняе раздражняе, калі хтосьці калупаецца ў носе. На другім месцы па «папулярнасці» апынуўся храп. Яго адзначыла 55 % апытаных. Звычка рыпець зубамі не задавальняе роўна палову ўдзельнікаў апытання. Аднолькавае раздражненне выклікае ў 49 % рэспандэнтаў благая манера храбусцець суставамі і пастукваць пальцамі па стале. Да здзіўлення псіхолагаў, гучнае публічнае пусканне газаў апынулася толькі на шостым месцы ў спісе (46 %) Звычка напаваць выводзіць з сябе больш за трэць брытанцаў (38 %), нашмат менш іх раздражняе насвістванне (31%). Калыханне нагой не падабаецца 34 %. А замыкае топ-ліст неўрастэнічная прыхільнасць грызці пазногці — яе адзначылі 29 % апытаных. Прааналізаваўшы адказы, спецыялісты прыйшлі да высновы, што жанчыны больш раздражняльныя, чым мужчыны. Яны значна часцей за мужчын давалі сцвярджальныя адказы на пытанне, ці раздражняе іх тая ці іншая звычка (66 %), у мужчын гэта лічба склала 53 %.

Брытанскія навукоўцы ў масавым парадку скупляюць вошай. За дзясятак паразітаў усім ахвотным прапануюць па 20 цэнтаў. Кілаграмы вошай павінны дапамагчы навукоўцы знайсці новыя лекі ад педыкулёзу. Да старых хімікатаў гніды ўжо адаптаваліся. Навукоўцы з Брыстольскага ўніверсітэта прапанавалі брытанскім бацькам арыгінальны спосаб папоўніць сямейны бюджэт. Рабіць пры гэтым амаль нічога не патрабуецца, хіба што вычасаць з валасоў свайго дзіцяці з дзясятак звычайных вошай і здаць іх у пункт прыёму насякомых. Пасля нядоўгіх спрэчак пра тое, як лепш купляць вошай — кілаграмамі ці паштучна — навукоўцы знайшлі кампрамісны варыянт, вырашыўшы плаціць за 5—10 паразітаў па 20 цэнтаў, у залежнасці ад памеру асобіны. Па выніках праведзеных ва ўніверсітэце даследаванняў, вошы даўно выпрацавалі ўстойлівасць да традыцыйных хімікатаў, якімі іх труцяць. У наш час англійскія навукоўцы рыхтуюць маштабныя клінічныя выпрабаванні новага прэпарата для лячэння педыкулёзу. Таму яны абвясцілі паляванне на сподняга паразіта і маюць намер сабраць як мага больш насякомых для эксперыментаў. Пункты прыёму крывасмокаў былі разгорнутыя пры кафедрах ветэрынарыі ўніверсітэтаў у Лэнгфардзе і Самерсэце. Лішнія экзэмпляры вошай брытанскія навукоўцы накіруюць сваім амерыканскім калегам для аналагічных мэтаў.



Брытанскія навукоўцы хочуць даследаваць Антарктыку, каб высветліць, ці сапраўды пінгвіны перакульваюцца на спіну, губляючы раўнавагу, калі яны разглядаюць верталёт ці самалёт у небе. Грамадская арганізацыя навуковага даследавання British Antarctic Survey у Лондане хоча правесці чатыры тыдні на Фалкленскіх астравах, каб назіраць рэакцыі пінгвінаў. Падчас Фалкленскай вайны паміж Вялікабрытаніяй і Аргенцінай у 1982 годзе вайскоўцы-лётчыкі і маракі заўважалі, што сярод пінгвінаў адбываўся масавы падзеж і страта раўнавагі, калі да іх набліжаліся ваенныя верталёты ці самалёты. Тэарэтычна, мяркуецца, што пінгвіны блытаюць штучныя лятальныя апараты з драпежнымі птушкамі.

Астраномы Манчэстэрскага інстытута навукі і тэхнікі знайшлі ў касмічнай прасторы велізарныя запасы... алкаголю! Гэта хмарка ў сузор'і Арла, змесціва якой хопіць, каб запоўніць прастору, якая ў 10 тысяч разоў якое перавышае аб'ёмы зямных акіянаў. Захоўваецца алкаголь у моцна астуджаным выглядзе — пры мінус 148 градусах. Праблема толькі ў тым, што алкагольнае воблака знаходзіцца на адлегласці 10 тысяч светлавых гадоў ад Зямлі.

Англійскія навукоўцы лічаць, што міф пра Санта-Клауса, які вандруе на лятучых аленях, абавязаны сваім з'яўленнем галюцынагенным грыбам, якімі любілі паласавацца жыхары Лапландыі. Вядома, што гісторыя пра Санта-Клауса нарадзілася ў Лапландыі, на поўначы сучаснай Фінляндыі. Там пражывалі лапары, якія, як высветлілі навукоўцы, даволі часта пілі мачу аленяў, якія харчаваліся мухаморамі. У лабараторных умовах навукоўцы атрымалі з гэтых грыбоў наймацнейшае галюцынагеннае рэчыва. Нядзіва, лічаць навукоўцы, што лапарам здаваліся лятучыя алені, якія потым ператварыліся ў легенду пра добрага Санта-Клауса. Яркае чырвонае адзенне навагодняга персанажа навукоўцы тлумачаць колерам галюцынагеннага грыба. Чырвона-белая афарбоўка мухамора ператварылася ў запалёным уяўленні людзей у старога ў чырвоным каптане з белай барадой.

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

«ВЫПУСЦІЦЬ» ДУШУ

Славяне верылі ў тое, што ў момант смерці чалавека на небе згасае (ці з яго падае) зорка. Смерць непазбежная і прадвызначаная лёсам і жыццём, але ніхто не ведае дзень свайго скону. Часам здараецца так, што чалавек перад смерцю шмат пакутуе, і, каб палегчыць надыход смерці, тым, хто знаходзіцца побач з ім, неабходна выконваць некаторыя рытуальныя дзеянні, пра якія раней вельмі добра ведалі ў народзе.

● Для таго, каб у часы агоніі аблегчыць наступленне смерці — «выпусціць» душу — у хаце адчынялі вокны (форткі), куфэркі, у печы — юшку, засланку і г.д., расшпільвалі адзенне на паміраючым чалавеку. У асобных (вельмі цяжкіх) выпадках з гэтай жа нагоды свідравалі дзіркі ў столі ці сцяне, білі ў званы, а часам і разбіралі печ.

● Паміраючага клалі на падлогу пад прамым вуглом да прадольных сілавых ліній памяшкання. Дошкі на падлозе ў сялянскай хаце заўсёды клалі ад парога да чырвонага кута, паралельна ім уздоўж сцяны ставілі ложкі. Такім чынам, чалавека неабходна было пакласці ўпоперак дошак.

● Каб палегчыць «адыход» паміраючага чалавека, яго таксама пераварочвалі нагамі да «галавы» ложка (памерлага выносяць з хаты нагамі наперад); закідвалі на дах венік; з-пад галавы прыбіралі падушку: «Курынае пер'е не дае памірацъ».

● Неабходна было падрыхтаваць падушку, у якую клалі лісце з веніка ці гарохавую салому; паміраючага накрывалі велікодным абрусам, а ў асобных рэгіёнах — вясельным адзеннем. З мэтай палегчыць перадсмяротныя пакуты ў рукі паміраючаму давалі грамнічную свечку (абавязкова васковую, набытую ў храме 15 лютага). Аднак калі ў іншых выпадках грамнічнай свечкай карысталіся на працягу ўсяго года, то ў выпадку смерці чалавека яе трэба было спаліць у той жа дзень, каб свечку не змаглі скарыстаць у час святочных рытуалаў.

● Для таго, каб аблегчыць надыход смерці, з хаты выводзілі самага блізкага чалавека. Напрыклад, калі памералі маці, з хаты выносілі дзіця. Аб паміраючым імкнуліся нічога нікому не казаць. Лічылася, чым менш людзей ведае аб гэтым, тым лягчэй яму будзе.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнемся!

Настаўніца:

— Дзеці, прыдумайце сказ, у якім слова «выдатна» ўжываецца двойчы.

Маша:

— Тата купіў маме выдатную сукенку, у якой яна выдатна выглядала.

Вовачка:

— Учора за вячэрай мая сястра абвясціла, што цяжарная, а бацька сказаў: «Выдатна, чорт, проста выдатна!»

☺

— Доктар, я займаюся сэксам са сваёй жонкай дзевяць разоў за ноч. Гэта дрэнна ці добра?

— Гэта хлусня!

☺

Гасцініца, аб'ява: «Усё для кліента!». Кліент:

— У вас клапы ёсць?

— Не, але калі вы пажадаеце...

☺

— Алё, ты дзе?

— У турме.

— За што?

— Ды бацькі паехалі, прасілі з братам пасядзець...

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 4597 Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12